Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

3 КРАСАВІКА 2015 г. ПЯТНІЦА № 63 (27921) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



## Падпісаны дэкрэт аб папярэджанні сацыяльнага ўтрыманства

СТАР. 2



## Парламент распачаў вясновую сесію

СТАР. 2



## Праграма тэлебачання на наступны тыдзень

**20 КАНАЛАЎ**

### ЦЫТАТА ДНЯ



**Валяр'ян БЯСПАЛЫ, начальнік упраўлення кантролю спажывецкага рынку — гандлёвай інспекцыі Мінгандлю:**

*«Мы адзначаем рост колькасці зваротаў, якія паступаюць на адрас Міністэрства гандлю як па тэлефоне даверу гандлёвай інспекцыі, так і ў пісьмовым і электронным выглядзе. Зварот фізічнай асобы можа стаць падставай для правядзення пазапланавай праверкі гандлёвай інспекцыяй Мінгандлю. Кожны факт аналізуецца і па магчымасці разглядаецца з выездам прадстаўнікоў міністэрства на аб'ект гандлю або грамадскага харчавання. У выпадку пацвярджэння парушэнняў прымаюцца самыя жорсткія меры. Пры гэтым у тых, хто звярнуўся, павінны быць дакументы, якія пацвярджаюць такія парушэнні або факты».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 3.04.2015 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 14680,00 | ▼ |
| Еўра | 15890,00 | ▲ |
| Рас. руб. | 257,50 | ▲ |
| Укр. грыўня | 624,68 | ▼ |

ISSN 1990 - 763X



# ДЗЯДУЛЕВА ПАДТРЫМКА

Мінскі пенсіянер Анатоль Курылаў і яго ўнукі Маша і Ягор

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

■ Гандаль і падаткі

# РЭШТКІ РАСКЛАЛІ ПА ПАЛІЦАХ

## Прадпрымальнікі атрымалі дакумент, які павінен зняць усе праблемныя пытанні ў сферы рэалізацыі тавараў

**30 сакавіка Указам №143 кіраўніка нашай дзяржавы ўнесены змены і дапаўненні ва Указ ад 16 мая 2014 года №222 «Аб рэгуляванні прадпрымальніцкай дзейнасці і рэалізацыі тавараў індывідуальнымі прадпрымальнікамі і іншымі фізічнымі асобамі».**

У адпаведнасці з дакументам, цяпер індывідуальным прадпрымальнікам — плацельшчыкам адзінага падатку даецца права да 1 студзеня 2016 года працягваць рэалізацыю рэштак тавараў, увезеных імі да 1 ліпеня 2014 года з краін Мытнага саюза без дакументаў, якія пацвярджаюць набыццё (паступленне) гэтых тавараў і ўключаных у вопіс рэштак тавараў. Пра гэта гаворыцца ў каментарыі ўказа Галоўным упраўленнем падаткаабкладання фізічных асоб Міністэрства па падатках і зборах Беларусі.

### НА ТАВАРЫ БЕЗ ДАКУМЕНТАЎ ПАДАТАК ВЫРАСЦЕ

У выпадку рознічнага гандлю рэшткамі тавараў, у адпаведнасці з падпунктам 1.1 пункта 1 Указа №143, індывідуальныя прадпрымальнікі абавязаны вылічыць і аплаціць адзіны падатак у адпаведнасці з Падатковым кодэксам (далей — ПК) і з ужываннем павышальнага каэфіцыента 2 за рэалізацыю тавараў без дакументаў, падатак на дабаўленую вартасць у фіксаваных сумах (далей — ПДВ у фіксаваных сумах). Тут ПДВ у фіксаваных сумах аплачваецца, зыходзячы з сумы вылічанага ў адпаведнасці з ПК адзінага падатку, г.зн. без уліку павышальнага каэфіцыента 2 за рэалізацыю тавараў без дакументаў, але з ужываннем наступных каэфіцыентаў: за перыяд з 1-га па 31 сакавіка — каэфіцыент 2; за перыяд з 1 красавіка па 30 чэрвеня — каэфіцыент 2,5; за перыяд з 1 ліпеня па 30 верасня — каэфіцыент 3; а за перыяд з 1 кастрычніка па 31 снежня будзе ўжывацца каэфіцыент 4.

СТАР. 8

■ На слыху

# Крытыкаваць ці дапамагаць?

## Удзел ва ўсенароднай экспертызе школьных падручнікаў можа прыняць любы ахвотны



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

**Не сакрэт, што школьныя падручнікі сталі ці не галоўным аб'ектам крытыкі ў беларускай школе. За што толькі не дастаецца ім ад настаўнікаў, рэпетытараў і бацькоў: і за празмерны акадэмізм і складаную для школьнікаў тэрміналогію, і за памылкі, і за адсутнасць міжпрадметных сувязяў...**

СТАР. 7

# ЖЫЦЬ НА СВАЁЙ ЗЯМЛІ, У СВАЁЙ ДЗЯРЖАВЕ

**Як ужо паведамляла «Звязда», Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка даў інтэрв'ю амерыканскаму медыяхолдынгу «Блумберг». Падчас інтэрв'ю былі закрануты актуальныя пытанні знешняй і ўнутранай палітыкі нашай краіны. Некаторыя адказы кіраўніка дзяржавы мы сёння публікуем.**

## ПРА АДЗІНУЮ ВАЛЮТУ ЕАЭС

Увядзенне адзінай валюты ў Еўразійскім эканамічным саюзе з'яўляецца пытаннем не сённяшняга дня, сказаў Прэзідэнт Беларусі. На яго думку, гэтую праблему вельмі раздулі. «Калі мы абмяркоўвалі ў Астане ўтраіх пытанне стварэння адзінай валюты, Пуцін гаварыў, што, каб больш глыбока эканамічна супрацоўнічаць, перад намі калі-небудзь паўстане пытанне адзінай валюты. Магчыма, паўстане, гэтак жа, як еўра з'явілася ў Еўрасаюзе. Магчыма. Але гэта не пытанне сённяшняга дня, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Мела месца разважанне Пуціна: «Вы не супраць, калі эксперты неяк будуць гаварыць пра гэта?» Добра, мы ад гэтым ужо даўно гаворым, няхай эксперты гавораць. Але не стаяла пытанне ўвядзення адзінай валюты ў які-небудзь перыяд, нават далёкі».

«Гэта апошні акт, які можа быць у нашым саюзе. Столькі яшчэ праблем і выклікаў Еўразійскаму эканамічнаму саюзу, што яшчэ ці дажывём да гэтай адзінай валюты», — дадаў Прэзідэнт Беларусі.

## ПРА СТАБІЛЬНАСЦЬ

«Беларусы даўно разумеюць, што дзяржава павінна быць стабільнай і што галоўны прыярытэт — гэта мір. Усё астатняе мы купім. Няхай мы будзем крыху беднейшыя за іншых. У нас няма столькі рэсурсаў, каб быць такімі багатымі. Але мы будзем жыць у мірнай краіне, дзе не будуць паміраць ад асколкаў і куль нашы дзеці і старыя», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

«Мы павінны, і я ў тым ліку цяпер, знаходзячыся на чале ўлады, зрабіць усё, каб і без мяне, без гэтага пакалення палітыкаў, якое рана ці позна пойдзе, Беларусь засталася суверэннай і незалежнай. І мы гэта зробім», — запэўніў Аляксандр Лукашэнка.

Ён таксама падкрэсліў, што ў Беларусі ў сувязі з апошнімі падзеямі ў свеце, суседніх краінах пачалі яшчэ больш разумець, што каштоўнейшага за стабільнасць і мір нічога няма.

## ПРА АДНОСІНЫ З ЗАХАДАМ

«Я не магу быць пагрозай для Захаду абсалютна, нават для адной нейкай канкрэтнай краіны. Для таго, каб быць пагрозай каму-небудзь, трэба мець пэўны арсенал і магчымасці пагражаць. Каму я магу пагражаць? Абсалютна нікому. Гэта надуманы тэзіс, надуманае абвінавачанне ў мой адрас», — сказаў кіраўнік беларускай дзяржавы.

«Чаму я павінен камусьці пагражаць? У нас што, не хапае тэрыторыі? Ды дай Бог з гэтай тэрыторыяй разабрацца! У нас на ёй жыве ўсяго 10 млн чалавек, а мы свабодна можам пракарміць 20-25 млн. Нам насельніцтва не хапае на гэтую тэрыторыю. Навошта мне каму-небудзь пагражаць? У мяне што, рэсурс каласальны — ваенны, эканамічны, фінансавы, што я сёння магу камусьці пагражаць?» — працягнуў Прэзідэнт Беларусі.

У час інтэрв'ю было закранута пытанне санкцый з боку Захаду адносна Беларусі. На думку беларускага лідара, любыя санкцыі з'яўляюцца анахранізмам, карысці ад іх няма. «Калі вы дзесьці націснеце на нас, дзверы ж адчынены ў іншых дзяржавах. Мы супрацоўнічалі і супрацоўнічаем вельмі эфектыўна з Расіяй, Кітаем, Індыяй, іншымі азіяцкімі, персідскімі, афрыканскімі дзяржавамі, у Лацінскай Амерыцы. Дзякуй Богу, цяпер і са Злучанымі Штатамі Амерыкі выходзім на нармальнае супрацоўніцтва», — адзначыў кіраўнік беларускай дзяржавы.

## ПРА СІТУАЦЫЮ Ў ЭКАНОМІЦЫ

«У нас сітуацыя няпростая, як у Расіі, Казахстане, на постсавецкай прасторы, як і ў многіх краінах свету, — сказаў кіраўнік дзяржавы. — На нас сур'ёзна паўплывалі санкцыі, якія ўвялі супраць Расіі, мы іх адчулі. І вось у Астане (гэта было нашым галоўным пытаннем) мы абмяркоўвалі тэму санкцый супраць Расіі. Дэвальвацыя расійскага рубля, абвал, абвал цэн на нафту, вядома, вельмі ўскладнілі сітуацыю ў Расіі, і мы аналізавалі, як гэта паўплывала на членаў Еўразійскага эканамічнага саюза. У нас няпростая сітуацыя ў эканоміцы, але не крытычная».

Прэзідэнт таксама заўважыў: «Вельмі дрэнна, што мы ў свой час павольнымі тэмпамі дыверсіфікавалі як сваю эканоміку, так і экспарт. Бо ў нас адкрытая эканоміка. Мы больш за палову таго, што выпускаем, прадаём. І таму залежым ад знешніх рынкаў. Мы не паспелі даволі далёка адысці ад рынку Расіі, рынку постсавецкага і перайсці на іншыя». Паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, цяпер гэты працэс фарсіруецца.

## ПРА СІТУАЦЫЮ ВА УКРАІНЕ

«Вельмі шмат там падзей, розных тэндэнцый. Калі гаварыць коратка: не хацелася б, каб гэта было зацішшам перад бурай», — адзначыў кіраўнік беларускай дзяржавы.

Паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, найбольш яго насцярожвае тое, што да мінскіх пагадненняў, перагаворнага працэсу адкрыта не былі падключаны Злучаныя Штаты Амерыкі.

Што датычыцца пытання пра ўдзел расіян у канфлікце ў Данбасе, то Аляксандр Лукашэнка адзначыў: «Не такія ўжо расіяне неразумныя, каб пасылаць туды войскі і падстаўляцца». «Дастаткова ахвотных у Расіі паехаць туды ваяваць, добрых спецыялістаў ваенных, якія прайшлі пэўную падрыхтоўку. І прыехаць у Данбас, за грошы або з ідэйных меркаванняў, — сказаў кіраўнік беларускай дзяржавы. — Іх тысячы, хто прыехаў з Расіі. І не толькі з Расіі. Я праінфармаваны аб тым, што там былі і людзі з Беларусі, зараблялі грошы. Але папракаць Расію ў тым, што там рэгулярныя расійскія часці прысутнічаюць, — гэта няправільна».

Аляксандр Лукашэнка лічыць, што калі Злучаныя Штаты Амерыкі паставяць Украіне сур'ёзнае ўзбраенне, то гэта будзе штуршком да эскалацыі канфлікту. «Расія вымушана будзе на гэта рэагаваць, таму што, калі ідзе ўнутраны канфлікт, няхай у яго ўцягнуты апасродкавана многія дзяржавы, у тым ліку Расія, Усходняя Еўропа, Польшча, гэта адно. Але, калі з'явіцца там моцны гулец, няхай праз пастаўкі зброі, зразумела, і спецыялістаў (а многія ўжо заяўляюць пра тое, што там ёсць спецыялісты Злучаных Штатаў Амерыкі па ўзбраеннях, якія абучаюць украінскую армію, ды і Парашэнка аб гэтым гаворыць), актыўны гулец, адкрыты, як Злучаныя Штаты Амерыкі, вы проста справакуеце Расію», — адзначыў кіраўнік беларускай дзяржавы.

## ПРА АДНОСІНЫ З РАСІЯЙ

Паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, у Расіі шмат палітыкаў, якія «мысляць па-імперску і думаюць, што Беларусь павінна быць нейкім паўночна-заходнім краем». «На гэта даём канкрэтны адказ: мы не будзем паўночна-заходнім краем. І не будзем ніколі, як я гэта разумею, канфліктаваць з Расіяй!» — падкрэсліў беларускі лідар.

«Кіраўніцтва Расіі ніколі не ставіла адкрыта пытанне аб тым, што Беларусь павінна быць у складзе Расіі. Былі нейкія, ведаеце, намёкі ў мінулым, на што было вельмі жорстка адрэагавана з майго боку. Мы былі і ёсць суверэнная, незалежная дзяржава. Ёй і застанёмся», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

На яго думку, не будзе і Расія ваяваць супраць Беларусі: «У кіраўніцтва Расіі няма падставы нават дрэнна ў наш бок глядзець. Яго не зразумее рускі народ — расіяне не зразумеюць. Чаго супраць нас ваяваць? Няма прычын. Таму я нават не думаю так, што Расія будзе ваяваць супраць Беларусі».

«Сто працэнтаў беларускага народа хочуць жыць на сваёй зямлі, у сваёй дзяржаве, і абараняць беларускі народ будзе сваю зямлю таксама, як належыць. Вазьміце гісторыю. У Другой сусветнай вайне мы страцілі кожнага трэцяга чалавека. Мы не сталі на калені перад агрэсарам і абаранілі сваю зямлю. Гэтак жа мы будзем абараняць яе і цяпер», — дадаў Прэзідэнт Беларусі.

**Паводле БЕЛТА.**

# ПАДПІСАНЫ ДЭКРЭТ АБ ПАПЯРЭДЖАННІ САЦЫЯЛЬНАГА ЎТРЫМАНСТВА

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 2 красавіка падпісаў дэкрэт №3 «Аб папярэджанні сацыяльнага ўтрыманства», паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.**

Прававы акт выдадзены ў мэтах стымулявання працаздольных грамадзян да працоўнай дзейнасці і забеспячэння выканання імі канстытуцыйнага абавязку па ўдзеле ў фінансаванні дзяржаўных расходаў.

Дэкрэт устанаўлівае абавязак грамадзян Беларусі, пастаянна пражываючых у рэспубліцы замежных грамадзян і асоб без грамадзянства, якія не ўдзельнічалі ў фінансаванні дзяржаўных расходаў або ўдзельнічалі ў такім фінансаванні менш як 183 каляндарныя дні ў мінулым годзе, па выплаце збору ў памеры 20 базавых велічынь.

Грамадзяне, якія займаюцца 183 каляндарныя дні і больш у год працоўнай і іншымі ўстаноўленымі дэкрэтам відамі дзейнасці (прадпрымальніцкай, рамеснай, творчай, адвакацкай або натарыяльнай, аказаннем паслуг у сферы аграэкатурызму, выкананнем работ па грамадзянска-прававых дагаворах, навучаннем на дзённай форме атрымання адукацыі), прызнаюцца ўдзельнікамі ў фінансаванні дзяржаўных расходаў і, адпаведна, вызваляюцца ад выплаты збору.

Да ўдзелу ў фінансаванні дзяржрасходаў будуць адносіцца таксама перыяды выхавання дзіцяці ва ўзросце да 7 гадоў, дзіцяці-інваліда ва ўзросце да 18 гадоў, траіх і больш непаўналетніх дзяцей.

Дэкрэтам вызначаны вычарпальны пералік катэгорый грамадзян, якія вызваляюцца ад выплаты збору. У прыватнасці, гэта недзеяздольныя грамадзяне, інваліды, асобы маладзейшыя за 18 гадоў, жанчыны, якія дасягнулі ўзросту 55 гадоў, мужчыны, якія дасягнулі ўзросту 60 гадоў, і некаторыя іншыя катэгорыі грамадзян.

Сума збору, што падлягае выплаце плацельшчыкамі, змяншаецца на сумы выплачаных імі ў мінулым падатковым перыядзе падаткаў (падаходны падатак з фізічных асоб, адзіны падатак з індывідуальных прадпрымальнікаў і іншых фізічных асоб, падатак пры спрошчанай сістэме падаткаабкладання).

Збор падлягае выплаце не пазней за 15 лістапада года, што ідзе за мінулым падатковым перыядам, на падставе паведамлення падатковага органа.

Разам з тым у мэтах стымулявання плацельшчыкаў збору да яго самастойнай выплаты прадугледжваецца магчымасць змяншэння сумы збору на 10 працэнтаў, калі плацельшчыкі збору з 1 жніўня бягучага падатковага перыяду па 31 мая года, што ідзе за мінулым падатковым перыядам, прадставяць у падатковы орган адпаведнае паведамленне. У гэтым выпадку збор падлягае выплаце не пазней за 1 ліпеня года, што ідзе за мінулым падатковым перыядам.

Няяўплата або няпоўная выплата збору вядуць да накладання штрафу ў памеры ад 2 да 4 базавых велічынь або адміністрацыйнага арышту з абавязковым прыцягненнем да выканання грамадска карысных работ.

Дэкрэт уступае ў сілу пасля яго афіцыйнага апублікавання і будзе прымяняцца да адносін, што ўзніклі з 1 студзеня 2015 года.

■ Парламенцкі дзённік

# ВЫСОКІ ДАВЕР ЛЮДЗЕЙ ДА ЎЛАДЫ ТРЭБА ЦАНІЦЬ І АПРАЎДВАЦЬ

*Выступленне Старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Мясніковіча М.У. на адкрыцці дзявятай сесіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь пятага склікання*



Паважаныя члены Савета Рэспублікі!

У адпаведнасці з артыкулам 95 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь сёння пачынае работу дзявятая сесія Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь пятага склікання.

2015 год — завяршальны год пяцігодкі — пачаўся для нашай краіны ў няпростых эканамічных умовах, выкліканых у першую чаргу спадам сусветных цэн на нафту і глыбокай дэвальвацыяй нацыянальных валют нашых асноўных гандлёвых партнёраў, што вельмі негатыўна паўплывала на беларускую эканоміку як малую адкрытую эканоміку. Савет Рэспублікі ў сувязі з гэтым у сваёй практычнай дзейнасці павінен з разуменнем ставіцца да гэтага і падтрымліваць палітыку збалансаванага функцыянавання народнагаспадарчага комплексу краіны, якую праводзяць урад і Нацыянальны банк. Трэба ўлічваць, што жорсткія абмежаванні ў грашова-крэдытнай і бюджэтнай сферах патрабуюць паўсюль задзейнічаць рэзервы, узмацніць дысцыпліну і адказнасць кадраў на ўсіх участках работы, больш увагі ўдзяляць павышэнню канкурэнтаздольнасці прадукцыі.

(Заканчэнне на 4-й стар.)

# ГАЛОЎНЫЯ АРЫЕНЦІРЫ — АБАРОНА НАЦЫЯНАЛЬНЫХ ІНТАРЭСАЎ, ЗАБЕСПЯЧЭННЕ САЦЫЯЛЬНАЙ СТАБІЛЬНАСЦІ

*Выступленне Старшыні Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Андрэйчанкі У.П. на адкрыцці сёмай сесіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь пятага склікання*



Паважаныя дэпутаты!

Паважаныя члены ўрада, запрошаныя і журналісты! Сёння ў адпаведнасці з Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь пачынае работу сёмая сесія Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.

Стратэгічныя напрамкі дзейнасці дэпутацкага корпуса вызначаны кіраўніком дзяржавы і нацэлены на безумоўную абарону нацыянальных інтарэсаў, забеспячэнне сацыяльнай стабільнасці.

У сучасных умовах як ніколі важныя кансалідацыя намаганняў дзяржавы і грамадства, пошук дадатковых рэзерваў для стварэння надзейнай асновы дынамічнага і паступальнага развіцця краіны, раскрыцця чалавечага патэнцыялу, абароны правоў і свабод грамадзян.

Ключавым у рэалізацыі гэтых задач павінна стаць наша заканадаўчая дзейнасць. Ужо сёння на разглядзе ў Палаце прадстаўнікоў знаходзіцца каля 70 законапраектаў. Іх прыняцце дасць магчымасць стварыць неабходныя ўмовы для павышэння канкурэнтаздольнасці нацыянальнай эканомікі, яе лібералізацыі, праваздзення ўзважанай сацыяльнай палітыкі.

(Заканчэнне на 5-й стар.)

## АДЗІН З НАЙВАЖНЕЙШЫХ ПАРТНЁРАЎ

Адносіны Беларусі і Расіі ўмацоўваюцца дзякуючы сувязям з рэгіёнамі

**На гэтым акцэнтаваў увагу Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка на сустрэчы з губернатарам Ніжагародскай вобласці Расійскай Федэрацыі Валерыем Шанцавым, паведамляе БЕЛТА.**

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што сярод суб'ектаў Расіі адным з найважнейшых партнёраў для Беларусі з'яўляецца Ніжагародская вобласць. Прэзідэнт са шкадаваннем заўважыў, што ў няпростай эканамічнай сітуацыі 2014 года ўзаемны тавараабарот у параўнанні з папярэднім годам знізіўся на 17 працэнтаў. Але ў той жа час ён па-ранейшаму застаецца высокім і складае каля $600 млн. «Падзенне істотнае, таму першачарговай задачай павінна стаць забеспячэнне дадатнай дынамікі гандлю. Мы проста абавязаны знаходзіць новыя агульныя падыходы, шукаць новыя формы супрацоўніцтва, падтрымліваючы старыя кааперацыйныя сувязі паміж беларускімі і ніжагародскімі прамысловымі прадпрыемствамі, дынамічна развіваць супрацоўніцтва ў галіне будаўніцтва і жыллёва-камунальнай гаспадаркі», — падкрэсліў кіраўнік беларускай дзяржавы.

Разам з эканамічным складнікам актыўна ажыццяўляецца двухбаковае ўзаемадзеянне ў галіне выставачнай дзейнасці, культуры, адукацыі, спорту, маладзёжнай палітыкі. «Вельмі разлічваю, што кіраўніцтва Ніжагародскай вобласці будзе максімальна садзейнічаць супрацоўніцтву і па гэтых, і па іншых напрамках, якія мы можам адкрыць», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

У сваю чаргу губернатар Ніжагародскай вобласці падкрэсліў, што супрацоўніцтва з Беларуссю з'яўляецца адным з ключавых напрамкаў міжнароднай знешнеэканамічнай дзейнасці рэгіёна.

■ Рэгіён

# ПРАБЛЕМЫ ПЕРААДОЛЬВАЕ ТОЙ, ХТО ПРАЦУЕ НА СУЧАСНЫМ УЗРОЎНІ

**За тры гады ў Астраўцы ўвялі ў эксплуатацыю 19 шматпавярховых жылых дамоў, шэраг іншых сацыяльных аб'ектаў. Сёлета на будаўніцтве ўсяго, што спадарожнічае ўзвядзенню Беларускай АЭС (інжынерныя сеткі, камунікацыі, аб'екты сацыяльнай сферы) прадугледжана асвоіць больш за 1 трыльён 300 мільярдаў рублёў — фактычна трэць сродкаў усёй дзяржаўнай інвестыцыйнай праграмы нашай краіны, паведаміў падчас наведвання горада энергетыкаў старшыня Гродзенскага аблвыканкама Уладзімір КРАЎЦОЎ.**


Фота БЕЛТА.

### РАБОЧАЯ СІЛА: ПОПЫТ І ПРАПАНОВА

Паводле слоў Уладзіміра Краўцова, з някепскай дынамікай у вобласці працуе будаўнічы комплекс, ёсць рост у сельскай гаспадарцы. А вось сітуацыя ў прамысловасці ў сувязі з крызіснымі з'явамі ў сусветнай эканоміцы і, перш за ўсё, у нашых суседзяў, дзе асноўныя рынкі для беларускай прадукцыі, цяпер даволі складаная: ёсць падзенне аб'ёмаў вытворчасці, экспарту тавараў, не катастрафічныя, але трывожныя тэндэнцыі з занятасцю кадраў. Калі на пачатак года на адну вакансію было 0,8 беспрацоўнага, то на 1 сакавіка — 1,4. На шэрагу прадпрыемстваў працуюць няпоўны рабочы тыдзень, на некаторых, каб была нармальная эканоміка, трэба аптымізаваць кадравы састаў.

— Гэтай праблемай мы цяпер займаемся вельмі прадметна, каб хутчэй ажыццявіць праекты, дзякуючы якім з'явяцца новыя рабочыя месцы, — зазначыў Уладзімір Краўцоў.

Ужо ў красавіку ў Ваўкавыску будзе запушчана сучасная імпартазамяшчальная вытворчасць па вырабе пладовых напаўняльнікаў для малакаперапрацоўшчыкаў. Цяпер яна ставарае 100 рабочых месцаў, а ў перспектыве іх колькасць павялічыцца ў разы. Ідуць пусканаладачныя работы новай вытворчасці шклаваты на шклозаводзе «Нёман» — гэта таксама каля 100 рабочых месцаў. Спатрэбяцца кадры і новаму заводу па перапрацоўцы малочнай сыроваткі ў Шчучыне, на шэрагу іншых прадпрыемстваў.

Гродзенскі аблвыканкам правёў аналіз балансу попыту і прапановы рабочай сілы на сёлетні год. Увогуле ў вобласці запланавалі стварыць на 3,5 тысячы рабочых месцаў больш, чым скарачаецца вакансій. Але ў некаторых рэгіёнах не выключана пэўная напружанасць, і таму Уладзімір Краўцоў даў адпаведныя даручэнні кіраўнікам гэтых раёнаў.

### ТАВАР ТРЭБА ЎМЕЦЬ ПРАДАЦЬ

Ключавая праблема — экспарт нашых тавараў, і ў гэтай сферы далёка не ўсё ўпіраецца ў аб'ектыўныя цяжкасці, лічыць Уладзімір Краўцоў:

— Свой тавар трэба ўмець прадаць, аднак не ўсе працуюць па-сучаснаму. Пачынаеш разбірацца: хто займаецца на прадпрыемстве экспартам? У аддзеле маркетынгу «сядзяць на званках» супрацоўнікі і, як за савецкім часам, прапануюць прыйсці і купіць у іх. Так поспеху ў сённяшніх рэаліях не дамагчыся. І я ўжо папярэджваў кіраўнікоў такіх прадпрыемстваў, што мы не будземназіраць за гэтым і ноймем іншых менеджараў, якія ведаюць, як гандляваць у сучасных умовах. Інструментаў тут мноства.

Ды і павучыцца ёсць у каго. Нядаўна ўдзельнікі выязнога пасяджэння Гродзенскага аблвыканкама пабывалі ў ААТ «Слоніммэбля», дзе львіная частка тавару ідзе на экспарт. Так, ёсць праблемы. Аднак калі пагоршылася сітуацыя на расійскім рынку, то павялічылі пастаўкі ў Казахстан. Пастаянна абнаўляюць, згодна з запатрабаваннямі спажыўцоў, асартымент прадукцыі, ствараюць сваю таваправодную сетку.

### З РАЗЛІКАМ НА ЎРАДЖАЙ

Цяжкасці з забеспячэннем веснавых палявых работ матэрыяламі (насенне, паліва, мінеральныя ўгнаенні) былі, але яны вырашаны, паведаміў Уладзімір Краўцоў. У добрым стане выйшлі з зімы азімыя, іх гібель — невялікая, у межах прагнозу. Пастаўлена задача да 10 красавіка завяршыць сяўбу яравых збожжавых культур. І ўвогуле разлік на высокі ўраджай, які дазволіць у тым ліку добра карміць жывёлу і атрымаць добрыя вынікі па вытворчасці малака і мяса, тым самым забяспечыўшы сыравінай новыя магутнасці на шэрагу перапрацоўчых прадпрыемстваў.

За два гады нашэсця афрыканскай чумы на Гродзеншчыне страцілі каля 120 тысяч пагалоўя свіней. Але разам з тым ёсць і пазітыў — мадэрнізацыя свінагадоўчай галіны. 38 зачыненых малых ферм, дзе было праблематычна забяспечыць належны санітарны, біялагічны кантроль, заменяць сучасныя комплексы, якія павінны даць значна лепшы вынік. Неўзабаве прыватныя інвестары распачнуць будаўніцтва двух буйных комплексаў у Бераставіцкім і Слонімскіх раёнах.

Барыс ПРАКОПЧЫК

■ Новыя тэхналогіі

# ДАРОГІ ДОБРЫЯ, КАЛІ ЦАЛКАМ БЯСПЕЧНЫЯ

**Пра вынікі канцэпцыі бяспекі дарожнага руху ў Мінску пад назвай «Добрая дарога», а таксама планы па далейшым удасканаленні працы распавялі журналістам супрацоўнікі Дзяржаўтаінспекцыі сталіцы. Акрамя гэтага, закраналіся пытанні змены хуткаснага рэжыму на некаторых вуліцах горада і выкарыстання новых тэхналогій.**




### ЗМЯНЕННІ СА ЗГОДЫ ГРАМАДСТВА

Паводле слоў начальніка аддзела тэхнічных сродкаў і сістэм ДАІ ГУУС Мінгарвыканкама Дзмітрыя НАВОЯ, пераважная большасць паказчыкаў, па якіх ацэньваецца эфектыўнасць «Добрай дарогі», у 2014 годзе была на высокім узроўні. Колькасць загінулых на дарогах сталіцы працягвае зніжацца з года ў год, і гэта галоўны індыкатар правільнасці мераў, што прымаюцца Дзяржаўтаінспекцыяй. Параўнальны аналіз іншых буйных гарадоў Еўропы па названым паказчыку паказвае, што дарожная сітуацыя ў беларускай сталіцы лепшая, чым, напрыклад, у Маскве, Санкт-Пецярбургу, Кіеве, Вільнюсе, Рызе, Таліне, Рыме. Апярэджваюць нас Стакгольм, Брусель, Лондан, Амстэрдам, Варшава.

Аднак Дзмітрый Навой звярнуў увагу на праблему дзіцячай бяспекі на дарозе. Штогод у Мінску адбываецца адно-два ДТЗ з удзелам дзяцей са смяротным зыходам. «Добрая дарога» скіравана на тое, каб такіх здарэнняў не было ўвогуле. Большасць трагічных выпадкаў адбываецца праз невысокую ступень бачнасці, калі ўздоўж праезнай часткі прыпаркаваны аўтамабілі, з-за якіх нечакана з'яўляюцца дзеці, або дварах. Сярод спосабаў рашэння праблемы — выкарыстанне звужэнняў і астраўкоў бяспекі на некаторых участках дарог, а таксама ўсталяванне агароджаў не толькі на тэрыторыі школ, але і дварах жылых дамоў (выкарыстоўваецца ў Швецыі, дзе асобна вылучаюцца дзіцячая зона, зона руху і зона паркоўкі).

— Патрабаванні па раздзяленні дваровай тэрыторыі ДАІ будзе выстаўляць да праекціроўшчыкаў, — сказаў Дзмітрый Навой. — Але трэба сказаць, што ўсе дэталі прапісаць у тэхнічных кодэксах немагчыма, там надта шмат нюансаў. І ўсе змяненні адбываюцца толькі тады, калі грамадства да гэтага гатова. Менавіта яно павінна ўсведамляць, што на першым месцы — людзі, а не аўтамабілі. Трэба супольна зрабіць усё, каб ніводнае дзіця не загінула на вуліцах.

### РАЗУМНЫ СВЯТЛАФОР ПРАПУСЦІЦЬ ПЕШАХОДА

Зараз у стадыі распрацоўкі знаходзіцца новая канцэпцыя «Добрая дарога» на перыяд 2016—2020 гадоў. Сярод мераў, якія будуць выкарыстоўвацца, — экспертызы бяспекі дарожнага руху ў праектах забудовы. Працягнецца стварэнне інтэлектуальнай транспартнай сістэмы Мінска. Галоўная праблема ў рэалізацыі гэтай задумы цяпер — адсутнасць інтэграцыі паміж асобнымі блокамі. Напрыклад няма ўзаемадзеяння паміж сістэмай кіравання грамадскім транспартам і святлафорамі. У ідэале праца апошніх павінна ўзаемадзейнічаць з транспартам так, што паездка на аўтобусе ці тралейбусе будзе максімальна хуткай і камфортнай. Відэаназіранне, сістэма апавяшчэння пра заторы і аварыі, сістэма кіравання парковачнай прасторай і іншыя будуць інтэграваны ў адзін механізм, які стане кіраваць дарожным рухам сталіцы.

Па словах Дзмітрыя Навоя, сёлета пачнецца і тэсціраванне пілотных зонаў з пешаходнымі датчыкамі. Яны ўжо ўсталяваны на скрыжаваннях вуліц Кіжаватава і Сярова, а таксама Платонава і Казлова. Калі пешаход выйшаў на праезную частку і не паспеў перайсці дарогу, то датчык можа падоўжыць працу зялёнага сігналу святлафора на некаторы час.

Канцэпцыя веласіпеднага руху ў сталіцы працягне развівацца. Мэта — з'яўленне ў Мінску 500 кіламетраў новых веладарожак. 50 з іх будуць магістральнымі (адасобленымі ад тратуараў), 450 — сумешчанымі. На гэты год запланавана стварэнне 100 кіламетраў веладарожак другога тыпу. З'явяцца на праезных частках і новыя «зялёныя пераходы», на якіх веласіпедыстам можна не спешвацца.

### ХУТЧЭЙ — НЕ ЗАЎСЁДЫ ЛЕПШ

Пра змяненні ў хуткасным рэжыме на мінскіх дарогах распавёў намеснік начальніка ДАІ ГУУС Мінгарвыканкама Андрэй ЗЫРАНАЎ. Паводле яго слоў, павелічэнне дапушчальнай хуткасці на некаторых участках МКАД, насуперак меркаванням кіроўцаў, не прывяло да большай аварыйнасці. Такія месцы выбіраюцца невыпадкова, гэтаму папярэднічае дасканалы аналіз з боку супрацоўнікаў Дзяржаўтаінспекцыі.

**Калі пешаход выйшаў на праезную частку і не паспеў перайсці дарогу, то датчык можа падоўжыць працу зялёнага сігналу святлафора на некаторы час.**

Зараз разглядаецца магчымасць павышэння хуткасці на некаторых гарадскіх вуліцах, у тым ліку на МКАД, існуе шэраг перспектыўных участкаў для ўвядзення такіх змяненняў. Ужо прынята рашэнне аб павышэнні дапушчальнай хуткасці руху да 70 кіламетраў за гадзіну на двух участках вуліцы Даўгінаўскі тракт (ад МКАД да вуліцы Будслаўскай і ад паваароту на РНПЦ псіхічнага здароўя да завулка Чарвякова). Да гэтай жа лічбы вырашана падняць хуткасць і на праспекце Дзяржынскага (участак ад вуліцы Шчорса да вуліцы Голубева), аднак да ўвядзення змяненняў неабходна правесці мерапрыемствы па ўпарадкаванні дарожнага руху — тамтэйшыя жыхары часта не звяртаюць увагі на небяспеку і ігнаруюць падземныя пераходы.

### ЦІ ЎРАТУЮЦЬ ДЗЯЦЕЙ СМАРТФОНЫ?

Кіраўнік Беларускай асацыяцыі экспертаў і сюрвееpаў на транспарце Юрый ВАЖНІК таксама звярнуў увагу на праблему гібелі на сталічных дарогах дзяцей. Калі дарослыя церпяць ад ДТЗ у спецыфічных кропках горада, то школьнікі трапляюць пад колы паўсюдна: у дварах, на магістральных дарогах і малых вуліцах. Адным з метадаў, які дазволіць зменшыць колькасць ДТЗ з іх удзелам, Юрый Важнік назваў нядаўна распрацаваны дадатак для смартфонаў і планшэтаў пад назвай SAFETYMETER, або БАЭС-лакатар. Яго ўжо можна бясплатна ўсталяваць на любыя прылады пад упраўленнем аперацыйнай сістэмы Android з крамы GooglePlay.

Пасля рэгістрацыі, якая адбываецца пры ўказанні нумара школы і паралелі, для карыстальніка становяцца даступнымі ўсе магчымасці дадатку. Сярод іх найважнейшае месца займае функцыя паведамлення пра небяспечныя для дзяцей сітуацыі, напрыклад манеўраванне, няправільную паркоўку, перавышэнне хуткасці кіроўцамі. Пасля адпраўкі звесткі паступаюць у агульны цэнтр з пазнакай, калі і ў якім месцы гэта адбылося. Такім чынам, з цягам часу перад спецыялістамі з'яўляецца дэталёвая карта праблемных месцаў, на якія трэба звярнуць увагу. Праект ужо тэсціруецца ў некаторых школах, а яго паўсюднае ўвядзенне запланавана на 1 верасня гэтага года.

Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ

# ВЫСОКІ ДАВЕР ЛЮДЗЕЙ ДА ЎЛАДЫ ТРЭБА ЦАНІЦЬ І АПРАЎДВАЦЬ

(Заканчэнне. Пачатак на 2-й стар.)

Неабходна актыўна рэалізоўваць сістэмныя і індывідуальныя эканамічныя і арганізацыйна-прававыя мерапрыемствы па кожным суб'екце гаспадарання.

Савет Рэспублікі як палата тэрытарыяльнага прадстаўніцтва Нацыянальнага сходу і кожны сенатар абавязаны ўдзяльнічаць у гэтай важнай справе. Уключаць у гэты працэс дэпутатаў мясцовых Саветаў.

У мэтах безумоўнага выканання патрабаванняў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандра Рыгоравіча Лукашэнкі, дадзеных 16 студзеня 2015 года на сёмай пазачарговай сесіі Савета Рэспублікі, нам трэба будзе ўдасканальваць сваю работу ў рэгіёнах, эфектыўна ўзаемадзейнічаць з больш як дзевятнаццацітысячным дэпутацкім корпусам на месцах. Гэта зона адказнасці ўсіх сенатараў і персанальна Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні, якую ўзначальвае Герасімовіч Святлана Міхайлаўна.

Актыўны ўдзел членаў Савета Рэспублікі ў студзені — лютым бягучага года ў 33 сесіях абласных, раённых, гарадскіх мясцовых Саветаў, дзе разглядаліся работа са зваротамі грамадзян, а таксама сацыяльна-эканамічнае развіццё адміністрацыйных тэрыторый, сведчыць аб недастатковым уплыве мясцовых Саветаў на вырашэнне існуючых задач. У адпаведнасці з прадастаўленымі заканадаўствам паўнамоцтвамі дэпутаты павінны актыўней працаваць у працоўных калектывах, выяўляць і ўстараняць вузкія месцы, дапамагаць адміністрацыі прадпрыемстваў, быць рэальным сувязным звяном паміж уладай і народам.

Вельмі вялікі патэнцыял сканцэнтраваны ў Савеце па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання, створаным пры Савеце Рэспублікі. Трэба будзе больш поўна і на сістэмнай аснове выкарыстоўваць гэтыя магчымасці. Гэта своеасаблівая школа для Савета і дэпутатаў. Напрыклад, пры разглядзе ў лютым 2015 года пытанняў рэалізацыі асноўных напрамкаў дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі стала магчымым выявіць для далейшага выкарыстання новыя формы работы, мы пачулі шмат новага і цікавага ад моладзі, чым чарговы раз было пацверджана, што ў нас цудоўная моладзь — разумная, адказная, сур'ёзна працуючая на перспектыву.

Сумесна з БРСМ прыняты рашэнні аб курыраванні Саветам Рэспублікі работы маладых людзей у сферы інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій, садзейнічанні гэтаму інавацыйнаму віду дзейнасці, якім захоплена моладзь. Гэта не разавая акцыя. Выбудоўваецца комплекс мер: стварэнне і работа бізнес-інкубатараў, падбор і падрыхтоўка кадраў, інавацыйных праектаў, дапамога маладым людзям, якія пачынаюць сваю справу, у стварэнні IT-кампаній.

Каардынацыя гэтых работ у Савеце Рэспублікі ўскладаецца на старшыню і Пастаянную камісію Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці на чале з яе старшынёй Мікалаем Уладзіміравічам Казараўцом.

Паважаныя члены Савета Рэспублікі!

У міжсесіённы перыяд прадаўжалася работа са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб. Члены Савета Рэспублікі правялі ў рэгіёнах больш за 180 асабістых прыёмаў грамадзян і прадстаўнікоў юрыдычных асоб, у ходзе якіх прынята каля 600 наведвальнікаў. Членамі Савета Рэспублікі разгледжана 1900 зваротаў.

Праведзены аналіз паказвае, што назіраецца добрая тэндэнцыя да штогадовага зніжэння колькасці зваротаў, што паступаюць у Савет Рэспублікі па пытаннях адносна кампетэнцыі мясцовых органаў улады. Безумоўна, гэта вынік прыняцця на месцах мэтанакіраваных мер па вырашэнні сацыяльна значных пытанняў, растлумачальнай работы прадстаўнікоў улады і своечасовага рэагавання на звароты грамадзян.

Але праблемнымі па-ранейшаму застаюцца пытанні паляпшэння жыллёвых умоў, будаўніцтва, прыватызацыі жылля, рамонту і эксплуатацыі жыллёвага фонду, стварэння інжынернай інфраструктуры ў раёнах індывідуальнай жылой забудовы.

Упершыню — і на гэта прашу звярнуць асаблівую ўвагу ў рабоце — за апошнія некалькі гадоў у Савет Рэспублікі на «гарачую лінію» паступілі скаргі аб парушэнні тэрмінаў выплаты заработнай платы.

Хачу адзначыць, што дзеючая сістэма работы са зваротамі грамадзян не мае патрэбы ў кардынальнай ломцы. Аднак гэта не азначае, што няма неабходнасці ў яе далейшым удасканаленні зыходзячы з новых умоў і рэалій жыцця. Таму Указ Прэзідэнта краіны ад 23 сакавіка 2015 года №135, які датычыцца мер па далейшай дэбюракратызацыі дзяржаўнага апарату, вельмі актуальны, і дэпутацкі корпус пачаў яго рэалізацыю.

Людзі звяртаюцца да ўлады па злабадзённых жыццёвых пытаннях — значыць, давяраюць, і гэты высокі давер трэба цаніць і апраўдваць.

У міжсесіённы перыяд члены Савета Рэспублікі актыўна супрацоўнічалі са сродкамі масавай інфармацыі. У перыядычных друкаваных выданнях сенатарамі апублікавана 150 матэрыялаў, больш за 20 інтэрв'ю дадзены электронным сродкам масавай інфармацыі аб заканадаўчай і міжнароднай дзейнасці Савета Рэспублікі, узаемадзеянні з органамі мясцовага самакіравання, рабоце парламентарыяў са зваротамі грамадзян, а таксама аб сустрэчах з насельніцтвам. Гэта важны напрамак дзейнасці ў нашай рабоце. Дзякуючы СМІ ў кожнага з нас ёсць магчымасць аператыўна, даступна і шырока растлумачваць грамадзянам сутнасць прымаемых законаў і рашэнняў, а таксама інфармаваць насельніцтва аб унутранай і знешняй палітыцы Рэспублікі Беларусь.

З улікам Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 13 лютага 2015 года №55 «Аб зацвярджэнні плана падрыхтоўкі законапраектаў на 2015 год» пад кіраўніцтвам намесніка старшыні Савета Рэспублікі Анатоля Максімавіча Русецкага сфарміраваны і ва ўстаноўленым парадку зацверджаны План работы над законапраектамі ў Савеце Рэспублікі на першае паўгоддзе 2015 года.

Усяго ў рабоце 65 законапраектаў і два дэкрэты Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. У сферы дзейнасці Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве 17 законапраектаў, Пастаяннай камісіі па эканоміцы, бюджэце і фінансах — 4, Пастаяннай камісіі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці — 9, Пастаяннай камісіі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні — 8 і Пастаяннай камісіі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы — 27 законапраектаў.

Як бачыце, наперадзе вялікая і вельмі адказная работа і членаў Савета Рэспублікі, і Сакратарыята Савета Рэспублікі, які з сакавіка 2015 года са згоды Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь узначальвае Аляксандр Іванавіч Слабадчук.

Хачу з задавальненнем адзначыць, паважаныя члены Савета Рэспублікі, што законапраектная дзейнасць ажыццяўляецца ў цесным кантакце і на належным узроўні ўзаемаразумення з Палатай прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь. Ідзе сумесная зладжаная і канструктыўная работа профільных камісій, праводзяцца тэматычныя семінары, круглыя сталы, канферэнцыі. Прынцыповыя пытанні разглядаюцца асабіста кіраўнікамі палат Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.

Актыўны міжсесіённы перыяд, мерапрыемствы з удзелам дэпутатаў мясцовых Саветаў, БРСМ, урада, работа ў працоўных калектывах, што я часткова адзначыў у сваім выступленні, несумненна, узбагацілі нас, актуалізавала і ўдакладніла задачы і будзе садзейнічаць эфектыўнай заканатворчай дзейнасці Савета Рэспублікі.

Паважаныя калегі!

З 1 студзеня 2015 года эканоміка Рэспублікі Беларусь працуе ва ўмовах Еўразійскага эканамічнага саюза.

Чаканні ад ЕАЭС вялікія. Гэта зразумела: узрастаючая эканамічная глабалізацыя прымушае дзяржавы ствараць аднастайныя правілы рэгулявання эканамічных адносін, што забяспечваюць свабоднае перамяшчэнне тавараў, паслуг, капіталу і рабочай сілы. Знешнія пагрозы таксама актывізуюць працэсы глыбокай інтэграцыі.

У сувязі з гэтым усё больш важнае значэнне набывае пытанне ўніфікацыі заканадаўства — у многім гэта наш участак работы. Але ў Еўразійскім эканамічным саюзе парламенцкае вымярэнне адсутнічае. Хоць гэта зусім не азначае, што Савет Рэспублікі павінен стаяць убаку і не займацца прывядзеннем нацыянальнага заканадаўства ў адпаведнасць з нормамі Дагавора аб ЕАЭС, гарманізацыяй і ўніфікацыяй беларускіх нарматыўных прававых актаў з заканадаўствам краін — удзельніц дагавора.

У нашых умовах адзіным спосабам аператыўнага стварэння ўніфікаваных норм з'яўляецца цеснае супрацоўніцтва дзяржаў, у тым ліку іх парламентаў.

Гэтыя задачы трэба будзе актыўна вырашаць Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве. З яе старшынёй Ліліяй Францаўнай Мароз мы не раз абмяркоўвалі магчымыя варыянты і механізмы.

У час майго афіцыйнага візіту ў Савет Федэрацыі Федэральнага Сходу Расійскай Федэрацыі 18-19 лютага 2015 года гэтыя пытанні былі прыярытэтнымі ў перагаворах з Валянцінай Іванаўнай Мацвіенка — старшынёй Савета Федэрацыі, Сяргеем Яўгенавічам Нарышкіным — старшынёй Дзяржаўнай Думы, Сяргеем Віктаравічам Лаўровым — міністрам замежных спраў Расійскай Федэрацыі.

І я хачу далажыць гэтай сесіі, што ёсць поўнае разуменне важнасці ўніфікацыі, гэта значыць устанаўлення ідэнтычных механізмаў прававога рэгулявання ў асобных сферах, і гарманізацыі заканадаўства — збліжэння заканадаўства дзяржаў-членаў, накіраванага на ўстанаўленне падобнага (супастаўнага) нарматыўнага прававога рэгулявання.

Адкрытае абмеркаванне мною ў лютым і сакавіку бягучага года гэтых пытанняў, тэрмінаў і глыбіні інтэграцыі са старшынёй урада Расійскай Федэрацыі Дзмітрыем Анатольевічам Мядзведзевым, намеснікам старшыні ўрада Расійскай Федэрацыі Аркадзем Уладзіміравічам Дварковічам пацвердзіла актуальнасць гэтай тэматыкі.

Бо калі кіравацца Дагаворам аб Еўразійскім эканамічным саюзе, то да 2016 года мы фактычна будзем мець толькі агульны рынак лякарстваў і медыцынскіх вырабаў, а таксама вырашэнне некаторых пытанняў рэгулявання і адміністравання асобных праваадносін. Што датычыцца іншых сфер, то да 2020 года можна разлічваць, па вялікім рахунку, на агульны энергетычны рынак і толькі да 2025 года — на агульны рынак газу, нафты і нафтапрадуктаў.

Шмат застаецца нявызначанасці па фарміраванні рынку паслуг, валютных адносін. Таму пытанні стварэння агульнага рынку без выключэнняў і абмежаванняў, як таго патрабуе наш Прэзідэнт, паважаны Аляксандр Рыгоравіч Лукашэнка, павінны вырашацца хутчэй, больш арганізавана, на заканадаўчым узроўні павінны здымацца бар'еры ва ўзаемным гандлі. Сёння ў сферы гандлёва-эканамічных адносін такіх бар'ераў 422. Дагаворам аб ЕАЭС здымаецца толькі 71. Астатнія, лічу, павінны ўстараняцца актыўней, а не на працягу ўсяго дзесяцігадовага пераходнага перыяду.

Прыведзеныя даныя сведчаць, наколькі сур'ёзна разышліся нашы заканадаўствы. У тым ліку і па гэтых прычынах узаемны тавараабарот Беларусі, Расіі і Казахстана ў 2013 годзе знізіўся на 5 працэнтаў, а ў 2014 годзе — яшчэ на 11 працэнтаў.

Савет Рэспублікі звярнуўся з канкрэтнымі прапановамі па ўдасканаленні заканадаўства ва ўрад, праінфармаваў Палату прадстаўнікоў. Разлічваем на іх канструктыўны разгляд у першую чаргу Мінюстам, Мінэканомікі і МЗС.

Краінам — удзельніцам Дагавора аб ЕАЭС трэба дамовіцца аб механізме прыняцця нацыянальных законапраектаў, каб яны не былі дыскрымінацыйнымі ў адносінах да партнёраў па ЕАЭС. Актыўна ў гэтым напрамку павінна працаваць Пастаянная камісія Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах пад кіраўніцтвам яе старшыні Уладзіміра Іванавіча Панцюхова.

Ключавую ролю ў рэалізацыі палажэнняў дагавора адыгрывае Еўразійская эканамічная камісія, з якой трэба выбудоўваць зразумелую сістэму работы па гэтых пытаннях. Асабліва па прамысловай палітыцы, што важна для Беларусі як краіны з высокай, 26-29 працэнтаў, удзельнай вагой апрацоўчай прамысловасці ў эканоміцы па дабаўленай вартасці. У той жа час у дагаворы гэты від дзейнасці мае самую слабую ступень інтэграцыі. Так і запісана: дзяржавы-члены самастойна распрацоўваюць і рэалізуюць нацыянальныя прамысловыя палітыкі. Неабходны канкрэтныя дзеянні, аж да распрацоўкі і падпісання асобнага дагавора. Для Рэспублікі Беларусь адзіная прамысловая палітыка, маштабная прамысловая кааперацыя ў ЕАЭС — гэта прыярытэт з прыярытэтаў.

З членам Калегіі Еўразійскай эканамічнай камісіі Сяргеем Сяргеевічам Сідорскім, які вядзе пытанні прамысловасці, я ў пастаянным кантакце, цяпер ім падрыхтаваны Асноўныя напрамкі прамысловага супрацоўніцтва ў рамках Еўразійскага эканамічнага саюза, якія пачалі абмяркоўвацца ў зацікаўленых дзяржорганах бакоў. Уяўляецца, што нашы прамысловыя міністэрствы, канцэрны ды і кіраўнікі профільных арганізацый недастаткова актыўныя ў пашырэнні прамкааперацыі, чакаюць, што нехта за іх будзе вырашаць іх задачы.

Такі падрабязны даклад у часткі, што датычыцца ЕАЭС, зроблены таму, што ў адзінай эканамічнай прасторы Расіі, Казахстана і Беларусі сканцэнтраваны нашы стратэгічныя эканамічныя інтарэсы.

Так, трэба больш актыўна працаваць з краінамі Захаду, Паўднёва-Усходняй Азіі, але асноўныя нашы рынкі — ЕАЭС. Нам, парламентарыям, неабходна актыўна працаваць над рэалізацыяй закона аб ратыфікацыі Дагавора аб ЕАЭС. У бліжэйшы час трэба ўнесці і прыняць змяненні ў 9 кодэксаў і законаў. Акрамя таго, змяненні закрануць 5 указаў, 14 пастаноў урада і шэрагу іншых дакументаў.

Безумоўна, вызначальную ролю ў Еўразійскім супольніцтве адыгрывае Расійская Федэрацыя як краіна з самай вялікая эканомікай.

З Расіяй у нас трывалыя і правераныя часам адносіны. Сёння мы адзначаем ужо 19-ы раз Дзень яднання народаў Беларусі і Расіі. У гэтым святочным сімвале і эканоміка, і братэрскія, партнёрскія адносіны людзей.

Паважаныя члены Савета Рэспублікі!

Міжнародная дзейнасць Савета Рэспублікі не абмяжоўваецца работай толькі з блізкім замежжам.

Шырокая праграма дзелавых міжнародных кантактаў і сувязяў Савета Рэспублікі арганічна ўпісана ў агульную канцэпцыю знешнепалітычнага курсу нашай краіны. Дасягнуты дамоўленасці і прыняты рашэнні па шэрагу прынцыповых пытанняў беларуска-туркменскага супрацоўніцтва ў час майго візіту ў Ашхабад у сакавіку 2015 года. Прэзідэнт Туркменістана Г.М. Бердымухамедаў адзначыў высокі ўзровень нашых двухбаковых адносін і добрыя тэндэнцыі іх развіцця на перспектыву. Адкрыты і добразычлівы абмен меркаваннямі адбыўся ў Меджлісе Туркменістана з яго старшынёй А.Т. Нурбердыевай. Створана парламенцкая група па супрацоўніцтве з беларускімі калегамі. Новыя магчымасці для ўмацавання адносін з арабскімі краінамі прадставілі візіты парламентарыяў Султаната Аман, МЗС Ірана, праяўлены ўзаемны інтарэс бакоў да пошуку шляхоў актывізацыі супрацоўніцтва ПАСЕ і парламента Беларусі.

Дакладчык ПАСЕ па Беларусі спадар Андрэа Рыгоні, з якім у нас адбыўся шчыры дыялог, вобразна заявіў, што ён не будзе перапісваць старыя даклады і з разуменнем ставіцца да выбару Беларусі. Абмеркаваны актуальныя, у асноўным эканамічнага характару, пытанні супрацоўніцтва і дасягнуты дамоўленасці з кіраўнікамі дыпмісій Кітая, Індыі, Германіі.

Згодна з пастановай урада Рэспублікі Беларусь, на старшыню Савета Рэспублікі і намесніка старшыні Савета Рэспублікі ўскладзена курыраванне знешнеэканамічнай дзейнасці з Індыяй, Непалам, Бангладэш і Шры-Ланкой. У Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы, якую ўзначальвае Уладзімір Лявонавіч Сянько, наперадзе вялізны аб'ём работы па названых мною пытаннях, актывізацыі міжнароднай дзейнасці, у тым ліку знешнеэканамічнай, з краінамі як блізкага замежжа, так і далёкай дугі.

Паважаныя таварышы!

У працэсе асабліва стараннага добраўпарадкавання можна знішчыць вельмі важныя дробязі. Напрыклад, у мемарыяле на месцы спаленай фашыстамі вёскі Літавец пад Дзяржынскам улетку чырвана ад дзікіх лясных суніц. Асабліва густа яны растуць чамусьці там, дзе стаялі хаты — у падмурках (такая задума мемарыяла: як у Хатыні званы на комінах, тут голыя падмуркі без сцен). Я вельмі спадзяюся, што, прыбіраючы мёртвую вёску, не павыполваюць гэты сунічнік. Бо самае моцнае ўражанне сярод лясной цішы — чырвоныя ягады ў шэрым бетоне, якія ніхто ніколі не збірае. У адным ракурсе яны мігцяць у росным сонцы як вуголле непатушанага вогнішча, у іншым — як густыя кроплі свежай крыві. Вельмі патрэбны «спецэфект», прыдуманы прыродай, просты і яркі знак. Не жыцця, а таго, што загубленага больш за семдзесят гадоў жыцця тут ужо ніколі не будзе. І слоў тут лішніх не трэба, былі б толькі буйныя пунсовыя ягады на падмурках неіснуючых хат.

ВЫ заўважылі, што апошнім часам усё менш на месцах брацкіх магіл застаецца сціплых абелісkaў, увянчаных чырвонымі зоркамі? Яны для нас — як апазнавальны знак, што тут былі пахаваны салдаты вайны, што тут трэба з удзячнасцю схіліць галаву і пакласці кветкі. Іх калісьці ставілі нашы бацькі на месцы тых, драўляных, што збівалі на скорую руку аднапалчане загінулых салдат. Замест таго, каб працягнуць традыцыю і замяніць пірамідку, якая пакрывілася ці аблупілася, на гэтакую самую новую, мы (зноў жа з лепшых памкненняў!) пачалі ставіць тыповыя чорныя гранітныя помнікі ў металічных агароджах. І стаяць на ўскраіне поля, у цэнтры вёскі, на ўзлеску гэткія філіялы могілак. Якія, пакуль не падыдзеш і не пачытаеш, што там напісана, падсвядома выклікаюць хутчэй насцярожанасць, чым павагу і ўдзячнасць, як насамрэч павінна быць...

Што датычыцца ідэі пафарбаваць, каб было «весялей», тут шмат цікавага могуць расказаць жыхары Камянца. Пра тое, як іх вежу, складзеную ў XIII стагоддзі з чырвонай цэглы, у сярэдзіне стагоддзя дваццатага паспрабавалі літаральна ператварыць у вежу Белую — і пабялілі. Пасля яна з «белай» стала аблезлай, і даволі доўга цэлай брыгадзе прамысловых альпіністаў помнік па цаглінцы да першапачатковага чырвонага выгляду чысцілі.

...АНА шэрым вельмі кранальна і выразна глядзяцца кветкі — чырвоныя, белыя, жоўтыя... любога колеру. Гэта я зноў пра памяць, свята і ўрачыстасць.

**Алена ЛЯЎКОВІЧ.**

■ Кампетэнтна

# ШКОЛА БЕЗ МАТЭМАТЫКІ,

## або «СЕНСАЦЫЯ», якой не было

**У Фінляндыі рыхтуецца да рэалізацыі маштабная рэформа адукацыі. Магчыма, што з 2020 года ў фінскіх школьнікаў не будзе такіх прадметаў, як матэматыка ці хімія, а заняткі будуць праходзіць па «тэмах» з уключэннем розных навук. Гэта навіна са спасылкай на The Independent імгненна абляцела інтэрнэт.**



Паведамлялася, што цяпер у фінскіх школьнікаў з'явіцца магчымасць вывучаць не прадметы паасобку, а гэтыя ж прадметныя веды атрымліваць у межах выбранай «тэмы» ці «з'явы», якія могуць спатрэбіцца ў будучыні. Неабходнасць тых ці іншых ведаў будуць вызначаць самі вучні. Такім чынам удасца пазбавіцца ад спрадвечнага пытання: навошта я гэта вучу?

Адзін з прыкладаў «тэмы» — «праца ў кафетэрыі». У межах «кафетэрыя» вучні атрымаюць веды па матэматыцы, замежных мовах, правапісу і камунікацыі. Яшчэ адзін прыклад — тэма «Еўрапейскі саюз». У яе рамках вучні будуць вывучаць элементы эканомікі, гісторыі, моў і геаграфіі.

СМІ пісалі, што рэформа сустрэла нямала апанентаў сярод настаўнікаў, многія з якіх прысвяцілі сваё жыццё выкладанню аднаго прадмета. Але прыхільнікі рэформы заяўляюць, што выкладаць па ўзоры пачатку XX стагоддзя ў XXI стагоддзі ўжо нельга. Настаўнікі, якія засвоілі новы падыход (а ён часам прадугледжвае работу на ўроку больш чым аднаго настаўніка), не хочуць вяртацца да традыцыйнага вядзення ўрокаў. **А вучні, што займаюцца па «тэмах» ужо два гады, маюць лепшыя за сваіх аднагодак «здабыткі» ад адукацыі (рэфарматары не ўжываюць слова «адзнакі»).**

Але пры больш уважлівым вывучэнні паведамлення пра «рэформу» ў фінскай школе высветлілася, што градус сенсацыйнасці аказаўся моцна завышаны. Ніхто там навучаць, «як працаваць у сталовай» замест традыцыйных прадметаў, не збіраецца. Наогул, самі фіны пішуць, што гэта не рэформа, а «спроба».

Каб абвергнуць растыражаваную ў СМІ недакладную інфармацыю, на афіцыйным сайце Нацыянальнага савета па адукацыі было змешчана наступнае тлумачэнне: «Навіна, што ў Фінляндыі адмяняецца выкладанне асобных прадметаў, нядаўна трапіла ў загалоўкі газет па ўсім свеце. Прадметнае навучанне не адмяняецца, хоць новаўвядзенні ў вучэбным плане базавай адукацыі прывядуць да некаторых змен у 2016 годзе. Прадметы, агульныя для ўсіх вучняў базавай школы, прапісаны ў Законе аб базавай адукацыі, і размеркаванне вучэбных гадзін паміж школьнымі прадметамі зацверджана ўказам урада».

Прадугледжаныя навучальным планам у галіне базавай адукацыі некаторыя змяненні, магчыма, і выклікалі непаразуменні, гаворыцца ў тлумачэнні. Сапраўды, для таго, каб адказваць на патрэбы будучыні, акцэнт будзе рабіцца на агульных кампетэнцыях і працы на міжпрадметным узроўні. Вучні павінны будуць удзельнічаць кожны год сама менш у адным такім міждысцыплінарным навучальным модулі.

Многія беларускія педагогі таксама пагаджаюцца з тым, што будучыня — за міждысцыплінарнымі падыходамі ў навучанні. У 2018 годзе Беларусь плануе далучыцца да аднаго з самых аўтарытэтных даследаванняў у свеце PISA, якое правярае не столькі акадэмічныя дасягненні навучэнцаў, колькі іх уменне працаваць з інфармацыяй і рэальныя жыццёвыя кампетэнцыі. Высвятляе, ці выконвае адукацыя сваю асноўную функцыю — падрыхтоўку да самастойнага жыцця. Дарэчы, Фінляндыя займае па выніках PISA лідзіруючыя пазіцыі не толькі ў Еўропе, але і ў свеце.

**Надзея НІКАЛАЕВА** ■

■ Прамысловасць

# МАДЭРНІЗАЦЫЯ ПРАКТЫЧНА СКОНЧЫЛАСЯ

## Які ж эфект?



Фота Аляксандра ШАБЛЮКА.

**Нягледзячы на тое, што мадэрнізацыя на многіх прадпрыемствах дрэваапрацоўчай галіны завяршылася, сёння становіцца актуальнай праблема з рэалізацыяй выпушчанай прадукцыі. Такую думку выказаў старшыня канцэрна «Беллеспаперапрам» Юрый НАЗАРАЎ. Аднак ёсць і перспектыўныя праекты, дзякуючы якім беларускія прадпрыемствы змогуць выпускаць новую прадукцыю з больш высокай дабаўленай вартасцю. Ёй жа плануюць замясціць частку імпарту, забіўшы тым самым адразу некалькіх зайцаў.**

Беларусь валодае значным запасам драўняных рэсурсаў, нават па еўрапейскіх мерках. Задача канцэрна «Беллеспаперапрам» — рацыянальнае і комплекснае іх выкарыстанне. Канцэрн сёння — гэта больш за 45 арганізацый розных формаў уласнасці. Разам гэтыя прадпрыемствы з'яўляюцца найбуйнейшымі спажыўцамі драўняных рэсурсаў краіны і выкарыстоўваюць каля 4 млн кубаметраў у год. З уводам у эксплуатацыю мадэрнізаваных магутнасцяў аб'ёмы спажывання драўніны да 2017 года павінны вырасці ўдвая.

### АРЭНДНЫ ЛЕС І НОВЫЯ ПЛІТЫ

Адным з найважнейшых відаў дзейнасці канцэрна з'яўляецца дрэваапрацоўка. Паводле ўказа Прэзідэнта, «Беллеспаперапрам» мае ў сваім распараджэнні арандаваныя лясныя рэсурсы (каля 2,5 млн кубаметраў).

«Такая працэдура ўведзена для таго, каб гарантаваць забеспячэнне сыравінай найбуйнейшых дрэваапрацоўчых прадпрыемстваў краіны. З-за спецыфікі дзейнасці значна больш страт канцэрн атрымлівае тады, калі вытворчасць прастойвае. Для нас сёння не так важны кошт кубаметра драўніны, як стабільная забяспечанасць сыравінай для загрузкі магутнасцяў», — адзначыў Юрый Назараў.

Мадэрнізацыя дзевяці самых буйных заводаў дазволіла стварыць новую плітную вытворчасць для Беларусі. ІДВП — ізаляцыйная драўнянавалакністая пліта — абсалютна экалагічна чысты від прадукту. Аналагаў ёй няма на ўсёй постсавецкай прасторы. Дзякуючы гэтым плітам у канцэрне збіраюцца асвоіць рынкі Францыі і Скандынавіі. Практычна ў 4 разы павялічылася вытворчасць пліт МДФ. Таксама ў канцэрне змаглі асвоіць выпуск новых пліт — ХДФ — пліты высокай шчыльнасці, якія дазваляюць рабіць падлогавае пакрыццё.

### ТРАЦІНА БЕЛАРУСКАЙ МЭБЛІ

Адным з найважнейшых напрамкаў вытворчасці з'яўляецца мэблевая прамысловасць.

«Мы вырабляем трэцюю частку мэблі ў Беларусі, і больш за 60% яе ідзе на экспарт. Асноўным заказчыкам з'яўляецца Расійская Федэрацыя, дзе ў нас ёсць уласныя дылерскія цэнтры і крамы. За 2014 год аб'ём мэблевай вытворчасці «Пінскдрэва», які з'яўляецца ўласнасцю канцэрна, дасягнуў узроўню звыш 3 млрд рублёў, што складае больш за трэць усяго вытворчага аб'ёму канцэрна», — расказаў старшыня канцэрна «Беллеспаперапрам».

### ХАРЧОВУЮ ПРАДУКЦЫЮ — У АЙЧЫННУЮ ЎПАКОЎКУ

Гаворачы аб дрэваапрацоўчай прамысловасці, варта адзначыць, што туды ўжо інвеставана каля 1,2 млрд еўра. Сёння праводзіцца мадэрнізацыя цэлюлозна-папяровай прамысловасці, і яна з'яўляецца не менш маштабнай. Туды будзе ўкладзена каля 1,4 млрд долараў. Гэта дазволіць рэалізаваць маштабныя праекты. Адным з іх з'яўляецца Светлагорскі цэлюлозна-кардонны камбінат. Дзякуючы яму ў Беларусі плануюць атрымліваць новы від прадукцыі — беленую цэлюлозу. Таксама ў абарот плануюць уцягнуць ліставую драўніну. Не менш важным з'яўляецца будаўніцтва завода ў Добрушы па вытворчасці беленага кардону. Прадукцыя гэтага завода дасць магчымасць замясціць імпарт упакоўкі для харчовай прамысловасці. Таксама цікавы і той факт, што цэлюлозна-папяровая прамысловасць з'яўляецца самым буйным спажыўцом макулатурнай сыравіны.

### ЯКІ Ж НАСТУПНЫ КРОК?

Як адзначыў Юрый Назараў, у галіновай праграме збалансаванага развіцця эканомікі канцэрна адным з найважнейшых пунктаў з'яўляюцца мерапрыемствы па зніжэнні выдаткаў. У сувязі з гэтым пастаўлена задача знізіць сабекошт прадукцыі па прадпрыемствах да 10%, што эквівалентна 1,5 трлн рублёў. На некаторых прадпрыемствах такая мера прывядзе да скарачэнняў працоўных месцаў. Але таксама гэта дазволіць дыверсіфікаваць рынкі. Цяпер у спіс геаграфіі экспарту якіх уваходзяць больш за 40 краін. Доля СНД у экспартных пастаўках з-за неспрыяльных эканамічных умоў скарачаецца. Сёння яна складае каля 70%. У дадзены момант асвойваюцца рынкі Ірана, Турцыі і Азербайджана, якія спрабуюць завабіць мэбляй і новай прадукцыяй.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ**

■ Міжнародная падзея

# НА ЎЗРОЎНІ ТОКІА

## Мінск у добрым тэмпе рыхтуецца да правядзення Генасамблеі МЭК

**Пра гэта паведаміла кіраўнік падраздзялення па міжнародных камунікацыях і маркетынгу Міжнароднай электратэхнічнай камісіі Габрыэла ЭРЛІХ падчас свайго візіту ў беларускую сталіцу.**

Датычна праграмы свайго прыезду ў Мінск Габрыэла Эрліх адзначыла, што ў цэнтры ўвагі была падрыхтоўка да мерапрыемства, якое адбудзецца 16 кастрычніка: «Гэта адкрытая сесія, на якой зможа прысутнічаць пашыраная колькасць удзельнікаў, у тым ліку ад краіны-гаспадыні. Мая задача — дапамагчы скаардынаваць падрыхтоўку да гэтага мерапрыемства». Паводле яе слоў, галоўнай тэмай адкрытай сесіі стане энергаэфектыўнасць. Удзельнікі абмяркуюць, як рэальна дасягаць высокіх паказчыкаў эканоміі. «Вельмі важна, што ў гэтым мерапрыемстве мяркуецца больш шырокі ўдзел прадстаўнікоў краін Еўразійскага эканамічнага саюза, каб мы маглі дапамагчы ўкараняць выпрацаваныя рашэнні не толькі на тэрыторыі Беларусі, але і ў дзяржавах ЕАЭС», — заявіла Габрыэла Эрліх.

Дарэчы, каля 75% беларускіх стандартаў ідэнтычны або заснаваны на стандартах МЭК. «Гэта высокі ўзровень гарманізацыі. Думаю, Беларусь можа атрымаць карысць ад актыўнага ўдзелу ў рабоце МЭК. Чым больш людзей удзельнічае ў распрацоўцы стандартаў, тым лепшыя яны на выхадзе», — адзначыла Габрыэла Эрліх. Паводле яе слоў, поспех заключаецца ў тым, што ў працэсе сумеснай працы ўлічваюцца розныя пункты гледжання. «МЭК — выключна навукова-тэхнічная арганізацыя. І, калі вы ўдзельнічаеце ў яе працы, вы не пакідаеце магчымасці камусьці іншаму вырашаць, што добра, а што дрэнна», — патлумачыла Габрыэла Эрліх.

Нагадаем, што 79-я Генеральная асамблея Міжнароднай электратэхнічнай камісіі пройдзе ў Мінску з 5 па 16 кастрычніка 2015 года і стане маштабным форумам для эканамічнага і навукова-тэхнічнага жыцця не толькі Беларусі, але і ўсяго свету.

**Уладзіслаў КУЛЕЦКІ**

# РЭШТКІ РАСКЛАЛІ ПА ПАЛІЦАХ

### АБ ПАДАТКОВЫМ РАЗЛІКУ

Паводле агульных правілаў, падача падатковай дэкларацыі (разліку) па адзіным падатку з індывідуальных прадпрымальнікаў і іншых фізічных асоб (далей — падатковая дэкларацыя па адзіным падатку) і аплата адзінага падатку ажыццяўляецца ў тэрміны, вызначаныя пунктамі 10 і 11 артыкула 299 ПК (напрыклад, за красавік падача дэкларацыі па адзіным падатку і выплата адзінага падатку робіцца ў тэрмін не пазней за 1 красавіка). Вылічаная сумы ПДВ у фіксаванай суме адлюстроўваюцца асобным радком у падатковай дэкларацыі па адзіным падатку, аплата падатку на дабаўленую вартасць у фіксаванай суме — у тэрміны, вызначаныя для адзінага падатку. Адпаведна і аплата ПДВ у фіксаванай суме за красавік таксама робіцца ў тэрмін не пазней за 1 красавіка.

Выключэннем з'яўляецца вылічэнне і аплата адзінага падатку, а таксама ПДВ у фіксаваных сумах сёлета за сакавік. Так, у адпаведнасці з пунктам 2 Указа №143, у выпадку ажыццяўлення ў сакавіку рознічнага гандлю рэшткамі тавараў падаць падатковую дэкларацыю па адзіным падатку і заплаціць адзіны падатак, а таксама ПДВ у фіксаванай суме неабходна было ў тэрмін не пазней за 31 сакавіка 2015 года.

### АПТОВЫ ГАНДАЛЬ

Парадак аплаты падаткаў пры аптовым гандлі рэшткамі тавараў не змяняецца. Нагадаем, што ў гэтым выпадку індывідуальныя прадпрымальнікі аплачваюць падаходны падатак з фізічных асоб або падатак пры спрошчанай сістэме падаткаабкладання, а таксама падатак на дабаўленую вартасць у адпаведнасці з ПК з улікам прадугледжаных Указам №222 асаблівасцяў. Указам №143 удакладнена, што ў такім жа парадку будзе рабіцца падаткаабкладанне пры іншым адчужэнні рэшткаў тавараў, у тым ліку на бязвыплатнай аснове, а таксама ўнясенні такіх тавараў у якасці ўкладу ў статутны фонд камерцыйнай арганізацыі.

### КАЛІ З ДАКУМЕНТАМІ ПАРАДАК

Тыя індывідуальныя прадпрымальнікі, якія будуць мець дакументы на ўсе тавары, маюць права перайсці на спрошчаную сістэму падаткаабкладання (далей — ССП) з 1 красавіка, з 1 ліпеня або з 1 кастрычніка 2015 года. У гэтых выпадках для пераходу на ССП індывідуальныя прадпрымальнікі павінны будуць у тэрмін не пазней за 1 красавіка, 1 ліпеня альбо 1 кастрычніка адпаведна падаць апавяшчэнне аб пераходзе на спрошчаную сістэму падаткаабкладання пэўнай формы (падпункт 1.3 пункта 1 Указа №143).




Прэс-служба міністэрства звяртае ўвагу на тое, што паранейшаму індывідуальныя прадпрымальнікі — плацельшчыкі адзінага падатку абавязаны з 1 ліпеня 2014 года ажыццяўляць увоз, транспартаванне па тэрыторыі Беларусі, захоўванне і рэалізацыю тавараў (у тым ліку тавараў, увезеных з Расіі), на падставе дакументаў, якія пацвярджаюць набыццё (паступленне) гэтых тавараў. Пры гэтым пры ўвозе тавараў з тэрыторыі дзяржаў — членаў Еўразійскага эканамічнага саюза індывідуальныя прадпрымальнікі — плацельшчыкі адзінага падатку абавязаны рабіць аплату «ўвознага» ПДВ у адпаведнасці з пратаколам аб парадку збірання ўскосных падаткаў і механізме кантролю за іх аплатай пры экспарце і імпарце тавараў, выкананні работ, аказанні паслуг (Дадатак №18 да Дагавора аб Еўразійскім эканамічным саюзе, што быў падпісаны ў г. Астане 29 мая 2014 года).

### ПАСЛЯ 1 СТУДЗЕНЯ

Асобна ў дакуменце гаворыцца аб тым, што з 1 студзеня 2016 года індывідуальным прадпрымальнікам забараняецца ажыццяўляць рознічны, аптовы гандаль, іншае адчужэнне, у тым ліку на бязвыплатнай аснове, рэштак тавараў, а таксама ўнясенне іх у якасці ўкладу ў статутны фонд унітарнага прадпрыемства (падпункт 1.2 пункта 1 Указа №143). Падпункты 1.1-1.3 пункта 1 Указа №143 уступаюць у сілу пасля яго афіцыйнага апублікавання і распаўсюджваюць сваё дзеянне на адносіны, якія ўзніклі сёлета з 1 сакавіка.

### РАСТЛУМАЧЫЛІ ЗАМЕЖНІКАМ

Для замежных грамадзян і асоб без грамадзянства, якія часова знаходзяцца і часова пражываюць у Беларусі, Указам №143 вызначаны закрыты пералік тавараў, якія яны маюць права рэалізаваць на гандлёвых месцах на рынках і (або) у іншых устаноўленых мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі месцах. Да такіх тавараў адносяцца творы жывапісу, графікі, скульптуры, прадметы народных промыслаў, прадукцыя раслінаводства і пчалярства.

### МЕСЦА МАЕ ЗНАЧЭННЕ

Акрамя таго, у мэтах спынення неарганізаванай рэалізацыі тавараў у грамадскіх месцах фізічнымі асобамі Указам №143 вызначаны месцы, дзе такая рэалізацыя забаронена. Так, фізічным асобам, якія не ажыццяўляюць прадпрымальніцкую дзейнасць, а таксама замежным грамадзянам і асобам без грамадзянства, якія часова знаходзяцца і часова пражываюць у нашай краіне, забараняецца рэалізацыя тавараў загадзя не вызначанаму колу асоб на вуліцы, стадыёне, у скверы, парку, грамадскім транспарце ці ў іншых грамадскіх месцах, за выключэннем рэалізацыі тавараў на гандлёвых месцах на рынках і (або) у іншых вызначаных мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі месцах у адпаведнасці з падпунктам 1.5 пункта 1 Указа №222. Названыя нормы ў дачыненні да фізічных асоб, у тым ліку замежных грамадзян, уступаюць у сілу праз тры месяцы пасля афіцыйнага апублікавання Указа №143.

**Сяргей КУРКАЧ.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1 стар.)*

■ Ёсць праблема

# ЗАРПЛАТА — НЕ ГАЛОЎНЫ ФАКТАР

## Аперацыйным сёстрам гатовы плаціць па 13 мільёнаў

**Міністэрства аховы здароўя адзначыла рост скаргаў ад насельніцтва на 5% у мінулым годзе. З чым гэта звязана, як з гэтым разбіраюцца і што можна зрабіць? Пра гэта ішла размова на круглым стале «Як нас лечаць у бальніцах», на якім сабраліся прадстаўнікі Міністэрства аховы здароўя, Мінгарвыканкама, галоўурачы некаторых мінскіх бальніц і юрысты.**

### ХВОРЫЯ Ў КАЛІДОРАХ

Знаёмая на днях абуралася: яе сваячку шпіталізавалі ў аддзяленне кардыялогіі. «Дык яе паклалі ў калідоры і тры дні там трымалі, уяўляеце? У палатах месцаў не было. А яна ў гэтым калідоры «падхапіла» бранхіт, хоць з яе станам здароўя, пасля аперацыі на сэрцы, наогул прастываць нельга...» — распавядала знаёмая.

— Сапраўды, такая праблема існуе. Але яна тычыцца толькі экстраннай шпіталізацыі, — не спрачаецца **начальнік аддзела спецыялізаванай медыцынскай дапамогі камітэта па ахове здароўя Мінгарвыканкама Алена РУДКОВА.** — Але пацыент у хуткім часе пераводзіцца ў палату, дзе працягваецца яго лячэнне. Мы працуем над гэтай праблемай.

Таксама, па словах Алены Рудковай, калі хворага часова размяшчаюць у калідоры, з ім гэта абавязкова ўзгадняецца.

Галоўурачы бальніц адзначаюць, што гэта звязана і з рэканструкцыяй, якая цяпер праходзіць у многіх клінічных установах сталіцы, і заклікаюць гараджан крыху пацярпець.

Каб разгрузіць бальніцы, адкрываюцца аддзяленні дзённага знаходжання. А на базе прыёмных аддзяленняў, па словах прадстаўніка камітэта па ахове здароўя Мінгарвыканкама, цяпер функцыянуюць дыягнастычныя палаты. У іх аказваецца неадкладная дапамога, пацыента экстранна абследуюць і вызначаюць, мае ён патрэбу ў шпіталізацыі ці не.

Сваім бачаннем таго, як можна разгрузіць у тым ліку і бальніцы і паліклінікі, падзяліўся **прадстаўнік Сусветнай арганізацыі аховы здароўя ў Беларусі Ягор ЗАЙЦАЎ.** У Заходняй Еўропе, паводле яго слоў, чалавеку не трэба ісці і браць бальнічны, калі ў яго лёгкая прастуда. Дастаткова паведаміць пра хваробу працадаўцу па тэлефоне або па электроннай пошце. А каб падобная сістэма не правакавала прагульшчыкаў, такой прывілеяй можна скарыстацца не больш за два разы на год. Падобная практыка значна зніжае нагрузку на першаснае амбулаторнае звяно. «Чаму б не зрабіць так і ў Беларусі?» — разважае Ягор Зайцаў.

### ВІНА ЎРАЧА АБО НЯШЧАСНЫ ВЫПАДАК?

Увогуле, эксперты звязваюць павышэнне колькасці скаргаў з ростам платных медыцынскіх паслуг. Калі людзі плацяць грошы, яны пачынаюць больш патрабавальна ставіцца да медыцынскай дапамогі. І, як правіла, большасць скаргаў, па словах спецыялістаў, адносіцца да сферы ўзаемаадносінаў доктара і пацыента.

«Кожная скарга з боку пацыента дасканала разбіраецца ва ўстанове аховы здароўя», — запэўнівае **намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення арганізацыі медыцынскай дапамогі, начальнік аддзела спецыялізаванай медыцынскай дапамогі Міністэрства аховы здароўя Таццяна МІГАЛЬ**. Яна таксама патлумачыла, што, калі ў клініку трапляе пацыент з запушчаным захворваннем, кожны такі выпадак таксама падвяргаецца дакладнаму аналізу.



Тым не менш, **юрыст Кацярына АРЛОЎСКАЯ** лічыць, што многія праблемы былі б вырашаны, калі б у законе аб ахове здароўя былі дадзены азначэнні тэрмінаў «якасна і няякасна аказаная медыцынская паслуга», «урачэбная памылка», «няшчасны выпадак» і іншых.

Сапраўды, часам у тым, што адбылося, ёсць віна доктара. Аднак здараецца шмат выпадкаў, калі ён не вінаваты. Іншым разам, на думку Кацярыны Арлоўскай, можа мець месца тэхнічны збой, а часам — немагчымасць дапамагчы па аб'ектыўных прычынах, калі медыцына на дадзеным этапе свайго развіцця проста не ў сілах штосьці вылечыць.

Бываюць і проста няшчасныя выпадкі. Кацярына Арлоўская ўзгадала такі са сваёй практыкі, калі маладзі і ўвогуле здаровы мужчына пасля нескладанай аперацыі апынуўся ў стане клінічнай смерці. Яго выратавалі, але чалавек у выніку стаў інвалідам. Мужчына спрабаваў даказаць, што гэта была памылка медыкаў. «Мне было па-чалавечы шкада яго, аднак медыцынскай памылкі ў дадзеным выпадку не было. Няшчасны выпадак — упершыню выяўленая алергічная рэакцыя ў чалавека, які раней з гэтым ніколі не сутыкаўся», — расказала юрыст.

Яна адзначыла, што сітуацыю магло б палепшыць з'яўленне ў заканадаўстве новай галіны — медыцынскага права, па аналогіі з працоўным, крымінальным, адміністрацыйным і інш.

### СТРАХАВАННЕ АД ПАМЫЛАК

Дарэчы, у сітуацыі, калі падаюцца судовыя іскі, пакутуюць не толькі пацыенты, але і дактары. Па словах юрыста, судовыя справы па такіх выпадках доўжацца вельмі доўга, як правіла, больш за год, а то і два. А гэта — грошы, час, выдаткі на правядзенне экспертыз. Спецыялісты, якія павінны лячыць людзей, марнуюць час на збіранне доказаў.

— Любы медык у любой краіне мае рызыку памыліцца, — упэўнены Ягор Зайцаў. — Можна пакараць доктара, пасадзіць яго ў турму, але сістэма аховы здароўя ад гэтага не выйграе.

Эксперт адзначыў, што на Захадзе існуе спецыяльнае страхаванне для медыкаў — ад урачэбных памылак.

Але такі від страхавання ёсць і ў Беларусі. Гэта так званае страхаванне прафесійнай дзейнасці дактароў. Праўда, выкарыстоўваюць яго ў асноўным дзяржаўныя бальніцы: для прыватных клінік гэта вялікія выдаткі.

Напрыклад, па словах **галоўнага ўрача мінскай бальніцы №4 Аляксандра ТРАЯНАВА,** хірургі ў яго бальніцы страхуюцца на суму ў 3 тысячы долараў, пластычныя хірургі — 6 тысяч, іншыя дактары — на суму ад 1 да 1,5 тысячы долараў. Бальніца штоквартальна выплачвае страхавыя ўнёскі з сваёй пазабюджэтнай дзейнасці. І калі здарыцца страхавы выпадак, страхавая кампанія пакрые суму прэтэнзій. Але пры гэтым варта адзначыць, што ў нашай краіне страхуецца толькі прычыненая пацыенту шкода, а маральная — страхоўкай не пакрываецца. Гэтая сума цалкам кладзецца на плечы доктара.

### І НАПРЫКАНЦЫ — ПРА ЗАРОБКІ...

Пра заробкі медыкаў не казаў толькі лянівы. Аднак справа не толькі ў іх. Сёння сярэдні заробак у мінскіх бальніцах — 5,5-6 млн рублёў (адзначым, гэта не заробак дактароў, а сярэдні заробак па бальніцы). Самыя высокія заробкі па гораду ў 9-й бальніцы, яны роўныя 7,3-7,4 млн рублёў.

Тым не менш, у 9-й бальніцы маюцца вакансіі, таму што, па словах **галоўнага ўрача Валерыя КУШНІРЭНКІ**, зарплата — не асноўны фактар у прыцягненні кадраў.

— Сёння мы гатовы плаціць аперацыйным медсёстрам да 13 мільёнаў і больш, — сказаў галоўны ўрач, — але яны да нас не ідуць. Бо аперацыйная медсястра павінна адпрацаваць дзень у аперацыйнай, а пасля гэтага яшчэ можа паехаць з брыгадай на забор донарскіх органаў, напрыклад, за горад, у раённую бальніцу, потым вярнуцца ў клініку, усё здаць, а назаўтра на працу... Занадта цяжка. Не сакрэт, што з бальніц медсёстры пераходзяць у паліклінікі, у фізіятэрапеўтычныя аддзяленні, напрыклад, дзе плацяць куды менш, але праца спакойная...

**Святлана БУСЬКО**

**Даведка «Звязды»**

- Забяспечанасць насельніцтва бальнічнымі ложкамі кругласутачнага знаходжання ў Мінску складае 6,2 на 1 тысячу насельніцтва (з улікам рэспубліканскіх устаноў аховы здароўя, дзе мінчане таксама атрымліваюць лячэнне, — 7,67 на 1 тысячу насельніцтва). Нарматыў для Мінска — 8 ложкаў на 1 тысячу насельніцтва. Нарматыў для рэспублікі крыху вышэйшы — 9 ложкаў на 1 тысячу насельніцтва.
- Для параўнання: у Расіі забяспечанасць бальнічнымі ложкамі складае 8,56 на 1 тысячу насельніцтва, у Чэхіі — 8,38, Германіі — 8,26, Аўстрыі — 7,65, Францыі — 7,34, Швейцарыі — 5, Ізраілі — 5,97 ложкаў на 1 тысячу насельніцтва.
- Найбольш у нас бальнічных ложкаў кардыялагічнага профілю — прыкладна 10%. Ложкаў хірургічнага профілю — 6,3%, неўралагічнага — 5,8. Такое размеркаванне адпавядае структуры захворванняў.
- Калі ў 2010 годзе сярэдні тэрмін знаходжання пацыентаў у бальніцы складаў 9,6 дня, то ў 2014 годзе — 9 дзён.

ФАКТЫ НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ

### НЕПАГАДЗЬ СУПАКОІЦЦА, АЛЕ ЯШЧЭ НЕ ПАЦЯПЛЕЕ

**Гэтымі днямі актыўныя атмасферныя франты ўжо пакінулі тэрыторыю нашай краіны, але захаваецца няўстойлівае халоднае надвор'е. Пра гэта паведаміла галоўны сіноптык Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Святлана РЫБАКОВА.**

Таму ў пятніцу Беларусь застанецца ў зоне паніжанага атмасфернага ціску і пад уплывам халодных паветраных мас, якія рухаюцца да нас з боку Балтыкі. Удзень прагназуюцца кароткачасовыя ападкі ў выглядзе дажджу і мокрага снегу, а максімальная тэмпература паветра складзе плюс 2-8 градусаў. На выхадных адбудзецца рост атмасфернага ціску, таму згаданыя ападкі чакаюцца ўжо толькі месцамі. Тэмпература паветра ўначы будзе вагацца ад мінус 4 да плюс 1 градуса, удзень — 2-7 цяпла, а па Брэсцкай і Гродзенскай абласцях прыгрэе да плюс 9 градусаў.

Паводле доўгатэрміновых прагнозаў айчынных спецыялістаў, у пачатку наступнага тыдня (панядзелак і аўторак) таксама месцамі пройдуць дождж і мокры снег. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 5 да плюс 2 градусаў, удзень — 2-7 цяпла, а на поўдні краіны — да плюс 9 градусаў. Не бачаць устойлівага цяпла сіноптыкі і ў другой палове наступнага тыдня, бо ў сераду ў Беларусь можа завітаць чарговы атмасферны фронт з боку Скандынавіі. А там, хутчэй за ўсё, нас зноў чакае дождж з мокрым снегам, уначы — невялікія замаразкі.

**Сяргей КУРКАЧ.**

### КНІГІ БЕЛАРУСІ — У ГАСЦЯХ У САНКТ-ПЕЦЯРБУРГУ

**21—24 мая ў горадзе на Няве пройдзе Х Санкт-Пецярбургскі міжнародны кніжны салон. Краінай — Ганаровым госцем з'яўляецца Рэспубліка Беларусь. Такі адказ Міністэрства інфармацыі Беларусі на запрашэнне ўрада Санкт-Пецярбурга.**

Для прадстаўлення беларускага прыгожага пісьменства ствараецца арганізацыйны камітэт з беларускага боку, куды ўвойдуць і прадстаўнікі Міністэрства культуры, Міністэрства адукацыі, Саюза пісьменнікаў Беларусі, Нацыянальнай бібліятэкі краіны. Чакаецца, што многія сустрэчы, прэзентацыі на кніжным свяце ў Санкт-Пецярбургу будуць мець «беларускі характар». Напярэдадні салона ў Мінску пабачыць свет кніга з твораў пісьменнікаў Беларусі і Санкт-Пецярбурга «Сугучча».

**Сяргей ШЫЧКО.**

### У СТАЛІЦЫ З'ЯВЯЦЦА НОВЫЯ ПАЛІКЛІНІКІ

**Пра гэта паведаміў намеснік старшыні Мінгарвыканкама Ігар КАРПЕНКА на сустрэчы з работнікамі прадпрыемства «Белмедпрэпараты».**

— У перспектыве плануем адкрыць дзіцячую паліклініку ў Брылевічах. Работы ўжо вядуцца, — сказаў Ігар Карпенка. — У Фрунзенскім раёне ў 1-м квартале 2016 года ўвядзём у эксплуатацыю дарослую паліклініку.

Па яго словах, занепакоенасць сёння выклікае дэфіцыт кадраў у сферы аховы здароўя. «Мінчан трэба арыентаваць на атрыманне сярэдняй медыцынскай адукацыі», — лічыць Ігар Карпенка.

Гаворачы пра стан сацыяльнай сферы сталіцы, якую ён курыруе, намеснік старшыні Мінгарвыканкама адзначыў, што яны ўпісваюцца ў параметры бюджэту, аднак пры гэтым даводзіцца працаваць у рэжыме жорсткай эканоміі. Напрыклад не пачынаецца будаўніцтва некаторых аб'ектаў, таму што трэба дабудаваць пачатыя раней. Між тым, сацыяльныя праграмы не згорнуты.

**Дзіяна СЕРАДЗЮК.**

### РОТА РАСПАЧЫНАЕ ТРЭНІРОЎКІ

**У сталіцы ў сувязі з правядзеннем трэніровак зводнай роты ганаровай варты будзе часова абмежаваны рух транспарту.**

Гаворка ідзе пра праспект Машэрава ад вуліцы Даўмана да праспекта Пераможцаў. Тут 10, 13, 15, 17, 20, 22, 24, 26, 28, 30 красавіка і 1 мая ў перыяд з 22.00 да 24.00 будуць унесены змяненні ў аўтобусныя маршруты №№ 29, 44, 136 — з рухам па праспекце Машэрава, вуліцы Багдановіча, праспекце Пераможцаў у абодвух накірунках з прыпыначным пунктам «Ст. м. «Няміга», «Палац спорту» на ўчастку, які змяняецца. Пасажырам і кіроўцам варта ўлічваць гэтую інфармацыю пры планаванні паездак і маршруту.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

**Уважаемые акционеры!**
**«Приорбанк» ОАО**
**доводит до Вашего сведения информацию о РАЗМЕРЕ И ПОРЯДКЕ ВЫПЛАТЫ ДИВИДЕНДОВ ПО ИТОГАМ 2014 ГОДА:**

- Размер дивидендов по простым акциям составляет 3080 рубля на акцию;
- размер дивидендов по привилегированным акциям составляет 1675 рублей на акцию;
- выплата дивидендов будет начата не позднее 06 апреля 2015 года. Срок выплаты – в течение 60 дней.
- телефон для справок: 8 (017) 289 90 90.

Для получения дивидендов физическим лицам необходимо иметь при себе паспорт. Получение дивидендов за третьих лиц допускается при наличии доверенности.

Лицензия на осуществление банковской деятельности НБ РБ № 12 от 06.05.2013 года. УНП 100220190.

## БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 января 2015 г.

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | 2014 год | 2013 год |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | **АКТИВЫ** | | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | 5 | 563 862 | 380 068 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | | 5 608 | 11 263 |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | 6 | 3 930 275 | 2 311 691 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | 7, 34 | 1 517 655 | 854 690 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | 8, 34 | 3 521 317 | 1 882 405 |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | 9, 34 | 11 176 180 | 8 564 508 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | 10 | 707 726 | 824 830 |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | 11 | 148 | 148 |
| 10 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | 12 | 674 922 | 479 188 |
| 11 | Имущество, предназначенное для продажи | 1110 | 13 | 25 499 | - |
| 12 | Отложенные налоговые активы | 1111 | | - | - |
| 13 | Прочие активы | 1112 | 14, 34 | 282 487 | 170 883 |
| **14** | **ИТОГО активы** | **11** | | **22 405 679** | **15 479 674** |
| **15** | **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | | |
| 16 | Средства Национального банка | 1201 | 15 | 425 987 | 324 054 |
| 17 | Средства банков | 1202 | 16, 34 | 5 085 462 | 3 834 444 |
| 18 | Средства клиентов | 1203 | 17, 34 | 12 896 924 | 8 111 385 |
| 19 | Ценные бумаги, выпущенные банком | 1204 | 18 | 739 404 | 620 083 |
| 20 | Производные финансовые обязательства | 1205 | 10 | - | 30 |
| 21 | Отложенные налоговые обязательства | 1206 | | - | - |
| 22 | Прочие обязательства | 1207 | 19, 34 | 156 008 | 174 834 |
| **23** | **ВСЕГО обязательства** | **120** | | **19 303 785** | **13 064 830** |
| **24** | **СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | | |
| 25 | Уставный фонд | 1211 | 20 | 1 252 269 | 1 252 269 |
| 26 | Эмиссионный доход | 1212 | | - | - |
| 27 | Резервный фонд | 1213 | 21 | 280 902 | 231 236 |
| 28 | Фонд переоценки статей баланса | 1214 | 22 | 211 015 | 222 004 |
| 29 | Накопленная прибыль | 1215 | 23 | 1 357 708 | 709 335 |
| 30 | ВСЕГО собственный капитал | 121 | | 3 101 894 | 2 414 844 |
| **31** | **ИТОГО обязательства и собственный капитал** | **12** | | **22 405 679** | **15 479 674** |

**Белгазпромбанк**
*Энергия твоего будущего!*

### Совместное белорусско-российское ОАО «Белгазпромбанк»

220121, г. Минск, ул. Притыцкого, 60/2. Телефон для справок: 120

**Адрес размещения годового отчета:**
http://www.belgazprombank.by/about/finansovie_pokazateli/finansovaya_otchetnost/finansovaya_otchetnost_rb/godovaya_fo_rb/

## ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ за 2014 год

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | 2014 год | 2013 год |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | | 1 959 035 | 1 421 159 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | | 1 001 602 | 725 988 |
| 3 | *Чистые процентные доходы* | 201 | 25, 34 | 957 433 | 695 171 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | | 449 763 | 334 583 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | | 143 425 | 120 071 |
| 6 | *Чистые комиссионные доходы* | 202 | 26, 34 | 306 338 | 214 512 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | | 2 363 | 775 |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | 27 | 3 228 | 4 478 |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | 28 | 63 958 | 19 901 |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | 29 | 227 011 | 163 016 |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | 30 | 148 447 | 55 461 |
| 12 | Прочие доходы | 208 | 31, 34 | 152 450 | 60 600 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | 32, 34 | 602 719 | 409 083 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | 33 | 59 674 | 102 966 |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | | 901 941 | 590 943 |
| 16 | Расход (доход) по налогу на прибыль | 212 | | 135 140 | 94 280 |
| **17** | **ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК)** | **2** | | **766 801** | **496 663** |
| **18** | **Сведения о прибыли на одну акцию в белорусских рублях** | | | | |
| 19 | Базовая прибыль на простую акцию | 22 | 35 | 0,61 | 0,40 |
| 20 | Разводненная прибыль на простую акцию | 23 | | - | - |

## ОТЧЕТ ОБ ИЗМЕНЕНИИ СОБСТВЕННОГО КАПИТАЛА за 2014 год

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование показателей | Символ | Наименование статей собственного капитала: уставный фонд | эмиссионный доход | резервный фонд | накопленная прибыль (убыток) | фонды переоценки статей баланса | всего собственный капитал |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 |
| | **Раздел I. За год, предшествующий отчетному** | | | | | | | |
| **1** | **Остаток на 1 января 2013 г.** | **3011** | **1 252 269** | **-** | **77 627** | **498 842** | **176 490** | **2 005 228** |
| 1.1 | В том числе: результат от изменений учетной политики и (или) исправления существенных ошибок | 30111 | - | - | - | - | - | - |
| 2 | Изменения статей собственного капитала | 3012 | - | - | 153 609 | 210 493 | 45 514 | 409 616 |
| 2.1 | В том числе: совокупный доход | 30121 | x | x | x | 496 663 | 45 514 | 542 177 |
| 2.2 | направление прибыли на пополнение фондов | 30122 | - | x | 153 609 | (153 609) | x | - |
| 2.3 | операции с учредителями (участниками) | 30123 | - | - | x | (102 406) | x | (102 406) |
| 2.4 | внесение в уставный фонд вкладов учредителей (участников) | 301231 | - | - | x | x | x | - |
| 2.5 | выплата дивидендов акционерам | 301232 | x | x | x | (102 406) | x | (102 406) |
| 2.6 | операции с собственными выкупленными акциями | 301233 | - | x | x | x | x | - |
| 2.7 | перераспределение между статьями собственного капитала | 30125 | - | - | - | 3 979 | - | 3 979 |
| 2.8 | прочие изменения | 30126 | - | - | - | (34 134) | - | (34 134) |
| **3** | **Остаток на 1 января 2014 г.** | **3013** | **1 252 269** | **-** | **231 236** | **709 335** | **222 004** | **2 414 844** |
| | **Раздел II. За отчетный год** | | | | | | | |
| **4** | **Остаток на 1 января 2014 г.** | **3011** | **1 252 269** | **-** | **231 236** | **709 335** | **222 004** | **2 414 844** |
| 5 | Изменения статей собственного капитала | 3012 | - | - | 49 666 | 648 373 | (10 989) | 687 050 |
| 5.1 | В том числе: совокупный доход | 30121 | x | x | x | 766 801 | (5 251) | 761 550 |
| 5.2 | направление прибыли на пополнение фондов | 30122 | - | x | 49 666 | (49 666) | x | - |
| 5.3 | операции с учредителями (участниками) | 30123 | - | - | x | - | x | - |
| 5.4 | внесение в уставный фонд вкладов учредителей (участников) | 301231 | - | - | x | x | x | - |
| 5.5 | выплата дивидендов акционерам | 301232 | x | x | x | - | x | - |
| 5.6 | операции с собственными выкупленными акциями | 301233 | - | x | x | x | x | - |
| 5.7 | перераспределение между статьями собственного капитала | 30125 | - | - | - | 5 738 | (5 738) | - |
| 5.8 | прочие изменения | 30126 | - | - | - | (74 500) | - | (74 500) |
| **6** | **Остаток на 1 января 2015 г.** | **3013** | **1 252 269** | **-** | **280 902** | **1 357 708** | **211 015** | **3 101 894** |

## СВЕДЕНИЯ О СОВОКУПНОМ ДОХОДЕ за 2014 год

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | 2014 год | 2013 год |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | Прибыль (убыток) | 301211 | | 766 801 | 496 663 |
| 2 | Прочие компоненты совокупного дохода | 301212 | | (5 251) | 45 514 |
| 2.1 | В том числе: переоценка основных средств, объектов незавершенного строительства и оборудования к установке | 3012121 | 22 | (2 229) | 45 524 |
| 2.2 | переоценка нематериальных активов | 3012122 | | - | - |
| 2.3 | переоценка ценных бумаг | 3012123 | | (3 022) | (10) |
| 2.4 | переоценка инструментов хеджирования | 3012124 | | - | - |
| 2.5 | переоценка прочих статей баланса | 3012125 | | - | - |
| **3** | **ИТОГО совокупный доход** | **30121** | | **761 550** | **542 177** |

### Общество с дополнительной ответственностью «Владаудит»

Зарегистрировано решением Мингорисполкома от 21 сентября 2000 г. № 1081, УНП 190147255, 220005, г. Минск, ул. Смолячкова, 9-302

## АУДИТОРСКОЕ ЗАКЛЮЧЕНИЕ № 1-4/24 по бухгалтерской (финансовой) отчетности совместного белорусско-российского открытого акционерного общества «Белгазпромбанк» за период с 1 января по 31 декабря 2014 года

*г. Минск* *19 января 2015 г.*

*Председателю Правления ОАО «Белгазпромбанк» Бабарико В.Д.*

Мы, **аудиторская организация — общество с дополнительной ответственностью «Владаудит»** *(220005 г. Минск, ул. Смолячкова, 9-302, зарегистрировано решением Минского городского исполнительного комитета № 1081 от 21 сентября 2000 г., УНП 190147255)* провели аудит прилагаемой бухгалтерской (финансовой) отчетности **совместного белорусско-российского открытого акционерного общества «Белгазпромбанк»** (далее — Банк) *(220121 г. Минск, ул. Притыцкого, 60/2, зарегистрировано решением Национального банка Республики Беларусь № 16 от 28 ноября 1997 г., УНП 100429079),* состоящей из бухгалтерского баланса по состоянию на 1 января 2015 года, отчета о прибылях и убытках, отчета об изменении собственного капитала, отчета о движении денежных средств, примечаний к годовой финансовой отчетности за 2014 год.

Руководство Банка несет ответственность за подготовку и представление бухгалтерской (финансовой) отчетности в соответствии с законодательством, нормативными актами, регулирующими порядок ведения бухгалтерского учета и подготовки финансовой отчетности банками Республики Беларусь и действовавшими в отчетном периоде. Данная ответственность распространяется на разработку, внедрение и поддержание надлежащего функционирования системы внутреннего контроля, которая должна обеспечивать подготовку достоверной бухгалтерской (финансовой) отчетности, не содержащей существенных искажений в результате ошибок или недобросовестных действий; выбор и применение надлежащей учетной политики, а также обоснованных оценочных значений.

Мы несем ответственность за выраженное нами мнение о достоверности данной бухгалтерской (финансовой) отчетности, основанное на результатах проведенного аудита, а также предоставление сведений о выполнении Банком нормативов безопасного функционирования и состоянии внутреннего контроля.

Мы провели аудит в соответствии с требованиями Закона Республики Беларусь «Об аудиторской деятельности», Инструкции о регулировании аудиторской деятельности в банках, небанковских кредитно-финансовых организациях, банковских группах и банковских холдингах, утвержденной Национальным банком Республики Беларусь, национальных правил аудиторской деятельности, утвержденных Министерством финансов Республики Беларусь, которые обязывают нас соблюдать нормы профессиональной этики, планировать и проводить аудит таким образом, чтобы обеспечить достаточную уверенность относительно наличия либо отсутствия существенных искажений в представленной бухгалтерской (финансовой) отчетности.

В ходе аудита нами выполнены аудиторские процедуры для получения аудиторских доказательств, подтверждающих значения и раскрытия информации о бухгалтерской (финансовой) отчетности. Отбор аудиторских процедур осуществлялся на основании профессионального суждения с учетом оценки риска существенного искажения бухгалтерской (финансовой) отчетности в результате ошибок или недобросовестных действий. При оценке риска существенного искажения бухгалтерской (финансовой) отчетности нами рассматривалась система внутреннего контроля Банка с целью планирования дальнейших аудиторских процедур в зависимости от оцененных рисков, а также с целью выражения мнения относительно эффективности функционирования самой системы внутреннего контроля.

Аудит также включал оценку правомерности применяемой учетной политики, обоснованности оценочных значений и общего представления о бухгалтерской (финансовой) отчетности, соблюдения нормативов безопасного функционирования, установленных Национальным банком Республики Беларусь.

Мы считаем, что в ходе аудита нами были получены достаточные и надлежащие аудиторские доказательства, которые могут являться основанием для выражения аудиторского мнения.

По нашему мнению, бухгалтерская (финансовая) отчетность совместного белорусско-российского открытого акционерного общества «Белгазпромбанк», подготовленная в соответствии с законодательством Республики Беларусь, достоверно во всех существенных аспектах отражает финансовое положение открытого акционерного общества «Белгазпромбанк» на 31 декабря 2014 года, а также финансовые результаты деятельности и изменения финансового положения открытого акционерного общества «Белгазпромбанк» за год, закончившийся на указанную дату.

По состоянию на 1 января 2015 года Банком соблюдены нормативы безопасного функционирования, установленные Национальным банком Республики Беларусь.

Нами не установлены факты, свидетельствующие о существенном несоответствии состояния системы внутреннего контроля Банка характеру и объемам осуществляемых им операций, которые могли бы привести к существенному искажению бухгалтерской (финансовой) отчетности Банка.

В наши обязанности также входила оценка методики расчетов и достоверности информации, включенной в формы пруденциальной отчетности: 2801 «Расчет достаточности нормативного капитала», 2807 «Отчет о размере специальных резервов на покрытие возможных убытков по активам и операциям, не отраженным на балансе» и 2809 «Расчет ликвидности» по состоянию на 1 января 2015 года и составленной Банком в соответствии с требованиями Национального банка Республики Беларусь.

По нашему мнению, вышеназванные формы пруденциальной отчетности по состоянию на 1 января 2015 года составлены ОАО «Белгазпромбанк» достоверно во всех существенных аспектах и в соответствии с требованиями Национального банка Республики Беларусь.

Директор В.Д. Михаленя

Руководитель группы аудиторов С.Н. Протащик

Аудиторское заключение
Сдал В.Д. Михаленя
19 января 2015 г.

Получил В.Д. Бабарико
19 января 2015 г.

## ОТЧЕТ О ДВИЖЕНИИ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ за 2014 год

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | 2014 год | 2013 год |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | **ПОТОКИ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ ОТ ОПЕРАЦИОННОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ** | | | | |
| 2 | Полученные процентные доходы | 70100 | | 1 907 501 | 1 370 821 |
| 3 | Уплаченные процентные расходы | 70101 | | (977 775) | (710 198) |
| 4 | Полученные комиссионные доходы | 70102 | | 444 083 | 333 264 |
| 5 | Уплаченные комиссионные расходы | 70103 | | (139 747) | (119 604) |
| 6 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 70104 | | 2 363 | 775 |
| 7 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 70105 | | 15 433 | 8 621 |
| 8 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 70106 | | 30 883 | (2 031) |
| 9 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 70107 | | 343 893 | (1 907) |
| 10 | Прочие полученные доходы | 70108 | | 131 957 | 30 756 |
| 11 | Прочие уплаченные расходы | 70109 | | (576 428) | (455 077) |
| 12 | Уплаченный налог на прибыль | 70110 | | (150 490) | (64 032) |
| 13 | Денежная прибыль (убыток) до изменения в операционных активах и операционных обязательствах – итого | 701 | | 1 031 673 | 391 388 |
| 14 | Чистое снижение (прирост) денежных средств в Национальном банке | 70200 | | (4 853) | (25 075) |
| 15 | Чистое снижение (прирост) денежных средств в банках | 70201 | | (492 120) | 241 345 |
| 16 | Чистое снижение (прирост) денежных средств в ценных бумагах (кроме ценных бумаг, удерживаемых до погашения) | 70202 | | (1 241 068) | (784 900) |
| 17 | Чистое снижение (прирост) денежных средств в форме кредитов, выданных клиентам | 70203 | | (1 536 131) | (2 541 669) |
| 18 | Чистое снижение (прирост) денежных средств от производных финансовых активов | 70204 | | - | - |
| 19 | Чистое снижение (прирост) денежных средств в прочих операционных активах | 70205 | | (91 898) | (440 642) |
| 20 | Потоки денежных средств от изменения операционных активов – итого | 702 | | (3 366 070) | (3 550 941) |
| 21 | Чистый прирост (снижение) денежных средств Национального банка | 70300 | | 96 192 | - |
| 22 | Чистый прирост (снижение) денежных средств банков | 70301 | | 628 344 | 1 617 741 |
| 23 | Чистый прирост (снижение) денежных средств клиентов | 70302 | | 3 378 292 | 1 290 516 |
| 24 | Чистый прирост (снижение) денежных средств от ценных бумаг, выпущенных банком | 70303 | | (39 218) | 205 043 |
| 25 | Чистый прирост (снижение) денежных средств от производных финансовых обязательств | 70304 | | - | - |
| 26 | Чистый прирост (снижение) денежных средств в прочих операционных обязательствах | 70305 | | 114 492 | 236 841 |
| 27 | Потоки денежных средств от изменения операционных обязательств – итого | 703 | | 4 178 102 | 3 350 141 |
| 28 | Чистый поток денежных средств, полученных (использованных) от операционной деятельности | 70 | | 1 843 705 | 190 588 |
| 29 | **ПОТОКИ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ ОТ ИНВЕСТИЦИОННОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ** | | | | |
| 30 | Приобретение основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов | 71100 | | (253 592) | (110 656) |
| 31 | Продажа основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов | 71101 | | 8 702 | 26 811 |
| 32 | Приобретение долгосрочных финансовых вложений в уставные фонды других юридических лиц | 71102 | | - | - |
| 33 | Продажа долгосрочных финансовых вложений в уставные фонды других юридических лиц | 71103 | | - | - |
| 34 | Приобретение ценных бумаг, удерживаемых до погашения | 71104 | | - | - |
| 35 | Погашение (реализация) ценных бумаг, удерживаемых до погашения | 71105 | | - | - |
| 36 | Чистый поток денежных средств, полученных (использованных) от инвестиционной деятельности | 71 | | (244 890) | (83 845) |
| 37 | **ПОТОКИ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ ОТ ФИНАНСОВОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ** | | | | |
| 38 | Эмиссия акций | 72100 | | - | - |
| 39 | Выкуп собственных акций | 72101 | | - | - |
| 40 | Продажа ранее выкупленных собственных акций | 72102 | | - | - |
| 41 | Выплата дивидендов | 72103 | | - | (102 406) |
| 42 | Чистый поток денежных средств, полученных (использованных) от финансовой деятельности | 72 | | - | (102 406) |
| 43 | Влияние изменений валютного курса на денежные средства и их эквиваленты | 73 | | 54 841 | 49 704 |
| 44 | Чистый прирост (снижение) денежных средств и их эквивалентов | 74 | | 1 653 656 | 54 041 |
| 45 | Денежные средства и их эквиваленты на начало отчетного периода | 740 | 5 | X | 1 812 464 |
| 46 | Денежные средства и их эквиваленты на конец отчетного периода | 741 | | 3 466 120 | X |

Председатель правления В.Д.Бабарико

Главный бухгалтер Т.М.Пивовар

Дата подписания: 15 января 2015 г.

Лицензия на осуществление банковской деятельности № 8 выдана Национальным банком Республики Беларусь 24.05.2013. УНП 100429079

**Белгазпромбанк**
*Энергия твоего будущего!*

**Совместное белорусско-российское ОАО «Белгазпромбанк»**

220121, г. Минск, ул. Притыцкого, 60/2. Телефон для справок: 120

**Адрес размещения годового отчета:**
http://www.belgazprombank.by/about/finansovie_pokazateli/finansovaya_otchetnost/finansovaya_otchetnost_nsfo/otchetnost_po_msfo_god/

## СОКРАЩЕННЫЙ БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС ПО СОСТОЯНИЮ НА 31 ДЕКАБРЯ 2014 ГОДА

(в миллионах белорусских рублей)

| | 31 декабря 2014 года | 31 декабря 2013 года |
|---|---|---|
| АКТИВЫ: | | |
| Денежные средства и их эквиваленты | 4,279,752 | 2,564,375 |
| Драгоценные металлы | 5,831 | 10,889 |
| Ценные бумаги, отражаемые по справедливой стоимости через прибыли или убытки | 332,051 | 771,731 |
| Производные финансовые инструменты, активы | 1,472,821 | 1,720,402 |
| Средства в Национальном банке Республики Беларусь, банках и иных финансовых учреждениях | 124,933 | 408,252 |
| Кредиты, предоставленные клиентам | 12,424,489 | 10,737,476 |
| Инвестиции, имеющиеся в наличии для продажи | 2,245,220 | 754,263 |
| Основные средства и нематериальные активы | 762,900 | 566,307 |
| Внеоборотные активы, предназначенные для продажи | 38,666 | 18,957 |
| Инвестиционная недвижимость | 4,625 | 4,711 |
| Прочие активы | 254,889 | 167,700 |
| **ИТОГО АКТИВЫ** | **21,946,177** | **17,725,063** |
| **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА И КАПИТАЛ** | | |
| ОБЯЗАТЕЛЬСТВА: | | |
| Производные финансовые инструменты, обязательства | 304 | 582 |
| Кредиты Национального банка Республики Беларусь | 96,192 | - |
| Средства банков и иных финансовых учреждений | 5,131,422 | 5,119,548 |
| Счета клиентов | 12,527,683 | 8,524,224 |
| Выпущенные долговые ценные бумаги | 740,764 | 720,369 |
| Обязательства по текущему налогу на прибыль | 25,595 | 53,263 |
| Обязательства по отложенному налогу на прибыль | 59,205 | 78,043 |
| Прочие обязательства | 108,115 | 81,260 |
| Итого обязательства | 18,689,280 | 14,577,289 |
| КАПИТАЛ: | | |
| Уставный капитал | 3,130,094 | 3,130,094 |
| Фонд переоценки по справедливой стоимости инвестиций, имеющихся в наличии для продажи | (26,416) | (12,099) |
| Нераспределенная прибыль | 153,219 | 29,779 |
| Итого капитал | 3,256,897 | 3,147,774 |
| **ИТОГО ОБЯЗАТЕЛЬСТВА И КАПИТАЛ** | **21,946,177** | **17,725,063** |

## СОКРАЩЕННЫЙ ОТЧЕТ О ПРИБЫЛИ И УБЫТКАХ ЗА ГОД, ЗАКОНЧИВШИЙСЯ 31 ДЕКАБРЯ 2014 ГОДА

(в миллионах белорусских рублей)

| | Год, закончившийся 31 декабря 2014 года | Год, закончившийся 31 декабря 2013 года |
|---|---|---|
| Процентные доходы | 2,093,721 | 1,846,189 |
| Процентные расходы | (1,087,282) | (922,814) |
| ЧИСТЫЙ ПРОЦЕНТНЫЙ ДОХОД ДО ФОРМИРОВАНИЯ РЕЗЕРВОВ ПОД ОБЕСЦЕНЕНИЕ АКТИВОВ, ПО КОТОРЫМ НАЧИСЛЯЮТСЯ ПРОЦЕНТЫ | 1,006,439 | 923,375 |
| Формирование резервов под обесценение активов, по которым начисляются проценты | (177,970) | (128,305) |
| Восстановление ранее списанных активов | 10,104 | 17,604 |
| ЧИСТЫЙ ПРОЦЕНТНЫЙ ДОХОД | 838,573 | 812,674 |
| Чистый убыток по операциям с иностранной валютой | (238,921) | (52,768) |
| Чистая прибыль по операциям с финансовыми инструментами, отражаемыми по справедливой стоимости через прибыли или убытки | 490,554 | 235,364 |
| Доходы по услугам и комиссии | 407,700 | 344,054 |
| Расходы по услугам и комиссии | (83,221) | (74,978) |
| Чистая прибыль/(убыток) по операциям с драгоценными металлами | 4,759 | (224) |
| Формирование резервов по прочим операциям | (2,263) | (3,411) |
| Прочие доходы | 36,409 | 25,942 |
| ЧИСТЫЕ НЕПРОЦЕНТНЫЕ ДОХОДЫ | 615,017 | 473,979 |
| ОПЕРАЦИОННЫЕ ДОХОДЫ | 1,453,590 | 1,286,653 |
| ОПЕРАЦИОННЫЕ РАСХОДЫ | (813,886) | (673,080) |
| Убыток по чистой денежной позиции в связи с инфляцией | (392,293) | (395,128) |
| ПРИБЫЛЬ ДО НАЛОГООБЛОЖЕНИЯ | 247,411 | 218,445 |
| Расход по налогу на прибыль | (123,971) | (94,914) |
| **ЧИСТАЯ ПРИБЫЛЬ** | **123,440** | **123,531** |

## СОКРАЩЕННЫЙ ОТЧЕТ О СОВОКУПНОМ ДОХОДЕ ЗА ГОД, ЗАКОНЧИВШИЙСЯ 31 ДЕКАБРЯ 2014 ГОДА

(в миллионах белорусских рублей)

| | Год, закончившийся 31 декабря 2014 года | Год, закончившийся 31 декабря 2013 года |
|---|---|---|
| ЧИСТАЯ ПРИБЫЛЬ | 123,440 | 123,531 |
| ПРОЧИЙ СОВОКУПНЫЙ УБЫТОК | | |
| Статьи, которые впоследствии могут быть реклассифицированы в состав прибыли или убытков: | | |
| Совокупный убыток, перенесенный в отчет о прибыли и убытках при выбытии инвестиций, имеющихся в наличии для продажи | 1,852 | 64 |
| Изменение справедливой стоимости инвестиций, имеющихся в наличии для продажи | (16,169) | (23,764) |
| ИТОГО ПРОЧИЙ СОВОКУПНЫЙ УБЫТОК | (14,317) | (23,700) |
| **ИТОГО СОВОКУПНЫЙ ДОХОД** | **109,123** | **99,831** |

## СОКРАЩЕННЫЙ ОТЧЕТ ОБ ИЗМЕНЕНИИ КАПИТАЛА ЗА ГОД, ЗАКОНЧИВШИЙСЯ 31 ДЕКАБРЯ 2014 ГОДА

(в миллионах белорусских рублей)

| | Уставный капитал | Фонд переоценки по справедливой стоимости инвестиций, имеющихся в наличии для продажи | Нераспре-деленная прибыль | Итого капитал |
|---|---|---|---|---|
| **31 декабря 2012 года** | **3,130,094** | **11,601** | **44,967** | **3,186,662** |
| Итого совокупный доход/(убыток) за год | - | (23,700) | 123,531 | 99,831 |
| Дивиденды объявленные | - | - | (138,719) | (138,719) |
| **31 декабря 2013 года** | **3,130,094** | **(12,099)** | **29,779** | **3,147,774** |
| Итого совокупный доход/(убыток) за год | - | (14,317) | 123,440 | 109,123 |
| **31 декабря 2014 года** | **3,130,094** | **(26,416)** | **153,219** | **3,256,897** |

## СОКРАЩЕННЫЙ ОТЧЕТ О ДВИЖЕНИИ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ ЗА ГОД, ЗАКОНЧИВШИЙСЯ 31 ДЕКАБРЯ 2014 ГОДА

(в миллионах белорусских рублей)

| | Год, закончившийся 31 декабря 2014 года | Год, закончившийся 31 декабря 2013 года |
|---|---|---|
| **ДВИЖЕНИЕ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ ОТ ОПЕРАЦИОННОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ:** | | |
| Прибыль до налогообложения и отражения убытка по чистой денежной позиции | 639,704 | 613,573 |
| Корректировки: | | |
| Формирование резервов под обесценение активов, по которым начисляются проценты | 177,970 | 128,305 |
| Формирование резервов по прочим операциям | 2,263 | 3,411 |
| Чистое изменение справедливой стоимости производных финансовых инструментов | (317,587) | (274,228) |
| Чистое изменение справедливой стоимости драгоценных металлов | (2,247) | 1,181 |
| Чистое изменение справедливой стоимости ценных бумаг, отражаемых по справедливой стоимости через прибыли или убытки | 13,155 | 5,196 |
| Эффект от признания активов по нерыночной ставке | 1,823 | 3,105 |
| Амортизация основных средств, нематериальных активов и инвестиционной недвижимости | 69,474 | 52,554 |
| Доход от реализации основных средств и внеоборотных активов, предназначенных для продажи | (3,554) | (6,018) |
| Формирование обязательств по оплате труда | 5,834 | 7,068 |
| Чистое изменение начисленных процентных доходов и расходов | (14,337) | (96,102) |
| Чистое изменение начисленных комиссионных доходов и неустойки | (17,235) | (6,302) |
| Убыток от продажи инвестиций, имеющихся в наличии для продажи | 1,852 | 64 |
| Курсовые разницы, нетто | 381,352 | 134,276 |
| Движение денежных средств от операционной деятельности до изменения операционных активов и обязательств | 938,467 | 566,083 |
| Изменение операционных активов и обязательств | | |
| (Увеличение)/уменьшение операционных активов: | | |
| Минимальные обязательные резервы в Национальном банке Республики Беларусь | (5,231) | (31,456) |
| Средства в банках и иных финансовых учреждениях | 253,729 | 123,293 |
| Драгоценные металлы | 6,096 | 4,646 |
| Производные финансовые инструменты | 339,321 | (3,047) |
| Ценные бумаги, отражаемые по справедливой стоимости через прибыли или убытки | (38,754) | (147,348) |
| Кредиты, предоставленные клиентам | (2,272,785) | (3,059,184) |
| Прочие активы | (76,073) | (51,971) |
| Увеличение/(уменьшение) операционных обязательств: | | |
| Кредиты Национального банка Республики Беларусь | 103,679 | - |
| Средства банков и иных финансовых учреждений | 144,747 | 1,113,237 |
| Средства клиентов | 4,310,436 | 1,382,052 |
| Прочие обязательства | 22,896 | (7,168) |
| Приток/(отток) денежных средств от операционной деятельности до налогообложения | 3,726,528 | (110,863) |
| Налог на прибыль уплаченный | (164,637) | (79,476) |
| Чистый приток/(отток) денежных средств от операционной деятельности | 3,561,891 | (190,339) |
| **ДВИЖЕНИЕ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ ОТ ИНВЕСТИЦИОННОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ:** | | |
| Приобретение основных средств и нематериальных активов | (298,195) | (147,437) |
| Поступления от реализации объектов основных средств и нематериальных активов | 4,399 | 7,811 |
| Поступления от реализации внеоборотных активов, предназначенных для продажи | 4,725 | 24,783 |
| Приобретение инвестиций, имеющихся в наличии для продажи | (3,892,343) | (749,022) |
| Поступления от выбытия инвестиций, имеющихся в наличии для продажи | 2,964,026 | 99,989 |
| Чистый отток денежных средств от инвестиционной деятельности | (1,217,388) | (763,876) |
| **ДВИЖЕНИЕ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ ОТ ФИНАНСОВОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ:** | | |
| Поступление от выпуска долговых ценных бумаг | 117,579 | 514,715 |
| Погашение долговых ценных бумаг | (145,868) | (259,448) |
| Погашение кредитов международных финансовых организаций | (1,274,394) | (459,440) |
| Привлечение кредитов международных финансовых организаций | 1,203,554 | 1,349,988 |
| Дивиденды уплаченные | - | (138,719) |
| Чистый (отток)/приток денежных средств от финансовой деятельности | (99,129) | 1,007,096 |
| ЧИСТОЕ УВЕЛИЧЕНИЕ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ И ИХ ЭКВИВАЛЕНТОВ | 2,245,374 | 52,881 |
| Влияние изменения курсов иностранных валют на денежные средства и их эквиваленты | 96,709 | 89,210 |
| Влияние инфляции на денежные средства и их эквиваленты | (626,706) | (405,664) |
| ДЕНЕЖНЫЕ СРЕДСТВА И ИХ ЭКВИВАЛЕНТЫ, на начало года | 2,564,375 | 2,827,948 |
| ДЕНЕЖНЫЕ СРЕДСТВА И ИХ ЭКВИВАЛЕНТЫ, на конец года | 4,279,752 | 2,564,375 |

Сумма процентов, уплаченных и полученных Банком в течение года, закончившегося 31 декабря 2014 года, составила 1,074,273 млн. руб. и 2,066,374 млн. руб., соответственно.
Сумма процентов, уплаченных и полученных Банком в течение года, закончившегося 31 декабря 2013 года, составила 905,384 млн. руб. и 1,732,655 млн. руб., соответственно.
В течение периодов, закончившихся 31 декабря 2014 и 2013 годов, Банк получил недвижимое имущество (административные и прочие нежилые помещения) в качестве отступного по кредитам на сумму 26,202 млн. руб. и 1,300 млн. руб., соответственно, что представляет собой неденежные операции.

**От имени Правления Банка:**

**Председатель правления**
**В.Д. Бабарико**
17 марта 2015 года
Минск

**Главный бухгалтер**
**Т.М. Пивовар**
17 марта 2015 года
Минск

**Deloitte.**

Иностранное унитарное предприятие «Делойт и Туш»
ул. К.Цеткин, д. 51А, 13-й этаж
Минск, 220004
Республика Беларусь

Тел. +375 (17) 309 99 00
Факс: +375 (17) 309 99 01
www.deloitte.by

## ОТЧЕТ НЕЗАВИСИМЫХ АУДИТОРОВ ПО СОКРАЩЕННОЙ ФИНАНСОВОЙ ОТЧЕТНОСТИ

Совету директоров и акционерам Совместного белорусско-российского открытого акционерного общества «Белгазпромбанк»

Прилагаемая публикуемая сокращенная финансовая отчетность, которая включает сокращенный бухгалтерский баланс по состоянию на 31 декабря 2014 года и соответствующие сокращенные отчеты о прибыли и убытках, о совокупном доходе, об изменении капитала, о движении денежных средств за год, закончившийся 31 декабря 2014 года, составлена на основе аудированной финансовой отчетности ОАО «Белгазпромбанк», составленной в соответствии с требованиями Международных стандартов финансовой отчетности, за год, закончившийся 31 декабря 2014 года. Мы выразили безусловно положительное мнение в отношении финансовой отчетности ОАО «Белгазпромбанк» в аудиторском заключении от 13 марта 2015 года. Аудированная финансовая отчетность и публикуемая сокращенная финансовая отчетность не отражают влияния событий, произошедших после даты аудиторского заключения.

В данной публикуемой сокращенной финансовой отчетности не раскрывается вся информация, требуемая Международными стандартами финансовой отчетности. Поэтому ознакомление с сокращенной финансовой отчетностью не заменяет ознакомления с аудированной финансовой отчетностью ОАО «Белгазпромбанк».

*Ответственность руководства за подготовку сокращенной финансовой отчетности*

Руководство Банка несет ответственность за подготовку данной публикуемой сокращенной финансовой отчетности на основе аудированной финансовой отчетности в соответствии с требованиями Инструкции о раскрытии информации о деятельности банка, небанковской кредитно-финансовой организации, банковской группы и банковского холдинга, утвержденной Постановлением Правления Национального банка Республики Беларусь № 19 от 11 января 2013 года.

*Ответственность аудитора*

Наша ответственность состоит в выражении мнения о данной публикуемой сокращенной финансовой отчетности на основе процедур, проведенных в соответствии с Международным стандартом аудита (МСА) 810 «Аудиторские задания по сокращенной финансовой отчетности».

**Мнение**

По нашему мнению, прилагаемая публикуемая сокращенная финансовая отчетность, подготовленная на основе аудированной финансовой отчетности ОАО «Белгазпромбанк» за год, закончившийся 31 декабря 2014 года, соответствует этой финансовой отчетности во всех существенных аспектах, в соответствии с требованиями Инструкции о раскрытии информации о деятельности банка, небанковской кредитно-финансовой организации, банковской группы и банковского холдинга, утвержденной Постановлением Правления Национального банка Республики Беларусь № 19 от 11 января 2013 года.

В целях более точного понимания финансового положения ОАО «Белгазпромбанк» по состоянию на 31 декабря 2014 года и результатов его деятельности и движения денежных средств за год, закончившийся на эту дату, публикуемую сокращенную финансовую отчетность следует изучать вместе с аудированной финансовой отчетностью, которая была размещена в полном объеме на сайте Банка http://www.belgazprombank.by.

г. Минск, Беларусь
17 марта 2015 года

70 1945 2015 гадоў Вялікай Перамогі

# БРАНЯПОЕЗД ІДЗЕ Ў НЕЎМІРУЧАСЦЬ

**...Калі мы гаворым пра браняпаязды, адразу ўспамінаецца Грамадзянская вайна. Аднак былі яны і ў Вялікую Айчынную. І не проста былі, а дапамагалі гераічна змагацца з ворагам.**

17 ліпеня 1941 года гітлераўцы вялікай механізаванай калонай рухаліся на ўсход. Спяшаліся. Непадалёку ад вёскі Камуна Любанскага раёна, у якой жыў са сваімі бацькамі мой бацька, ворага чакалі чырвонаармейцы. Скарацечны бой прынёс фашыстам значныя страты, таму вярнуўшыся ў вёску, яны пачалі паліць і расстрэльваць з гармат дамы. Пасёлак, збудаваны ў трыццатых гадах на Мар'інскіх балотах, апеты Янкам Купалам у паэме «Над ракой Арэсай», ператварыўся ў папялішча...

Праз тыдзень пасля падзей мой бацька пайшоў па прадукты ў вёску Грабаў (Петрыкаўскі раён). Ён выйшаў вечарам. Ішоў у асноўным па лесе, імкнучыся не выходзіць на дарогу: усіх падазроных фашысты расстрэльвалі на месцы. Дабраўся да вёскі толькі а чацвёртай гадзіне раніцы.

**А што здарылася з самім экіпажам, невядома. Можа, байцы праваліся на ўсход, можа, засталіся арганізоўваць партызанскія атрады або загінулі ў няроўным баі?**

Уся вёска Грабаў была напоўнена нямецкімі войскамі. Асабліва шмат іх тэхнікі было каля раз'езда чыгуначнай станцыі Мяхедаўка. Раніцай фашысты планавалі працягнуць шлях далей на ўсход. Не паспеў бацька зайсці ў хату да дзеда Данілы, як раптам з боку раз'езда пачуліся стрэлы гармат, кулямётныя чэргі. Фашысты выскоквалі з хат і, апранаючыся на хаду, імчаліся ў бок раз'езда, заводзячы машыны і матацыклы. А здарылася вось што. Савецкі браняпоезд зранку непрыкметна падышоў з боку Бабруйска і адкрыў ураганны агонь па фашыстах і іх тэхніцы. Як гітлераўцы не стараліся падступіцца да браняпоезда, у іх нічога не атрымлівалася. Экіпаж, удала манеўруючы, вёў бесперапынны агонь на паражэнне. Усе палі каля чыгуначнага насыпу былі ўсеяныя трупамі немцаў. Усюды гарэла тэхніка. Ляжалі перакуленыя гарматы, якія так і не паспелі стрэліць па браняпоездзе.

Бой ішоў цэлы дзень. Калі надышоў вечар, фашысты вырашылі заблакіраваць браняпоезд. З боку станцыі Старушкі яны ўзламалі чыгуначны шлях, з боку Бабруйска вырашылі падарваць мост праз невялікую рачулку, але ім не ўдалося — фашысцкія падрыўнікі былі скошаны меткай кулямётнай чаргой, не дабраўшыся да моста.

Па ўспамінах жыхароў вёскі Грабаў, мост усё ж пачаў гарэць. Мабыць яго падпалілі здалёку запальнымі снарадамі. Але экіпаж браняпоезда і не думаў здавацца. З замацаваным на брані чырвоным сцягам ён на вялікай хуткасці праскочыў падпалены мост. Калі прайшоў апошні вагон, мост абваліўся ў ваду.

...Недзе праз год байцы партызанскага атрада №132 (камандзір Рыгор Кравец, 130-я Петрыкаўская брыгада), у складзе якога ваяваў мой бацька, вярталіся з чарговага задання. Непадалёку ад вёскі Касейск наткнуліся на рэшткі гераічнага браняпоезда. Узарваны, ён ляжаў на адхоне. Мабыць, экіпаж зрабіў гэта, каб той не дастаўся ворагу. Байцы атрада знялі станковы кулямёт, сабралі раскіданыя кулямётныя скрыні са стужкамі, патроны, знайшлі некалькі гранат Ф-1.

А што здарылася з самім экіпажам, невядома. Можа, байцы праваліся на ўсход, можа, засталіся арганізоўваць партызанскія атрады або загінулі ў няроўным баі? Хто гэтыя слаўныя героі? Магчыма, яны яшчэ жывыя і могуць нешта расказаць? Аднак галоўнае — не памыліцца, бо, акрамя апошняга, быў яшчэ адзін бой — крыху раней — каля вёскі Воземля, на тым самым участку чыгункі Бабруйск — Старушкі.

У мяне ў руках энцыклапедыя за 1990 год: «Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне 1941—1945 гадоў». Адгортваю 134-ю старонку і чытаю: «Воземлянскі бой 1941 года. Бой паміж партызанскім атрадам «Чырвоны Кастрычнік» сумесна з падраздзяленнем Чырвонай Арміі (камандзір падпалкоўнік Л.В. Курмышоў) і нямецка-фашысцкімі захопнікамі ў в. Воземля Акцябрскага р-на. 18 ліпеня 1941 года. Партызанская разведка ўстанавіла сілы праціўніка і дакладнае размяшчэнне яго агнявых сродкаў. 18 ліпеня 1941 года на чыгуначнай ветцы Бабруйск — Рабкор браняпоезд №52 (лейт. Калакольцаў) нечакана для гітлераўцаў падышоў да в. Воземля і адкрыў агонь па штабу нямецкай дывізіі і агнявых кропках ворага. Пасля артабстрэлу зводны атрад чырвонаармейцаў і партызанаў пад камандаваннем інструктара райкама партыі С.В. Маханько атакаваў праціўніка. У выніку бою праціўнік страціў каля 80 салдат і афіцэраў, была вызвалена в. Воземля. Партызаны захапілі палонных і значныя трафеі: 55 бронемашын, 2 радыёстанцыі, 27 матацыклаў, 45 коней з павозкамі і грузам, аператыўныя дакументы нямецкага штаба. Захопленых палонных, дакументы і трафеі перадалі камандаванню савецкіх войскаў».

Дарэчы, камандаваў гэтым боем славуты камандзір Ціхан Піменавіч Бумажкоў. Магчыма, у баі каля в. Воземля і ў сваім апошнім баі каля раз'езда Мяхедаўка ў Петрыкаўскім раёне граміў ворага адзін і той жа браняпоезд, якім камандаваў камандзір лейтэнант Калакольцаў. Можа, праз 70 гадоў усё стане на сваё месца...

**Міхаіл МАСКАЛЬЧУК,**
*Бераставіцкі раён.*

**Лыжа Антона Кушніра, алімпійскі купальнік Любові Чаркашынай і алімпійскі факел, які Аляксандр Мядзведзь адмовіўся прадаваць за любыя грошы. Карэспандэнты «Звязды» наведалі музейную экспазіцыю ўзнагарод і асабістых рэчаў спартсменаў, што знаходзіцца ў новай штаб-кватэры Нацыянальнага алімпійскага камітэта.**

Словы «спорт» і «музей» у нас не так часта ўжываюць разам. Спецыялізаваныя спартыўныя музеі ў Беларусі можна пералічыць па пальцах адной рукі. А таму стварэнне ў новым будынку НАК музейнай экспазіцыі, прысвечанай дасягненням нашых алімпійцаў, — справа, вартая ўвагі. Тым больш, як аказалася, ёсць тут на што паглядзець і пра каго паслухаць. **Настасся МАРЫНІНА, дарадца НАК Беларусі,** якая на гадзіну стала нашым гідам, кажа, што падобная ідэя ўзнікла перад будаўніцтвам. А першыя госці наведалі экспазіцыю яшчэ пазалетась.

Калі падымаемся на пяты паверх, трапляем у вялікую, прасторную залу пад высокім шкляным купалам. З буйных партрэтаў, размешчаных па перыметры, на наведнікаў пазіраюць дзясяткі нашых алімпійскіх чэмпіёнаў.



# СУСТРЭЦЦА СА СПОРТАМ... У МУЗЕІ

— Усяго 79 партрэтаў, — падказвае Настасся Марыніна. — 75 з іх — беларусы, якія выступалі ў складзе зборных СССР, СНД і незалежнай Беларусі. На чатырох астатніх фотаздымках выявы чэмпіёнаў, якія сёння маюць беларускае грамадзянства, аднак у савецкай зборнай прадстаўлялі другія рэспублікі.

На кожным партрэце пазначана колькасць залатых медалёў, заваяваных на Алімпіядах.

**Святлана Багінская, Эліна Зверава, Уладзімір Камінскі, Ала Цупер, Аляксей Грышын, Дзмітрый Дашчынскі, Леанід Тараненка, Сяргей Макаранка — спартсменаў, прадстаўленых на экспазіцыі, не злічыць.**



З вялікіх партрэтаў на наведнікаў пазіраюць дзясяткі алімпійскіх чэмпіёнаў.



Фотаздымкі Надзеі БУЖАН.

Экскурсію праводзіць Рыма МІЛЕЎСКАЯ, кіраўнік прэс-цэнтра НАКа.

— У гэтым сэнсе легендарны гімнаст Віталь Шчэрба — наш мультымедаліст. На гульнях у Барселоне ён заваяваў 6 залатых медалёў. За адзін дзень спаборніцтваў здабыў 4 узнагароды! Гэта сапраўдны рэкорд.

Пад партрэтамі ўсталяваны прызматроны з фотахронікай удзелу нашых суайчыннікаў у Алімпіядах. Упершыню беларусы (у складзе зборнай СССР) трапілі на гульні ў 1952 годзе ў Хельсінкі. Мінчанін Анатоль Юлін тады паказаў найлепшы вынік сярод беларусаў і заняў 4-е месца ў бегу на 400 метраў з бар'ерамі. Праз чатыры гады наш суайчыннік упершыню ўзняўся на п'едэстал. Міхаіл Крываносаў, ураджэнец Крычава, так далёка кінуў молат, што апынуўся на другім месцы. Шкада, але і Юліна, і Крываносава ўжо з намі няма...

— Усе фотаздымкі ў гэтай галерэі — з архіваў НАК, — заўважае Марыніна. — За 20 гадоў працы супрацоўнікі сабралі вялікі фотазбор, які стаў асновай для кампазіцыі. Дадаткова амаль нічога не замаўлялі.

**Цікава, што асабістыя рэчы, медалі, узнагароды не належаць штаб-кватэры. Яны – уласнасць спартсменаў.**

У гэтай круглай зале, акрамя экскурсій, ладзяць прэс-канферэнцыі, праводзяць спартсменаў. Але праца па ўдасканаленні яшчэ не завершана. Тут таксама плануюць устанавіць мультымедыя, каб дзеці падчас экскурсій, напрыклад, маглі паспрабаваць сябе ў ролі спартсмена і пастраляць па электронных мішэнях.

* * *

Мы спускаемся паверхам ніжэй, і вочы літаральна разбягаюцца. Тут сапраўдная канцэнтрацыя алімпійскіх рарытэтаў: ад факелаў і талісманаў спаборніцтваў да медалёў і амуніцыі спартсменаў. Наш НАК, між іншым, створаны ў 1991 годзе. А праз год упершыню з афіцыйным візітам Мінск наведаў Хуан Антоніа Самаранч, тагачасны прэзідэнт Міжнароднага алімпійскага камітэта. Наведваў нас і Жак Рage, яшчэ адзін былы кіраўнік МАК. Аб візіце гэтых вядомых спартыўных функцыянераў гасцям музея нагадвае вялікі вымпел з аўтографамі гасцей.

Але галоўная каштоўнасць экспазіцыі — безумоўна, узнагароды. А тут іх — процьма. Настасся Марыніна паказвае нам лаўровы вянок, якім на Алімпіядзе ў Афінах узнагароджвалі трыумфатараў. Ён належыць Юліі Несцярэнцы, чэмпіёнцы на «стаметроўцы». На другой вітрыне за шклом стаіць кубак Максіма Мірнага за перамогу ў турніры ў Монтэ-Карла, ляжыць мяч з яго подпісам. Непадалёк знаходзіцца адзін з самых унікальных і важкіх экспанатаў — прыз Джэсі Оўэнса, які за найбольшую колькасць залатых медалёў на адной Алімпіядзе атрымаў Віталь Шчэрба. Важыць такі прыз каля 40 кілаграмаў. Дзесяць гадоў таму Віталь перадаў гэты трафей Музею алімпійскай славы.

— А вось гэта — факел, якім у 1980 годзе Аляксандр Мядзведзь у Мінску на стадыёне «Дынама» запаліў алімпійскі агонь, — паказваюць нам яшчэ адзін стэнд экспазіцыі. — У свеце падобных толькі 6 экзэмпляраў. Аляксандру Васільевічу яго нават прапаноўвалі прадаць за вялікія грошы, аднак ён адмовіўся. Вырашыў, што факел павінен захоўвацца ў Беларусі. Мы яму вельмі ўдзячныя. Напэўна, не ўсе ведаюць, але гульні-1980 праходзілі і ў Беларусі. Тады наша сталіца прымала шэраг матчаў групавой стадыі спаборніцтваў па футболе і адзін чвэрцьфінал.



Купальнік Любові ЧАРКАШЫНАЙ.

Непадалёк стаяць чырвона-белыя «мяталкі», спецыяльны спартыўны абутак, у якім Аксана Мянькова заваявала залатую ўзнагароду ў Пекіне. Гімнастка Любоў Чаркашына перадала ў фонд алімпійскі купальнік. Падобная рэч са спартыўнага гардэроба «мастачак» важыць ад 2 да 2,5 кілаграма! Тэма асабістых рэчаў працягваецца і ў раздзеле, прысвечаным зімнім відам спорту. Ёсць тут і жоўтая майка лідара Кубка свету, у якой калісьці выходзіла на дыстанцыю славутая беларуская біятланістка Святлана Парамыгіна, сярэбраная прызёрка Лілехамера. Дарэчы, Святланай тэма стралялючых лыжнікаў не абмяжоўваецца. У калекцыі прысутнічаюць узнагароды Сяргея Булыгіна, алімпійская чэмпіёнка Сараева, Дар'і Домрачавай, для якой тут плануюць падрыхтаваць асобны стэнд.

Акрамя медалёў з этапаў Кубка свету, фрыстайліст Антон Кушнір прадставіў нават адну з лыж, у якіх выконваў свой залаты скачок.

— Мы ганарымся тым, што ў нашай экспазіцыі ёсць і экіпіроўка хакеіста Руслана Салея. Ён на трох Алімпіядах быў капітанам хакейнай зборнай. Майку перадала Федэрацыя хакея, а ўсё астатняе — сям'я спартсмена. Шчыра кажучы, мы нават не сціралі і не прасавалі экіпіроўку. Спецыяльна пакінулі яе патрапанай. Выглядае кранальна.

**— Дарэчы, а як часта ваш фонд папаўняецца экспанатамі?**

— Даволі часта, — прызнаецца Настасся Марыніна. — Вось сёння яго папоўнілі сувеніры першых Еўрапейскіх гульняў, якія сёлета прыме Баку. Час ад часу мы змяняем экспазіцыю. Нешта нават перастаўляем, каб больш поўна выстаўляць экспанаты.

**— А талісманы гульняў як трапляюць да вас?**

— Прывозяць спартсмены. Дзеці іх вельмі любяць, бо выглядаюць яны пацешна. Ёсць у нас нават экспанат з Алімпіяды ў Мюнхене, якому ўжо 43 гады (такса па мянушцы Вальдзі. — **Аўт**). Нам яго перадала Антаніна Кошаль.

**— Ці ўсе спартсмены ідуць насустрач?**

— Нам яшчэ ніхто катэгарычна не адмаўляў. Усе перадаюць прызы з задавальненнем. Нашай экспазіцыі ўсяго паўтара года, а экспанатаў, як бачыце, тут багата.

Прысутнічаюць у экспазіцыі нават спартыўныя маркі нашай «Белпошты».

— І яны карыстаюцца попытам сярод замежных калекцыянераў, — заўважае суразмоўца. — Да нас нядаўна прыязджаў Свен Арнэ Хансан, прэзідэнт нарвежскай федэрацыі лёгкай атлетыкі, даволі вопытны філатэліст. Ён вельмі зацікавіўся нашай экспазіцыяй, і мы на памяць аб нашай краіне падрыхтавалі яму спецыяльны набор беларускіх марак.

**— Дарэчы, а ці прыходзяць сюды балельшчыкі?**

— Мы не праводзім экскурсіі для асобных грамадзян. Толькі для груп. А таму, калі балельшчыкі збяруцца групай, зробяць заяўку, мы з задавальненнем з імі пазнаёмімся. Будзе вельмі карысна, калі нашы грамадзяне будуць больш ведаць пра алімпійскі рух і спартыўныя дасягненні. Да таго ж у нас усё бясплатна.

Цікава, што асабістыя рэчы, медалі, узнагароды не належаць штаб-кватэры. Яны — уласнасць спартсменаў, якія пры жаданні ў любы момант могуць іх забраць. А таму, калі будзе магчымасць, прыходзьце, фатаграфуйцеся, пытайцеся. Час дарма тут дакладна не пройдзе.

**Тарас ШЧЫРЫ.**

## Акцыя

### НАСТАЛЬГІЧНЫЯ ЭКСПАНАТЫ

**Гомельскі палацава-паркавы ансамбль прапануе пазбавіцца ад усяго, што даўно не патрэбна, але выкінуць шкада. Акцыя «Даеш экспанат у музей» пачалася і будзе доўжыцца да 25 красавіка.**

Надакучыла мэбля, набытая ў 1960-х? Дзесьці валяюцца зламаныя пасляваенныя электрапрыборы? У шафе вісіць даўно непатрэбная бабуліна сукенка? «Не спяшайцеся выкідаць!» — заклікаюць музейшчыкі. Прадметы мэблі, музычныя прылады, патэфоны, адзенне і абутак, фатаграфіі і паштоўкі — усё, што мае адносіны да савецкіх часоў, можа трапіць у экспазіцыю. Толькі трэба правесці генеральную хатнюю прыборку і прынесці цікавую рэч у музей.

Удзельнікам акцыі абяцаюць прызы: падарункавыя сертыфікаты на наведванне музея, а ўладальнікам самых арыгінальных экспанатаў — запрашэнні ў палац на «Ноч у музеі».

**Ірына АСТАШКЕВІЧ**

## Конкурсы

### ЭКАПРАЕКТ ДЛЯ «МАЙСТЭРНІ КЛІМАТУ»

**Грамадская кампанія «Майстэрня клімату» міжнароднага кліматычнага руху 350.org абвяшчае конкурс для каманд экаактывістаў з краін Усходняй Еўропы, Каўказа і Цэнтральнай Азіі. У Беларусі партнёрам кампаніі выступае таварыства экалагічных арганізацый «Зялёная сетка».**

У конкурсе могуць удзельнічаць ініцыятыўныя групы, некамерцыйныя арганізацыі, зацікаўленыя ва ўжыванні энергазберагальных тэхналогій, стварэнні велаінфраструктуры, развіцці альтэрнатыўных крыніц энергіі, пераўтварэнні гарадскога асяроддзя ў больш экалагічна дружалюбнае і зручнае для гараджан. Важна, каб праекты рэалізоўваліся ў інтарэсах і пры падтрымцы мясцовых жыхароў.

10 праектаў-пераможцаў атрымаюць дапамогу арганізатараў і экспертаў, частковае фінансаванне і магчымасць далучыцца да міжнародных падзей кліматычнага руху. Самыя матываваныя ўдзельнікі «Майстэрні клімату» змогуць прыняць удзел у саміце ААН у Парыжы, дзе пазнаёмяцца з экаактывістамі з усяго свету. Падаць заяўку на ўдзел у праграме можна да 24 красавіка, даслаўшы яе на адрас электроннай пошты konkurs@climateworkroom.org з пазнакай «Заяўка на «Майстэрню клімату».

Першы этап конкурсу «Майстэрня клімату» з поспехам прайшоў у 2014 годзе: каманда з Львова ўстанавіла ў цэнтры горада веласіпед-генератар энергіі для зарадкі мабільных тэлефонаў, смартфонаў і планшэтаў. У горадзе Кутаісі (Грузія) з'явіўся экалагічны дзіцячы сад. У горным раёне Таджыкістана ўсталявалі сонечны воданагравальнік для мясцовых жыхароў на даху грамадскага будынка.

«Майстэрня клімату» — гэта кампанія сумесных практычных дзеянняў супраць змянення клімату на планеце. Яе галоўная задача — мабілізацыя грамадства для стварэння ўстойлівага зялёнага асяроддзя.

**Надзея НІКАЛАЕВА**

■ Незвычайнае хобі

# У РЭСТАРАН... НА ВЯРБЛЮДЗІЦЫ!

**Аляксандр і Настасся Шаўчэнкі ў пасёлку Тулава пад Віцебскам трымаюць экзатычных гадаванцаў: вярблюда, паўночнага аленя, а таксама асла, чатырох поні, у тым ліку рэдкіх парод. Карэспандэнт «Звязды» пабываў у гасцях у гаспадароў незвычайнага падворка.**



Аляксандр з вярблюдзіцай.

Фота Аляксандра ПУКШАНСКАГА.

## «У НАС НЕ ЗААПАРК!»

На вуліцы ў той дзень было ветрана, зноў падмарозіла. А двухгорбая жывёла быццам атрымлівала асалоду ад таго, што «зіма вярнулася».

— Не, не хвалюйцеся, ёй не холадна. Чытаў, што можа спакойна адчуваць сябе нават пры 50-градусным маразе. Вярблюдзіцы нашай ужо каля сямі гадоў, а жывуць гэтыя жывёлы прыкладна да 50. Вага яе каля тоны, — расказвае Аляксандр Шаўчэнка.

І просіць Шарыду не крыўдзіць «маленькага» — паўночнага аленя па мянушцы Норд. У маі яму споўніцца год. Свайёй гаспадыні Норд, які ў «звярынцы» навасёл, «падарыў» на 8 Сакавіка рог. На наступны дзень — другі...

Мой суразмоўца растлумачыў, што гэтых экзатычных жывёл прывезлі з Ленінградскай вобласці, яны таксама ў людзей на падворках утрымліваліся. Купляў іх легальна, усе неабходныя дакументы ёсць. Для перавозкі браў у арэнду спецыяльны транспарт.

— Зразумела, няпроста тую ж вярблюдзіцу было перавезці. Яна была падарункам жонцы на дзень нараджэння. Мы, дарэчы, пазнаёміліся з Насцяй дзякуючы жывёле. Праўда не экзатычнай, а кабыле. У прыватным сектары Віцебска, дзе я раней жыў, не мог прайсці з-за кабылы. Запытаў, чыя, і выйшла прыгожая дзяўчына. Растлумачыла, што жывёла — яе... — адказвае на мае пытанні Аляксандр.

Падчас размовы высветлілася, што ён — чалавек з «залатымі рукамі»: формы для гліняных скульптур робіць, а таксама зваршчык, каваль, цясляр, сталяр...

— Чаму аленя купіў? Я, акрамя іншага, ужо вопытны Дзед Мароз. Так, і ў гарадскіх святах браў удзел са сваімі коньмі. На розных мерапрыемствах мяне жартам пыталі: «Чаму ж без аленя? Дык вось будзе і алень! Яго бацька вельмі прыгожы і моцны. Мо буду катаць ахвотнікаў у запрэжцы. Так, і сані сам зрабіў, ды не адны... Але ж у першую чаргу мы гэтых жывёл трымаем для душы, — працягвае гаспадар падвор'я.

Ён падкрэсліў, што я не знаходжуся на тэрыторыі прыватнага заапарка. За тое, каб пабачыць жывёл, плата не бярэцца. Але ж, вядома, каб карміць іх, трэба неяк зарабляць. Уявіце сабе: 30-40 тон сена неабходна было купіць на зіму. Аўса — тон 15. Бульбу ядуць... Таму і арганізавалі катанне на конях, поні, вярблюдзіцы ў суправаджэнні інструктара.

— Я індывідуальны прадпрымальнік. У горадзе працаваць з жывёлай, шчыра скажу, нявыгадна. Бо трэба вялікія зборы плаціць за дазвол пакатаць людзей. Таму ахвотныя «па экзотыку» прыязджаюць да нас самі. Ці дорага? За гадзіну пакатацца 200 тысяч рублёў (у Віцебску іншыя просяць за 5 хвілін — 40-50 тысяч. — **Аўт.**). Мо ў перспектыве займуся аграрным турызмам. Ёсць у мяне лецішча ў Гарадоцкім раёне, у маляўнічым месцы, — дзеліцца планамі малады мужчына.

## «АЙБАЛІТ» З ЗАЛАТЫМІ РУКАМІ

У сацыяльных сетках вельмі актыўна абмяркоўвалася навіна пра тое, што мужчына на вярблюдзе пад'ехаў да рэстарана хуткага харчавання.

— Так, гэта я быў *(смяецца)*. Ну, вырашыў паехаць на вярблюдзіцы... Як рэагавалі? Міліцыю выклікалі. Людзі ў форме прасілі мяне забраць жывёлу. Я ім сказаў, каб паспрабавалі самі, гэта ж не аўто, што завёў і паехаў. Шарыда — дама з характарам, раўнівая, калі чужыя побач, асабліва жанчыны, перыядычна нораў паказвае. «Інцыдэнт» ля рэстарана скончыўся тым, што міліцыянеры зразумелі мяне. Я ж нічога не парушаў.

Наконт жывёл нашых рознае чытаў і чуў. І скаргу на мяне пісалі. Маўляў, вярблюдзіца нейкая «хворая», холадна ёй. І прыязджалі разбірацца адказныя асобы. Але ж ніякіх парушэнняў не знайшлі. Вярблюдзіца жыве пад дахам. Як і поні, коні... А вось алень павінен жыць на вуліцы, — расказвае Аляксандр.

Вельмі мяне расстроіў яго расказ пра тое, як поні парэзалі. Было гэта ў дзень святкавання паветрана-дэсантных войскаў. Адышоў гаспадар ад жывёлы на некалькі хвілін. Вярнуўся і бачыць, што кроў льецца... Хто парэзаў, за што — невядома. Паколькі гэта быў выхадны дзень і ветэрынара было знайсці цяжка, стаў Аляксандр «айбалітам».

— Цешча ледзь прытомнасць не страціла, калі ўбачыла кроў. А што рабіць? Трэба ж было выратоўваць жывёлу. Яна ж, як малое дзіця! І ўсе жывёлы нашы нам як «сваякі»,— эмацыянальна гаворыць Аляксандр.

Падчас працягу экскурсіі паказаў мне карэты, фантан, зробленыя ім. Марыць пра вадаспад. Наколькі я зразумеў, чалавек ён не прабіўны. Іншы б знайшоў нейкі фонд, каб атрымаць грант пад рэалізацыю пазнавальнага праекта... Ён не такі. Штодня корміць жывёл, даглядае іх. А каб шукаць інфармацыю ў інтэрнэце пра магчымасць фінансавай падтрымкі, гэта не пра яго. Мо чытачы змогуць падказаць нешта карыснае?



Фота БЕЛТА.

На жаль, не ўдалося пагаварыць з яго жонкай, бо ёй трэба было займацца маленькай дачкой, якой другі год. Насця — філолаг па адукацыі, друкавалася ў газетах. Магла б стаць прафесійнай журналісткай. Ды па тэлефоне сказала, што гэта — не яе... Любіць жывёл, жыве па-за шумам вялікага горада, у мужа рукі залатыя.

А яшчэ здзівіла дабрыня гэтых зусім небагатых людзей. Інвалідаў яны на жывёлах катаюць бясплатна. Ды і з сірот грошай не возьмуць. Вельмі, на жаль, рэдкая з'ява ў наш прагматычны час.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ**


# РУП «Институт недвижимости и оценки»

► **ОЦЕНКА ИМУЩЕСТВА**
(недвижимость, транспорт, оборудование, бизнес, интеллектуальная собственность)
► **ОРГАНИЗАЦИЯ И ПРОВЕДЕНИЕ АУКЦИОНОВ**

## ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА РУП «Жилкоммунтехника»

| Лот №1 | Комплекс зданий, сооружений, передаточных устройств с оборудованием | Могилевская обл., Осиповичский р-н, г. Осиповичи, ул. Проектируемая, 14 | Начальная цена с НДС, $ США | Задаток с НДС, $ США | Шаг аукциона, % |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | 2 984 440 | 149 222 | 5 |

**1.** Производственный корпус, инв. №714/С-18710. Г.п. – 1985. Площадь – 8589,3 м². Этажей – 1.
**2.** Административно-бытовой, инв. №714/С-18711. Гп. – 1985. Площадь – 2786,8 м². Этажей – 4.
**3.** Гараж инв. №714/С-18712. Площадь – 424 м². Этажей – 1.
**4.** Гараж, инв. №714/С-18713. Площадь – 320 м². Этажей – 1.
**5.** Склад, инв. №714/С-28799. Площадь – 43,4 м². Этажей – 1.
**6.** Котельная с инв. №714/С-28800. Площадь – 33,7 м². Этажей – 1.
**7.** Канализация производственная, инв. №714/С-28792. Дата ввода в эксплуатацию – декабрь 1985 г. Протяженность – 61,6 м. Кол-во составных элементов – 6, колодцев – 7.
**8.** Дождевая канализация, инв. №714/С-28790. Дата ввода в эксплуатацию – декабрь 1985 г. Протяженность – 677,5 м. Кол-во составных элементов – 3, колодцев – 32.
**9.** Противопожарный водопровод, инв. №714/С-28798. Дата ввода в эксплуатацию – декабрь 1985 г. Протяженность – 650,9 м. Кол-во составных элементов – 5, линий – 1, колодцев – 4.
**10.** Сети электроснабжения 0,4 кВт, инв. №714/С-28788. Вид сети – кабельная. Дата ввода в эксплуатацию – декабрь 1985 г. Протяженность – 925,5 м. Кол-во составных элементов – 3.
**11.** Внеплощадочные сети телефонные, инв. №714/С-28789. Дата ввода в эксплуатацию – декабрь 1985 г. Протяженность – 324,7 м. Кол-во составных элементов – 1, колодцев – 5.
**12.** Канализация производственно-бытовая, инв. №714/С-28791. Дата ввода в эксплуатацию – декабрь 1985 г. Протяженность – 253,5 м. Кол-во составных элементов – 1, колодцев – 14.
**13.** Внеплощадочные сети дождевой канализации, инв. №714/С-28793. Дата ввода в эксплуатацию – декабрь 1985 г. Протяженность – 303,9 м. Кол-во составных элементов – 1, колодцев – 9.
**14.** Внеплощадочные сети производственно-бытовой канализации, инв. №714/С-28794. Дата ввода в эксплуатацию – декабрь 1985 г. Протяженность – 215,65 м. Кол-во составных элементов – 1, колодцев – 7.
**15.** Водопровод хозяйственно-питьевой с инв. №714/С-28796. Дата ввода в эксплуатацию – декабрь 1985 г. Протяженность – 212,1 м. Кол-во составных элементов – 4, колодцев – 2.
**16.** Внеплощадочные сети водопровода с инв. №714/С-28797. Дата ввода в эксплуатацию – декабрь 1985 г. Протяженность – 279,8 м. Кол-во составных элементов – 3, колодцев – 5.
**17.** Иное имущество, с перечнем которого можно ознакомиться на сайте ino.by или обратившись к Организатору аукциона.

**ОБРЕМЕНЕНИЯ**

Производственный корпус с инв. №714/С-18710 и административно-бытовой корпус с инв. №714/С-18711 находятся в залоге. Залогодержатель, юридическое лицо, резидент Республики Беларусь, Открытое акционерное общество Белорусский банк развития и реконструкции «Белинвестбанк» дал согласие на их продажу.

**ЗЕМЕЛЬНЫЙ УЧАСТОК**

Земельный участок площадью 4,6297 га с кадастровым номером 724850100001001442. Целевое назначение – земельный участок для размещения объектов промышленности. Право постоянного пользования. Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь.

| Лот №2 | Гостиница с инв. №714/D-11556 | Могилевская обл., Осиповичский р-н, г. Осиповичи, ул. 60 лет Октября, д. 15 | Начальная цена с НДС, $ США | Задаток с НДС, $ США | Шаг аукциона, % |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | 136 800 | 6 840 | 5 |

Назначение – помещение гостиницы. Г.п. – 1994. Этажей – 1. Площадь застройки / общая – 256 м² / 196,5 м². Число комнат – 6. Фундамент – бетонный. Стены – кирпичные. Перегородки – гипсолитовые. Перекрытия междуэтажные – ж/б. Полы – дощатые, линолеум ДВП. Проемы оконные – двойные, створчатые. Проемы дверные – плотничные. Внутренняя отделка – оклейка, окраска. Отопление – от групповой котельной. Электроснабжение – скрытая проводка. Водопровод – стальные трубы. Канализация – чугунные трубы. Горячее водоснабжение – центральное. Ванные (души) – душевые. Напольные электроплиты – стационарные. Вентиляция – вытяжные каналы. Радио, телевидение, телефон имеются. Помещение гостиницы в жилом доме.

**ЗЕМЕЛЬНЫЙ УЧАСТОК**

Земельный участок площадью 0,1076 га с кадастровым номером 724850100001000516. Право постоянного пользования. Доля РУП «Жилкоммунтехника» составляет 11/200. Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь.

**УСЛОВИЯ**

Победитель аукциона либо в случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в аукционе подано только одним участником и он согласен приобрести Лот №1 и (или) Лот №2 по начальной цене, увеличенной на 5% (пять процентов) – Претендент на покупку, должен заключить с Продавцом договор купли-продажи Лота №1 и (или) Лота №2 в течение 10 (десяти) банковских дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.

Валюта торгов – доллар США.

Валюта платежа – белорусский рубль.

Сумма для оплаты задатка за участие в аукционе производится в белорусских рублях с применением официального курса Национального банка Республики Беларусь на день платежа.

Условия оплаты приобретенного на аукционе Лота №1 и (или) Лота №2 согласовываются Победителем аукциона (Претендентом на покупку) и Продавцом при заключении договора купли-продажи, но не позднее 30 (тридцати) дней со дня проведения аукциона.

Сумма для оплаты Объекта производится в белорусских рублях с применением официального курса Национального банка Республики Беларусь на день платежа.

Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона на основании счета-фактуры в течение 3 (трех) банковских дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.

Для Лота №1 условием является сохранение отраслевой направленности производства коммунальной и дорожной техники на различных автомобильных шасси, тракторах, прицепах, а также производстве контейнеров различных типоразмеров и оборудования для переработки и транспортировки коммунальных отходов (с сохранением номенклатуры выпускаемой продукции).

Для Лота №1 условием является сохранение количества рабочих мест на момент заключения договора купли-продажи Лота №1 (по состоянию на 1 марта 2015 г. среднесписочная численность работников 43 чел.).

На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для Победителя аукциона.

**Аукцион состоится 08.05.2015 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3 этаж, каб. 4.**

Для участия в аукционе приглашаются граждане, юр. лица и индивидуальные предприниматели Республики Беларусь, иностранные инвесторы, подавшие заявление на участие в аукционе (по форме, установленной Организатором аукциона); предоставившие заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка, заявление об ознакомлении с документами, продаваемым Объектом (Объектами) (по форме, установленной Организатором аукциона) и заключившие с Организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (по форме, установленной Организатором аукциона), а также прилагаются следующие документы: юр. лица – доверенность, выданную представителю юр. лица, копии учредительных документов, свидетельства о гос. регистрации и извещения о присвоении УНП; индивидуальные предприниматели – копию свидетельства о гос.регистрации и извещения о присвоении УНП; физ. лица – паспорт, представители физ. лиц – паспорт и доверенность, удостоверенную нотариально; организациям и физ. лицам (нерезидентам РБ) – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть проведена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о состоятельности, выданный обслуживающим его банком или иной кредитно-финансовой организацией, с заверенным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык; представители юр. и физ. лиц (нерезиденты РБ) – легализованная в установленном порядке доверенность. При подаче документов заявитель (представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юр. лица – документ, подтверждающий полномочия. Подача документов по почте не допускается. Сведения об участниках аукциона не подлежат разглашению.

*Задаток перечисляется на р/с 3012154337010 в ОАО «БПС-Сбербанк» ЦБУ №703, 220004, г. Минск, ул. Кальварийская, д. 4а, код 369. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже имущества РУП «Жилкоммунтехника» (Лот №__),* **проводимом 8 мая 2015 г.**

Участник торгов, желающий участвовать в торгах по нескольким лотам, вносит задаток в размере, установленном для лота с наибольшей начальной ценой.

Задаток, уплаченный участником аукциона, ставшим Победителем (Претендентом на покупку), будет засчитан в счет окончательной стоимости Объекта (Объектов). Задаток, уплаченный участниками аукциона, не ставшими Победителем аукциона, Организатор аукциона возвращает безналичным платежом на их счета в течение 5 (пяти) банковских дней со дня проведения аукциона (назначенной даты его проведения в случае признания аукциона несостоявшимся) или с момента регистрации Организатором аукциона отказа от участия в аукционе.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 12.30, с 13.30 до 16.30 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 2. Окончание приема заявлений **06.05.2015 в 12.00.**

Заключительная регистрация участников **08.05.2015 с 10.30 до 11.00** по месту проведения аукциона.

Все желающие могут предварительно ознакомиться с Объектом (Объектами) аукциона. Контактное лицо для осмотра Объекта (Объектов): Гончар Михаил Степанович 8 (02235) 24-7-55, 8 (029) 341-78-44.

Организация и проведение аукциона осуществляется на основании норм Закона Республики Беларусь от 13.07.2012 № 415-З «Об экономической несостоятельности (банкротстве)» и Положения об организации и проведении аукционов.

Более подробную информацию можно получить у Организатора аукциона.

☎ **Организатор: 8 (017) 306-00-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52 • www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

■ Свет вакол нас

# АСАБЛІВЫЯ — ПОБАЧ,

## альбо Чаму дарослым нельга забываць казкі



Самы маленькі наведвальнік выставы.

**Дванаццацігадовы Цімур, стоячы побач са сваім партрэтам, дзе ён — вясёлы Пенас Біл (самы лепшы вершнік ва ўсім Тэхасе), бянтэжыцца ад колькасці нацэленых на яго аб'ектываў фотаапаратаў. Мужна вытрымаўшы фотасесію, ён падыходзіць да мамы Ірыны і абдымае яе, як і любое дзіця, якое шукае падтрымкі. Яна вельмі важная для Цімкі, аднаго з удзельнікаў фотапраекта «Аўтызм. Старыя казкі на новы лад».**

Прэзентацыя гэтага фотапраекта днямі праходзіла ў гандлёвым цэнтры «Сталіца» і была прымеркавана да Сусветнага дня інфармавання аб аўтызме. Выстава ўяўляла сабой 13 фотапартрэтаў дзяцей з двух гарадоў — Мінска і Бабруйска — у выглядзе казачных герояў. Тэма, вядома, не новая, але адметнасць заключаецца ў тым, што ва ўсіх герояў дыягназавана расстройства аўтычнага спектра. І вопыт такой фотавыставы ў Беларусі першы. Падтрымаць яго прыйшлі выхаванцы дзіцячай музычнай школы мастацтваў №10 імя Глебава, фэнтазі-фолк гурт NEVRIDA, фокуснік-менталіст Віталь Паўлаградскі.

Праект «Аўтызм. Старыя казкі на новы лад», як і ўвогуле сама міжнародная дабрачынная грамадская арганізацыя «Дзеці. Аўтызм. Бацькі», якая ажыццявіла яго, не ўзнік бы без асабістага досведу.

— Летам я спрабавала знайсці агульнаадукацыйную школу для майго сына, які ішоў у пяты клас, і так і не знайшла. Таму што дыягназ «аўтызм» вельмі пужаў чыноўнікаў і дырэктараў школ, да якіх я звярталася, — расказала **мама Цімура і каардынатарка праекта Ірына ДЗЯРГАЧ.** — Яны казалі: «Ды вы што, у нас умоў няма, гэта такія складаныя дзеці, нашы спецыялісты не ўмеюць з імі працаваць, школьны соцыум не гатовы» і г. д. І я падумала: можа, яны казак не чыталі, мультфільмаў не бачылі, не гулялі ў дзіцячыя гульні?..

Ірына прызнаецца, што якраз-такі з аднакласнікамі ў Цімура ўзнікае менш за ўсё праблем, бо дзеці ўспрымаюць свет як дадзенасць. А ў дарослых гэтай здольнасці чамусьці няма.

Першапачаткова праект планавалі зрабіць з удвая меншай колькасцю дзяцей,



На адкрыцці праекта выступілі дзяўчаткі з ДМШМ №10 імя Глебава.

але ахвотных паўдзельнічаць знайшлося больш. І якімі б рознымі не былі гэтыя дзеці, іх аб'ядноўвае не толькі дыягназ, але і тое, што ўсе яны хочуць і, як сведчыць сусветная практыка, могуць вучыцца ў агульнаадукацыйных школах. У нас жа пакуль нейкія зрухі ў гэтым плане ёсць толькі ў сталіцы: ужо працуе першы ў горадзе клас, дзе разам са звычайнымі дзецьмі вучацца асаблівыя.

— У нас ёсць статыстыка, якую назвалі года паўтара таму. Паводле яе ў Беларусі 786 дзяцей з аўтызмам. Але з тых часоў Міністэрства здароўя больш нічога не паведамляла на гэты конт, — адзначыла Ірына Дзяргач. Паставіць гэты дыягназ не так проста, бо з ім часта патрабуюць, каб маці разам з дзіцем лягла ў псіхіятрычнае аддзяленне. І многія бацькі думаюць, ці трэба ім, каб іх дзіця атрымала гэты «воўчы білет».

Арганізатары кажуць, што самі дзеці вельмі добра ўспрынялі ўдзел у праекце. Прынята лічыць, што ў незнаёмых абставінах дзіця з аўтызмам павінна спужацца і забіцца ў кут. Але гэты стэрэатып разбіваецца ўшчэнт, калі глядзіш на партрэты, вобразы на якіх атрымаліся неверагодна трапнымі і арганічнымі. Рамантычна-задумлівы Маленькі прынц, вясёлы каўбой Пенас Біл, гарэзлівая Пігі Доўгаяпанчоха, здзіўлены Лёшык у тумане... і гэта пры тым, што палова ўдзельнікаў — невербальныя, то бок не размаўляюць!

Безумоўна, вялікая заслуга ў гэтым не толькі саміх дзяцей, але і іх мам, якія дапамагалі ствараць праект і перапісвалі вядомыя казкі такім чынам, каб іх героямі былі дзеці з асаблівасцямі. І, безумоўна, увасабленне гэтых вобразаў было б немагчымым без таленавітага фатографа.

— Не магу сказаць, што праца з гэтымі дзецьмі была нейкай незвычайнай у параўнанні з астатнімі маімі здымкамі, — падзялілася **сямейны фатограф Марыя ШАЎЧЭНКА,** якая на дабрачыннай аснове зрабіла казачныя здымкі для праекта. — Мне было цікава папрацаваць з імі, каб даведацца, як яны ідуць на кантакт, як паводзяць сябе. Ніякіх праблем у працы з імі не было, проста трэба зразумець, чым можна прыцягнуць іх увагу.

Дзеці, якіх Марыя здымала для праекта, вельмі розныя, і гэта стала для яе адкрыццём. Фатограф плануе працягнуць супрацоўніцтва з асаблівымі дзеткамі, і, магчыма, нас чакаюць новыя цікавыя праекты, а таксама больш інфармацыі пра аўтызм, якога не трэба баяцца.

**Дзіяна СЕРАДЗЮК.**
**Фота аўтара**

■

# У ВЁСЦЫ ЛІШАК ЖАНІХОЎ, У ГОРАДЗЕ — НЯВЕСТ

**Пра гэта, як і пра іншыя дэмаграфічныя тэндэнцыі ў краіне, распавяла намеснік старшыні Белстата Алена КУХАРЭВІЧ.**

## НАРАДЖАЦЬ СТАЛІ БОЛЬШ

Колькасць насельніцтва ў нашай краіне памяншалася на працягу апошніх 20 гадоў. Але ўжо ў 2013-м дэмографы пакуль яшчэ асцярожна, але пачалі казаць аб пазітыўных тэндэнцыях. І вось стала вядома інфармацыя за 2014 год — насельніцтва Беларусі павялічылася на 13 тысяч чалавек.

У асноўным рост насельніцтва адбыўся за кошт мігрантаў. Але, пачынаючы з 2011 года, павялічваецца і колькасць нованароджаных. Так, калі ў 2010-м нарадзілася 108 тысяч чалавек, то ў 2014 годзе — ужо 118 500.

**Колькасць насельніцтва краіны на пачатак гэтага года склала 9 млн 481 тысячу чалавек.**

Па колькасці нованароджаных лідзіруе сталіца. Там у мінулым годзе нарадзілася 23 тысячы дзяцей — гэта кожны пяты нованароджаны ў краіне.

Станоўчым момантам з'яўляецца тое, што больш за палову дзяцей у краіне нарадзіліся другімі, трэцімі і наступнымі дзецьмі. Першынцаў стала менш на 6%. Калі браць нараджэнне трэціх і чацвёртых дзяцей, то тут лідзіруе Брэсцкая вобласць. Другое дзіця ў сям'і часцей за ўсё з'яўляецца ў сталіцы. Паводле статыстыкі, у 2014 годзе 1277 жанчын нарадзілі двойні, 18 — трайнят.

На жаль, у нашай краіне зніжаецца колькасць жанчын дзетароднага ўзросту (15-49 гадоў). І дэмографы прагназуюць, што сітуацыя не ўзабаве, калі ў дзетародны ўзрост пачнуць уваходзіць адносна маленькія групы жанчын, народжаных у канцы 90-х — пачатку 2000-х гадоў, стане горшай.

## БЕЛАРУСЬ — УРБАНІСТЫЧНАЯ КРАІНА

Больш за 77% жыхароў рэспублікі складаюць гараджане. За 2014 год колькасць гарадскога насельніцтва павялічылася на 50,2 тысячы чалавек і дасягнула 7 млн 325 тысяч. Найбольшае павелічэнне колькасці жыхароў адзначана ў Мінску (на 16,5 тысячы чалавек), сярод абласных цэнтраў — у Гомелі і Гродне, а таксама ў Баранавічах і Пінску.

У вёсцы зараз пражываюць 2 млн 156 тысяч чалавек, ці 22,7% насельніцтва краіны.

## НА ВЁСЦЫ — ДЭФІЦЫТ НЯВЕСТ

На 1 студзеня гэтага года колькасць жанчын у рэспубліцы склала 5100 тысяч (53,5% агульнай колькасці насельніцтва), мужчын — 4,4 млн (46,5%). У сярэднім па рэспубліцы на пачатак года на 1000 мужчын прыпадала 1150 жанчын.

Апошнім часам у год на 100 дзяўчынак нараджаецца 104-105 хлопчыкаў. На 1000 хлопчыкаў ва ўзросце да 16 гадоў — 945 дзяўчынак. Аднак ужо пачынаючы з 34 гадоў з прычыны больш высокай смяротнасці мужчын колькасць іх і жанчын становіцца роўнай. Пры тым у гарадской мясцовасці пачынаючы з 29 гадоў назіраецца большая колькасць жанчын. У вёсцы іх колькасная перавага пачынаецца толькі з 59 гадоў. Гэта значыць, у сельскай мясцовасці відавочны дэфіцыт нявест.

Сем'і зараз ствараюцца ў больш сталым узросце. Як адзначаюць дэмографы, у апошнія гады жанчыны аддаюць перавагу ўступленню ў першы шлюб ва ўзросце 25,3 года, у паўторны шлюб — у 37,6 года. Мужчыны ўступаюць у першы шлюб ва ўзросце 27,4 года, у паўторны — у 40,6 года.

Адпаведна, нараджаць таксама сталі пазней. Сярэдні ўзрост маці пры нараджэнні дзіцяці ў горадзе ў мінулым годзе склаў 28,6 года, у вёсцы — 27 гадоў. Першае дзіця ў мінулым годзе нараджалі ў сярэднім у 26,1 года ў горадзе і ў 24 гады ў вёсцы.

Разводзіцца беларусы сталі крыху менш. Так, у мінулым годзе скасавалі шлюб 35 тысяч сем'яў (амаль на 1,2 тысячы менш, чым у 2013-м). Летась большая колькасць разводаў прыйшлася на сямейныя пары, якія пражылі ў шлюбе 5-9 гадоў (26,3% ад агульнай колькасці разводаў). Узроставы пік разводаў у жанчын і мужчын адносіцца да 25-34 гадоў. У мінулым годзе праз разводы без аднаго з бацькоў засталіся 25,5 тысячы дзяцей.

## У ПРАЦАЗДОЛЬНЫМ УЗРОСЦЕ ПАМІРАЮЦЬ УЖО РАДЗЕЙ

Колькасць памерлых за апошні год скарацілася на 3800 чалавек. Усяго ў 2014 годзе памерла 121,5 тысячы чалавек, з іх 61,3 тысячы мужчын і 60,2 тысячы жанчын.

Традыцыйна самай распаўсюджанай прычынай смерці з'яўляюцца сардэчна-сасудзістыя захворванні, на другім месцы стаіць смяротнасць ад анкалагічных захворванняў і на трэцім — ад знешніх прычын, да якіх адносяць ДТЗ, выпадковыя атручванні алкаголем, самагубствы і інш. І, дарэчы, у параўнанні з 2010 годам смяротнасць ад знешніх прычын зменшылася на трэціну.

**Доля беларусаў, якія пакутуюць на атлусценне, за апошнія 15 гадоў павялічылася больш чым у 2 разы!**

Станоўчай тэндэнцыяй з'яўляецца скарачэнне смяротнасці ў працаздольным узросце — амаль на 5% у параўнанні з 2013 годам і на 24% — з 2010-м. Тым не менш, у працаздольным узросце памёр практычна кожны трэці мужчына (32,4%). Затое жанчын — 7,5%. «Атрымліваецца, мужчыны ў працаздольным узросце паміраюць у 4,4 раза часцей, чым жанчыны», — адзначае прадстаўнік Белстата.

У дадзенай узроставай катэгорыі паміраюць перш за ўсё ад сардэчна-сасудзістых захворванняў, а вось на другім месцы знаходзяцца смерці ад знешніх прычын, якія абагналі на адну пазіцыю смяротнасць ад новаўтварэнняў.

«Несумненна, у гэтым вялікая заслуга аховы здароўя», — адзначае Алена Кухарэвіч. Але заклікае не забывацца, што медыкі лечаць хваробы, а вось здароўе трэба берагчы самому. І запэўнівае, што колькасць беларусаў, якія займаюцца фізкультурай і спортам, расце. Тым не менш, большасць людзей па-ранейшаму вядуць малярухомы лад жыцця. Доля беларусаў, якія пакутуюць ад атлусцення, за апошнія 15 гадоў павялічылася больш чым у 2 разы!

## ПЕНСІЯНЕРАЎ УСЁ БОЛЬШАЕ

Сёння амаль кожны чацвёрты жыхар рэспублікі — старэйшы за працаздольны ўзрост, у той час як у 2000 годзе ім быў амаль кожны пяты. У краіне на пачатак 2015-га колькасць дзяцей і падлеткаў склала 1,6 млн чалавек (за мінулы год яна павялічылася на 30,1 тысячы). Колькасць насельніцтва, старэйшага за працаздольны ўзрост, на пачатак бягучага года дасягнула 2,3 млн чалавек (за 2014 год павялічылася на 45,7 тысячы чалавек).

Колькасць асоб працаздольнага ўзросту на пачатак года склала 5,6 млн чалавек (58,6% ад агульнай колькасці насельніцтва) і за год паменшылася на 63 тысячы чалавек.

— Праблематычнай у будучыні бачыцца сітуацыя з папаўненнем працоўных рэсурсаў, — заявіла Алена Кухарэвіч. — Бо на пачатак гэтага года колькасць 15-гадовых падлеткаў, якія праз год дасягнуць працаздольнага ўзросту, склала 91 тысячу, а людзей, якія выбываюць з працаздольнага ўзросту (59-гадовых мужчын і 54-гадовых жанчын), налічваецца 142 тысячы чалавек.

У далейшым дыспрапорцыя яшчэ больш узмоцніцца: колькасць дзяцей, што знаходзяцца зараз ва ўзросце 10-14 гадоў, складае 443 тысячы, а колькасць насельніцтва перадпенсійнага ўзросту (5 гадоў да выхаду на пенсію) — 720 тысячы чалавек.

**Святлана БУСЬКО.**




# СЁННЯ

**Сонца**

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 6.57 | 20.02 | 13.05 |
| Віцебск — | 6.27 | 19.40 | 13.13 |
| Магілёў — | 6.29 | 19.39 | 13.10 |
| Гомель — | 6.27 | 19.33 | 13.06 |
| Гродна — | 6.54 | 20.03 | 13.09 |
| Брэст — | 6.57 | 20.02 | 13.05 |

## Месяц

***Поўня 4 красавіка.***
***Месяц у сузор'і Шаляў.***

## Імяніны

***Пр.*** *Кірылы, Фёдара, Якава.*
***К.*** *Ірэны, Рэнаты, Антона, Панкрата.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# ЗАЎТРА




**…у суседзяў**

| | |
|---|---|
| ВАРШАВА | +6..+8°C |
| ВІЛЬНЮС | +4..+6°C |
| КІЕЎ | +5..+7°C |
| МАСКВА | +3..+5°C |
| РЫГА | +2..+4°C |
| С.-ПЕЦЯРБУРГ | +2..+4°C |

Даты | Падзеі | Людзі

**3 КРАСАВІКА**

**1570** год — 445 гадоў таму заснаваны Віленскі ўніверсітэт, найстарэйшая навучальная ўстанова Беларусі і Літвы (у 1579 годзе ператвораны ў акадэмію). Меў тры факультэты: філасофскі, тэалагічны і юрыдычны. Студэнты ўсіх факультэтаў вывучалі тагачасную беларускую мову. У 1803 годзе рэарганізаваны ва ўніверсітэт (меў адну з найбагацейшых у Еўропе бібліятэку і батанічны сад). За ўдзел студэнтаў у паўстанні 1830-31 гадоў быў закрыты. Адноўлены ў 1919 годзе.



**1820** год — нарадзіўся Юрый Нагібін, вядомы савецкі пісьменнік. Яго бацьку расстралялі як удзельніка белагвардзейскага паўстання ў Курскай губерні, ён паспеў «завяшчаць» цяжарную жонку Ксенію Аляксееўну сябру Марку Левенталю, які і ўсынавіў Юрыя. Марк Левенталь неўзабаве быў таксама рэпрэсаваны. Другім айчымам стаў Якаў Рыкачоў, які быў першым літаратурным настаўнікам Юрыя Нагібіна. У 1943 годзе малады пісьменнік выпусціў першы зборнік празаічных твораў «Чалавек з фронту» і быў прыняты ў Саюз пісьменнікаў. Пасля заканчэння вайны займаўся журналісцкай, але не пакідаў і працы над прозай. Сярэдзіна 1950-х гадоў была вельмі плённай для пісьменніка: адзін за адным выходзяць зборнікі яго апавяданняў «Чалавек і дарога», «Чыстыя сажалкі», «Далёкае і блізкае», «Ранні вясной». Адной з па запрашэнні свайго сябра Нагібін едзе ў Мяшчэра на паляванне, і мяшчэрская тэма назаўсёды ўваходзіць у яго жыццё і творчасць...

**1943** год — нарадзіўся (вёска Гута Бялыніцкага раёна) Уладзімір Мітрафанавіч Рагаўцоў, беларускі акцёр, заслужаны артыст Беларусі (1980). З 1964 года працуе ў Нацыянальным акадэмічным тэатры імя Я. Купалы. Выканаўца драматычных і характарных роляў. Найбольш значныя ролі: Андрэй («Бяздзень» М. Матукоўскага), Злотнік («Звон — не малітва» І. Чыгрынава), Бальшоў («Свае людзі — паладзім» А. Астроўскага). Знялся ў фільмах «Людзі на балоце», «Трывожнае шчасце», «Плач перапёлкі», «Помні імя сваё».

**Было сказана**

**Уладзімір КАРАТКЕВІЧ, паэт, пісьменнік, публіцыст:**

*«Усе дарогі вядуць не да Рыма, а да родных вербаў і бяроз».*

## ■ Будзь у курсе!

# ВА УКРАІНУ І Ў РАСІЮ НА МАЙСКІЯ СВЯТЫ — СА ЗНІЖКАМІ

**Паніжаныя тарыфы ў зносінах з Расіяй будуць дзейнічаць два дні — 8 і 9 мая.**

Як патлумачылі ў прэс-цэнтры магістралі, у гэты перыяд кошт праезду знізіцца на 35-45 працэнтаў у параўнанні з цяперашнім у залежнасці ад далёкасці паездкі і катэгорыі вагона. Так, білет з Мінска да Масквы ў купэйным вагоне будзе каштаваць каля 530 тысяч рублёў, што на 450 тысяч рублёў менш, чым зараз. У плацкартным вагоне праезд пацаннее на 190 тысяч рублёў — да 350 тысяч, у вагоне з месцамі для сядзення кошт праезду знізіцца да 230 тысяч рублёў. Апроч таго, ва ўказаныя дні захоўваюцца ўсе зніжкі на праезд у зносінах з Расіяй, што былі ўстаноўлены рознымі тарыфнымі планамі.

Больш працяглы перыяд зніжак чакае пасажыраў, якія плануюць паездку ва Украіну. З 1 па 9 мая ўключна праезд у гэтым напрамку стане таннейшым на 10 працэнтаў. Напрыклад з Мінска да Кіева паездка на майскія святы ў купэйным вагоне фірменнага цягніка з улікам зніжкі складзе каля 910 тысяч рублёў, у плацкартным — 560 тысяч рублёў. У нефірменным цягніку кошт праезду ў купэйным вагоне абыдзецца ў 720 тысяч рублёў, у плацкартным — 455 тысяч рублёў.

Беларуская чыгунка звяртае ўвагу пасажыраў, што кошт праезду ў указаны згодна з дзеючым курсам швейцарскага франка, што быў устаноўлены ў сакавіку. Зніжаныя тарыфы будуць дзейнічаць пры праездзе ва ўсіх цягніках магістралі. Папярэдні продаж білетаў са зніжкамі ўжо пачаўся.

# ЦЯГНІК АДРАЗУ СТАЎ ПАПУЛЯРНЫМ

**У першы ж дзень цягнік Мінск — Гродна, прызначаны Беларускай чыгункай з 29 сакавіка, перавёз амаль паўтысячы пасажыраў.**

Асаблівай папулярнасцю, паведамілі ў прэс-цэнтры магістралі, састаў карыстаўся ў зносінах Гродна — Мінск. Тут напаўняльнасць цягніка перавысіла 70 працэнтаў. Нагадаем, што цягнік Мінск — Гродна адпраўляецца са станцыі Мінск-Пасажырскі ў 6.56 і прыбывае ў Гродна ў 11.26. Кошт адпраўлення ў зваротным кірунку — 15.25, прыбыцця ў сталіцу — 19.59. Кошт праезду ў плацкартным вагоне — 59,1 тыс. рублёў, у купэйным — 81,4 тыс. рублёў.

**Сяргей РАСОЛЬКА**

# Азбука народнай культуры

ад Янкі Крука і Аксаны Катовіч

**Ц**ВЫРКУН. У рускіх ёсць вядомая ўсім прыказка: «Всяк сверчок знай свой шесток». «Не сунь носа не ў сваё проса», — кажуць на Беларусі, уяўляючы сабе пэўны парадак у адносінах паміж людзьмі.

◈ На самой справе, цвыркун у разуменні ўсходніх славян быў сімвалам утульнасці, парадку і дабрабыту, жывым ахоўнікам хаты.

◈ Цвыркун любіць цяпло, таму ў зімовы час ён жыве паміж бэлек і бярвення, з якога складзена хата. Калі з-за печы цвыркун заводзіў сваю аднастайную песню, значыць, хаце і дамачадцам нішто не пагражала, у сям'і ўсё ішло сваім парадкам.

◈ І наадварот, лічылася, калі сярод зімы цвыркуны заціхалі і ўвогуле пакідалі хату, гэта прадказвае няшчасце: пажар, цяжкую хваробу або нават смерць кагосьці са сваякоў.

◈ Цвыркун — недатыкальнае насякомае. Простыя людзі верылі, што забіць цвыркуна — значыць знішчыць добры дух хаты, накліканы бяду і на гаспадарку, і на ўсю сям'ю. У некаторых рэгіёнах верылі, што забойства цвыркуна магло пацягнуць за сабой смерць каханага чалавека.

◈ У народзе прыкмячалі: «Калі цвыркун заспявае — час сеяць жыта».

## УСМІХНЕМСЯ

**З грашыма ў кішэні ты і разумны, і прыгожы, і нават спяваць умееш.**

— Пашанцавала табе, сяброўка, з мужам! Самавіты ўвесь такі, маўклівы.

— Чацвёрты раз жанаты. Кажа, што ўсё паспеў сказаць папярэднім жонкам.

**Страўнік халасцяка з часам набывае форму пачка пельменяў.**

Калі вас вядзе нехта за руку, гэта мама. Калі водзяць за нос, гэта, хутчэй за ўсё, палюбоўніца. Калі ж вас вядуць пад руку, то гэта альбо жонка, альбо міліцыя.

**Чарка, намаляваная на ўпакоўцы бытавой тэхнікі, азначае, што набытую тэхніку трэба «абмыць».**

Сядзяць дзве бабкі на лаўцы. Адна пытаецца:

— Ты памятаеш, як мяне завуць?

Тая задумалася:

— Табе тэрмінова?



ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 38, 287 17 21, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by,
(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 20.007. Індэкс 63850. Зак. № 1173.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 2 красавіка 2015 года.

TV@R

## Руслан ТУРКОЎ:

# «УРОКІ МІНУЛАГА НЕ ЎСІМ НА КАРЫСЦЬ»

**Тэлеканал «Беларусь 1» і Агенцтва тэлевізійных навін Белтэлерадыёкампаніі напярэдадні святкавання 70-годдзя Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне прадстаўляць маштабныя праекты і інтэрв'ю сведкаў тых падзей. З 3 красавіка ў спецпраекце «Нашы» ветэраны падзеляцца гісторыямі пра сваю вайну, з 6 красавіка ў рамках «Панарамы» пачне выходзіць рубрыка «Лісты Перамогі», дзе гледачы змогуць першымі даведацца пра змест пісьмаў, знойдзеных у архівах Нацыянальнай бібліятэкі. А з 4 мая тэлеканал распачне паказ 4-серыйнага дакументальнага фільма «За секунду да подзвигу». Мы сустрэліся з яго вядучым, аўтарам сцэнарыя Русланам Турковым, каб пагаварыць пра гістарычную праўду, незасвоеныя ўрокі і сапраўдных герояў.**


Руслан ТУРКОЎ.

## ПЕРАДАЦЬ ГІСТАРЫЧНУЮ ПРАЎДУ

***— Ваш новы праект павінен з'явіцца на экранах у маі. На якой стадыі цяпер праца над ім?***

— Матэрыял часткова ўжо зняты. У найбліжэйшы час плануецца камандзіроўка па знакавых мясцінах Беларусі; вядзём перамовы з музеямі, шукаем сведкаў тых падзей. У нашых пошуках нам будуць дапамагаць гісторыкі. Практыка паказвае, што часта на месцы падзей адкрываюцца раней не вядомыя факты... У праекце мы падрабязна раскажам пра подзвігі ў часы Вялікай Айчыннай вайны і пра людзей, якія іх здзейснілі. Працуем разам з беларускай кампаніяй «Варгеймінг». Наогул такога роду супрацоўніцтва — першы вопыт для Белтэлерадыёкампаніі. Аднаўленне пры дапамозе камп'ютарнай графікі баёў — гэта такі своеасаблівы падарунак ад Агенцтва тэлевізійных навін для ветэранаў і ўсіх нашых гледачоў. А вядучы будзе знаходзіцца ў цэнтры «бою»...

> **Глядзіш часам на сучасную моладзь, у прыватнасці на еўрапейскую, і разумееш, што ўсё пераварочваецца з ног на галаву.**

Ваенная тэматыка для мяне не ў навінку. Я заўсёды гэтым цікавіўся. Ёсць яшчэ і пачуццё абавязку — перадаць гістарычную праўду новым пакаленням. Таму што глядзіш часам на сучасную моладзь, у прыватнасці на еўрапейскую, і разумееш, што ўсё пераварочваецца з ног на галаву. Таму хочацца данесці ўсю праўду ад ветэранаў.

***— Што чакае тэлегледачоў у выніку?***

— Мы раскажам пра восем подзвігаў у чатырох серыях дакументальнага цыкла. Фільмы па 15 хвілін. Як я ўжо казаў, будзе камп'ютарная графіка, сведчанні сучаснікаў і аповед вядучага. Эксперты у нас з Германіі, Расіі і Беларусі. У гэтым праекце мы расказваем пра подзвігі танкістаў і лётчыкаў, няхай даруе мне пяхота.

***— Ці складана было адабраць менавіта восем подзвігаў?***

— Подзвігаў насамрэч было шмат, таму мы адштурхоўваліся ад тых, якія здзейсніліся першымі. Кожны подзвіг — гэта збег абставін, нюансы і настрой чалавека. Савецкі народ, выхаваны на фільмах тых часоў, дзе «шашка ёсць — і ўсіх прагонім», не разумеў да канца, як супрацьстаяць невядомай сіле. І здзяйсняць подзвігі ў пачатку вайны, я лічу, было само па сабе подзвігам. Ісці на таран, кідацца на амбразуру, на танк — людзі гатовы былі змагацца да канца. Уражвае гісторыя лётчыка Мамкіна, які падчас вайны вывозіў на самалёце нашых дзяцей і параненых з партызанскіх раёнаў. Калі яго самалёт збілі, то чалавек, практычна абгарэўшы да касцей, пасадзіў самалёт і выратаваў сваіх пасажыраў. А праз некалькі дзён памёр... Ці бітва пад Сянно, пра якую маўчалі, бо тады мы прайгралі. Уяўляеце, пачатак вайны, бензінавыя танкі... Годна супрацьстаяць ворагу мы не маглі, але ж на некалькі кіламетраў удалося адкінуць фронт. Там ёсць памятны знак, але сама бітва не разрэкламавана так, як, напрыклад, Курская... Пра ўсё мы раскажам падрабязна.


Інтэрв'ю гісторыка ў зале капітуляцыі.

## ПАМЕРЦІ, АЛЕ НЕ ЗДАЦЦА

***— Якая каманда працуе над праектам?***

— Стварэнне любога праекта — праца калектыўная. На новым праекце ў нас задзейнічаны рэжысёр Андрэй Туркоў, галоўны прадзюсар Марат Маркаў, тры аператары — Мікалай Рузавін, Юрый Сахадзэ, Дзяніс Сакалоўскі. Вялікую ўвагу надаю рэжысёрскай рабоце. Яшчэ, на маю думку, 60 працэнтаў поспеху — гэта добрае агучванне. Я заўсёды жорстка стаўлюся да сябе, і такая ж мая пазіцыя ў дачыненні да людзей, з якімі працую. У гэтым праекце ўсё самае важнае мы імкнёмся змясціць у даволі кароткі час. І хочацца, каб у гледача пасля прагляду фільмаў узнікала пачуццё гонару за людзей, якія здзейснілі подзвігі, каб аўдыторыя змагла іх зразумець і адчуць.



Аператар РУЗАВІН.

***— Сутыкаючыся так блізка з падзеямі ваенных часоў, пра што вы думаеце?***

— Думаю перш за ўсё, як бы я сам рэагаваў, што б выбраў у пэўных абставінах... У той час людзі верылі ў перамогу, хоць у многіх была крыўда за раскулачванне. У прынцыпе, Гітлер, мабыць, і разлічваў, што народ павернецца да яго пасля ўсіх жудасных падзей 30-х гадоў. Але ён недаацэньваў славянскі характар, калі людзі гатовы ахвяраваць усім і памерці, але не здацца.

***— Назіраючы за падзеямі ў суседняй краіне, з болем думаеш, быццам ніякага ўроку з той вайны яны не вынеслі...***

— Не хацелася б, каб ваенныя дзеянні працягваліся, аднак урокі мінулага не ўсім на карысць. Каб жудасныя падзеі не паўтараліся, патрэбны і мы, журналісты. Трэба нагадваць пра той час і яго наступствы. Варта не забываць, што за свае памылкі давядзецца аднойчы расплачвацца.


У музеі «Люфтвафэ».

## ФІКСАВАЦЬ ЖЫЦЦЁ З РОЗНЫХ РАКУРСАЎ

***— Калі гаварыць пра вашы дакументальныя фільмы, то якія прынцыпы для вас найбольш важныя ў працы?***

— У першую чаргу, безумоўна, даставернасць інфармацыі. А яшчэ — глядзець на любую сітуацыю з пазіцыі двух бакоў. Калі ў нас былі здымкі ў Валгаградзе, то адзін ветэран расказаў, што падчас бітвы за Сталінград людзі галадалі і, калі самалёты скідвалі ежу і яна аказвалася на мяжы двух франтоў, то бой спыняўся: спачатку нашы бралі прадукты, а потым адпаўзалі і давалі магчымасць зрабіць тое ж нямецкім салдатам... І, заўважце, яны былі салдатамі, ваявалі!.. Я сустракаўся з кавалерам ордэна Славы трох ступеняў Віктарам Веташкіным, і ён расказваў, як у Берліне неяк зайшоў у адзін дом, каб папрасіць рыдлёўку для пахавання свайго таварыша, а гаспадыня адразу паказала яму загад Жукава, паводле якога забаранялася чапаць мірнае насельніцтва. Ён падумаў: вось бы Гітлер так зрабіў... Важна глядзець на падзеі з розных ракурсаў.

> **Савецкі народ, выхаваны на фільмах тых часоў, дзе «шашка ёсць — і ўсіх прагонім», не разумеў да канца, як супрацьстаяць невядомай сіле. І здзяйсняць подзвігі ў пачатку вайны, я лічу, было само па сабе подзвігам.**

***— Ці складана псіхалагічна працаваць над праектамі ваеннай тэматыкі?***

— Без эмацыянальных выдаткаў не абысціся. Пачынаючы з напісання сцэнарыя — калі ты хочаш, каб ён атрымаўся добрым, то разумееш, што неабходна энергетыка таго часу. Таму, працуючы над важнымі праектамі, еду на некалькі дзён да бацькоў, каб пабыць у цішыні і засяродзіцца на працы. Дзякаваць Богу, жонка мая таксама журналіст, таму добра мяне разумее. А потым, калі напісаны сцэнарый, сабраны добры матэрыял і ўсё з'яўляецца ў эфіры, еду на рыбалку аднаўляць сілы.

***— На што вы гатовы дзеля добрага матэрыялу?***

— Сказаць, быццам дзеля добрага матэрыялу я гатовы на ўсё — будзе надта гучна. Але я магу рызыкаваць сабой і не шкадаваць уласнага здароўя. Бывае, не сплю начамі, калі працуеш над нейкім цікавым праектам. Часта ідэі з'яўляюцца ў сне. Тады галоўнае — паспець зафіксаваць убачанае. А калі потым увасабляеш гэта на экране, то з'яўляюцца неверагодныя адчуванні...

Я рэдка гляджу дакументальныя фільмы, бо не хочацца паўтарацца ў сваіх уласных праектах. Куды цікавей да нейкіх высноў і прафесійных адкрыццяў дайсці самастойна. Да гэтага і імкнуся.

**Алена ДРАПКО.**

# АЎТОРАК, 7 КРАСАВІКА

## БЕЛАРУСЬ 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 0.00** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 19.40, 23.25** Зона Х.
**8.50** Слова Мітрапаліта Паўла на Благавешчанне Прасвятой Багародзіцы.
**9.10 Залатая калекцыя савецкага кінематографа. «Салдат Іван Броўкін».**
**10.55 Серыял «Тальянка». Заключная серыя.**
**11.00, 13.00, 16.00** 90 секунд.
**12.10, 16.35 Серыял «Сямейныя меладрамы-2».**
**13.05** Дзень у вялікім горадзе.
**14.00 Меладрама «Здрада». Заключная серыя.**
**15.15, 18.40** Навіны рэгіёна.
**15.25, 0.30 Серыял «20 гадоў без кахання».**
**17.35** Беларуская часінка.
**19.20, 23.45** Сфера інтарэсаў.
**20.00 Да 70-годдзя Перамогі. Дэтэктыў «Ваенная разведка. Паўночны фронт». 1-я серыя.**
**21.00** Панарама.
**21.45** Спецыяльны рэпартаж.
**22.00 Да 70-годдзя Перамогі. Драма «Сямнаццаць імгненняў вясны».**
**0.20** Дзень спорту.

## БЕЛАРУСЬ 2

**7.00** Тэлераніца.
**9.00, 21.35** Тэлебарометр.
**9.05, 16.45 Серыял «Участковая».**
**10.05** «Fitnews».
**10.40, 21.40 Серыял «Косці».**
**12.35** М/с «Пінгвіны з Мадагаскара».
**13.25** Ікра.
**14.00, 18.50 Серыял «Інтэрны».**
**15.40** «Comedy woman».
**17.50, 0.40 Серыял «Віртуозы».**
**20.55** Мазгавы штурм.
**21.25** Спортлато 6 з 49.
**21.30** КЕНО.
**23.25 Серыял «Як я сустрэў вашу маму».**
**23.50 Фэнтэзі «Усёмагутныя Джонсаны». Заключная серыя.**

## БЕЛАРУСЬ 3

**7.15** «Дабраранак».
**7.50** «Хачу ўсё ведаць!».
**8.00, 13.20, 19.05, 23.45** Калейдаскоп.
**8.10, 13.30, 19.15** «Размовы пра духоўнае».
**8.20, 17.40 «Цудоўныя панове з Буа Дарэ». Серыял.**
**9.45 «Гэта мы, Божа!» Драма.**
**10.50, 17.10, 21.05** «Дыя@блог». «Пра літаратуру».
**11.15** «Размаўляем па-беларуску».
**11.20 «Няскончаная аповесць». Меладрама.**
**12.55, 23.00** «Святло далёкай зоркі». Памяці народнага артыста Беларусі, харавога дырыжора Аляксея Кагадзеева.
**13.40 «Хлопец з нашага горада». Драма.**
**15.05** «Размаўляем па-беларуску». Тэлевіктарына.
**15.40 «Гвterritory** 

## БЕЛАРУСЬ 5

**7.00, 1.55** PRO спорт. Навіны.
**8.00** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Агляд тура.
**8.55** Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Крыстал Пэлас» — «Манчэстэр Сіці».
**10.45** Хакей. КХЛ. Фінал Усходняй канферэнцыі. Шосты матч. «Сібір» — «Ак Барс».
**12.40** Час футбола.
**13.20, 17.00, 21.40** Тэніс. Турнір ВТА. Чарльстан.
**15.10** Футбол. Кубак Беларусі. Чвэрцьфінал. Матч у адказ. «ФК Віцебск» — «Дынама» (Мінск).
**19.00** Спорт-кадр.
**19.25** Хакей. КХЛ. Фінал Заходняй канферэнцыі. Сёмы матч. ЦСКА — СКА.
**1.00** Еўрапейскі покерны тур.

## АНТ

**6.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**6.05** «Наша раніца».
**9.05** «Жыць здарова!».
**10.25** «Кантрольная закупка».
**11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00** Навіны спорту.
**11.10** «Фазэнда».
**11.50** «Модны прыгавор».
**13.10** «Мужчынскае/Жаночае».
**14.10** «Сам-насам з усімі».
**15.10, 16.15** «Час пакажа».
**16.50** «Давай пажэнімся!».
**18.20 Серыял «Татавы дочкі».**
**18.50** «Няхай гавораць».
**20.00** Час.
**21.05 Серыял «Арлова і Аляксандраў».**
**23.00 Серыял «Анёл або дэман».**
**0.00** «Вячэрні Ургант».
**0.35** Начныя навіны.

## СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.20** «Меншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**7.40, 20.10, 22.55** «СТБ-спорт».
**8.30 Маст. фільм «Масты акругі Мэдысан».**
**10.40, 17.30** «Званая вячэра».
**11.35** «Сямейныя драмы».
**12.30** «Не хлусі мне!».
**13.30** «Цэнтральны рэгіён».
**13.50** «Наша справа».
**14.30** «Мінск і мінчане».
**15.05** «На 10 гадоў маладзейшыя».
**15.35** «Мае цудоўныя...».
**16.50 Серыял «Вовачка 3».**
**18.30** «Нам і не снілася»: «Сакрэтная зброя вашага дома». 1-я частка.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15 Маст. фільм «Скразны раненні».**
**22.00** «Глядзець усім!».
**23.00** «Аўтапанарама».
**23.20** «Вялікія тайны»: «Жыццё ў Сусвеце».
**0.15 Серыял «Які памнажае смутак».**

## МІР

**6.00** «180 хвілін».
**9.00** «Агульны інтарэс».
**9.30, 1.30 Маст. фільм «Вольга і Канстанцін».**
**10.45 Маст. фільм «Іронія ўдачы».**
**13.00, 16.00, 19.00, 23.00** Навіны (бягучы радок).
**13.20, 2.50** Дак. серыял «Дом без ахвяр».
**14.15 Серыял «Джамайка».**
**16.25, 0.35** Ток-шоу «Слова за слова».
**17.20, 3.45 Серыял «Таварышы паліцэйскія».**
**19.25 Маст. фільм «Італьянец».**
**21.15, 23.15 Серыял «Двое з куфра».**
**0.25** Навіны (бягучы радок). Гарачая тэма.

## РТР—БЕЛАРУСЬ

**7.00** «Раніца Расіі».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.35, 18.00** «Юрый Гагарын. Сем гадоў адзіноты».
**12.30 Маст. фільм «Звон адыходзячага лета».**
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**14.30** Ток-шоу «Пра самае галоўнае».
**15.30** «Прамы эфір».
**17.10** «Асаблівы выпадак».
**18.55 Серыял «Пакуль станіца спіць».**
**20.55 Серыял «Цвет чаромхі».**
**21.55, 23.10 Серыял «Скліфасоўскі».**
**23.55** «Шыфры нашага цела. Невядомыя органы».

## НТБ—БЕЛАРУСЬ

**6.00** «Кава з малаком».
**9.00** «Справа ўрачоў».
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**10.20 Серыял «Вяртанне Мухтара. Новыя серыі».**
**12.00** «Суд прысяжных».
**13.15** «Суд прысяжных. Канчатковы вердыкт».
**14.15** «Справа густу».
**14.45, 22.15** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**15.10** «Усё будзе добра!».
**16.25 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў».**
**18.00** Ток-шоу «Гаворым і паказваем».
**19.40 Серыял «Ленінград 46».**
**21.20 Серыял «Мянтоўскія войны».**
**22.40** «Анатомія дня».
**23.30 Серыял «Другі забойны».**

## 8 КАНАЛ

**7.00, 14.05, 19.40, 21.00, 23.30** «Надвор'е».
**7.05, 16.00** Мультпарад.
**7.40, 19.45 Серыял «Перавозчык».**
**8.30, 18.30 Серыял «Радзіма».**
**9.25, 13.50, 15.45, 16.50, 19.25, 20.55** «Хатняя крама».
**9.45 Серыял «Мерлін».**
**10.30, 23.35** «Хобі TV».
**11.00 Фантастыка «Паўстанне машын».**
**12.45** Дак. серыял «Біблія».
**13.35** «Кінаблакнот».
**14.10 Серыял «Чарцяня».**
**16.20** Дак. фільм «Благавешчанне Найсвяцейшай Багародзіцы».
**17.00 Серыял «Дарагі доктар».**
**20.45** «Вечарніца».
**21.05** «Даведнік па краінах і кантынентах».
**21.15 Фантастыка «Вораг мой».**
**23.10 Серыял «Новыя прыгоды старой Крысцін».**

## ■ Тэлесеткі

# ДА КАПЕЕЧКІ!

**Атрымаць на рукі без дай прычыны немалую суму грошай, якія можна траціць як душа пажадае, а табе нічога за гэта не будзе — напэўна, для многіх з нас у падлеткавым узросце гэта была ружовая мара. А вось калі сума дакладна вызначана і патраціць яе не проста можна, а трэба, прычым літаральна ўсю да капеечкі, ды яшчэ неабходна ўкласціся ў адведзены час — гэта ўжо не шопінг для душы, а... амаль што спорт! Або папросту тэлепраект «Капейка ў капейку».**

Праграма, якая стала візітоўкай тэлеканала «Беларусь 2», нядаўна адзначыла своеасаблівы юбілей — 25 тыдняў з моманту выхаду ў эфір. І ўвесь гэты час вядучы Ілья Конанаў разам з простымі пакупнікамі вывучае ў буйных універмагах і гандлёвых цэнтрах тактыку і стратэгію шопінгу.

